ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

4 лютага 1994 г. № 5 (3727) Кошт 50 руб.

УСЁ РОБІЦЦА З-ПАД ПАЛКІ

«Вазьміце Беларусь, дзе тэрор дасягнуў вышэйшай мяжы і дзе няма людзей, якія вераць у добрае будучае, бо ўмовы жыцця пагаршаюцца з кожным днём. Карміцца няма чым, у сталоўках памыі, жалаванне затрымліваецца месяцамі і шмат іншага. Дзе ж абяцаны рай? А побач з гэтым, тыя, хто пры ўладзе, жывуць іначай. Ім усё можна...» /З ліста Максіму Горкаму з Беларусі, напісанага ў 1930 годзе/

5

БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ. БЕЗ АПАЗІЦЫІ. АЛЕ — З НАДЗЕЯЙ.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ: «Палітычная лексіка ўторгваецца ў жыццё творчага саюза, ды яшчэ прывід шчэміцца — той, які блукае па краіне, — прывід рынку. Але ёсць надзея, што музыка захавае сваю размаітасць і самакаштоўнасць, якую сілкуюць не апазіцыйныя ідэі або непрадказальныя альтэрнатывы, а жывіць вечны й невытлумачальны плюралізм талентаў».

10—11

БЕРАЖЫ ЯГО, БОЖА!

Старонкі з пісьменніцкага дзённіка Вячаслава АДАМЧЫКА.

13—15

А.Куляшоў і А.Пысін. 1972 г.

А.Куляшоў. 1943 г.

«Я, СВЕДКА ЎСІХ ПАДЗЕЙ...»

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

6 лютага споўнілася б 80 гадоў народнаму паэту Беларусі, аднаму з самых слынных майстроў паэтычнага слова Аркадзю Куляшову. На жаль, вось ужо шаснаццаць гадоў Аркадзя Аляксандравіча няма з намі. Ён пайшоў з жыцця заўчасна, як кажуць, на самым мастакоўскім узлёце.

Пайшоў, а творы засталіся. Жыве паэзія Аркадзя Аляксандравіча! Жыве песняй «Алеся»... Жыве радкамі, што ў наш тлумны і супярэчлівы час прыносяць душэўнае пастаянства, раўнавагу, дазваляюць аптымістычна глядзець на свет і людзей.

Паэт дваццатага стагоддзя, А. Куляшоў упэўнена крочыць і ў стагоддзе наступнае, дваццаць першае, да якога дажыць яму не пашчасціла, але ў якое — верыцца! — упэўнена ўвойдзе яго ПАЭЗІЯ.

Адзначаючы 80-годдзе з дня нараджэння А. Куляшова, змяшчаем развагі пра яго жыццёвы і творчы шлях «Пасада цяжкая паэта», напісаныя Эдзі Агняцвет (стар. 6-7), а таксама шэраг здымкаў, зробленых у розныя гады фотакарэспандэнтам «ЛіМа» Уладзімірам Крукам, з якіх паўстае незабыўны воблік Аркадзя Аляксандравіча.

А.Куляшоў, Я.Колас і П.Броўка.

ЛіМ-КОЛА ДЗЁН

Цяпер на чале беларускага парламента — генерал. Нічым асаблівым Мечаслаў Грыб у апошнія гады не вылучаўся, і, мабыць, менавіта гэта акалічнасць паспрыяла абранню яго на высокую пасаду спікера Вярхоўнага Савета. Парламент наш баіцца мець справу з яркай асобай, таму і зляпіў старшыню «па сваім абліччы і падабенстве». Так спакайней.

Пры ўсёй павазе да паслужнога спіса Мечаслава Грыба, няварта, бадай, ставіць нашага генерала ў адзін шэраг з генераламі Эйзенхаўэрам і Дэ Голем, маршалам Манергеймам — вайскоўцамі, што пакінулі глыбокі след у палітычнай гісторыі сваіх краін, чые імёны нацыя называе з павагай і ўдзячнасцю.

У нас на Беларусі крытэрыі больш сціплыя: не Піначэт — ужо дзякуй Богу!

ЗАГАЛОВАК ТЫДНЯ

«Адстаўка Шушкевіча — рэванш праціўнікаў рэформ у Беларусі і падарунак праціўнікам Ельцына ў Расіі». */«Известия», 28 студзеня/.*

БІЛІНГВІЗМ ТЫДНЯ

Абраны на месца Шушкевіча Мечыслаў Грыб «тронную прамову» гаварыў на дзяржаўнай мове Рэспублікі Беларусь, але скончыў — «Спасибо за доверие, дорогие товарищи!»

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

Станіслаў Шушкевіч: «Я быў гатовы да кампрамісаў ва ўсіх сферах, акрамя адной — страты беларускай дзяржаўнасці. Вельмі перашкаджаў аб'яднанню /стварэнню «цэнтра». — **«ЛіМ»**/ і непрафесійны статус Вярхоўнага Савета. Мне давялося пабываць у парламентах шэрагу дзяржаў, і пасля кожнай такой паездкі я ўсё больш пераконваўся: непрафесійны парламент у Беларусі будзе толькі прыдаткам любой выканаўчай улады, нездольным уздзейнічаць на падзеі. Нельга, каб 346 дэпутатаў кантралявалі работу ўрада. Што датычыць парламенцкіх камісій, то яны пайшлі на повадзе ва ўрада, чакаючы ад яго, мякка кажучы, даброт і пераходзячы ва ўрадавыя структуры. Адбылося аб'яднанне тых, каго ў свой час вылучыла камуністычная партыя». */«Чырвоная змена», 1 лютага/.*

ПАПЯРЭДЖАННЕ ТЫДНЯ

У канцы мінулага тыдня на семінары для старшынь раённых і гарадскіх Саветаў выступіў В. Кебіч. Прэм'ер закрануў пытанне пазачарговых выбараў. Цяпер, на ягоную думку, гэтага рабіць нельга — хіба што ў канцы года. Параіў слухачам узважыць свае шанцы ў выбарчай барацьбе і зрабіць практычныя высновы, паабяцаў рэарганізаваць сістэму прапаганды і агітацыі. Словы В. Кебіча «Мы будзем камандаваць сродкамі масавай інфармацыі» былі цёпла сустрэты ўдзельнікамі семінара.

КРЫМІНАЛ ТЫДНЯ

У 1992 годзе пасля скандальнага ўчынку ў Доме ўрада і абразлівых для беларусаў заяў У. Жырыноўскага група дэпутатаў ВС Беларусі спрабавала ўзбудзіць супраць «маскоўскага госця» крымінальную справу, але не сустрэла ў гэтым разумення старшыні С. Шушкевіча. Той вырашыў, што няма чаго шум падымаць.

У Расіі людзі, мабыць, менш памяркоўныя. На гэтым тыдні газеты паведамілі, што Генеральная пракуратура Расійскай Федэрацыі пасля шматлікіх заяў, якія паступілі ад грамадскіх арганізацый, прадстаўнікоў органаў улады, сродкаў масавай інфармацыі, асобных грамадзян з просьбай даць юрыдычную ацэнку шэрагу выступленняў Жырыноўскага, узбудзіла супраць «сокола» крымінальную справу за прапаганду вайны. Артыкул 71 КК РФ вызначае за гэтае злачынства пакаранне «ад трох да васьмі»...

«ПАДАРУНАК» ТЫДНЯ

Дагэтуль не адрамантаваны адключаны яшчэ 18 студзеня першы энергаблок Ігналінскай АЭС, а служба інфармацыі станцыі паведаміла, што давялося адключыць і другі. Прычына — «механічная няспраўнасць адной з кнопак на пульце аператара».

«ВАЛЮТА» ТЫДНЯ

На ІжЭўскім механічным заводзе /Расія/ з прычыны адсутнасці грашовых сродкаў чарговую зарплату выдавалі ўласнай прадукцыяй, у тым ліку газавымі пісталетамі. Чым будуць атрымліваць зарплату грамадзяне Рэспублікі Беларусь пасля ўваходу нашай краіны ў «рублёвую зону»?

СЮРПРЫЗ ТЫДНЯ

Вядома, што Расія мае намер пабудаваць заводы — аналагі нашых «БелАза», Мінскага трактарнага, «Гомсельмаша». Нашы ж гіганты амаль цалкам залежаць ад пастаўкі з Расіі энергіі і камплектуючых, ды і прадукцыя іх зарыентавана ў асноўным на расійскі рынак. Такая вось каардынацыя ў эканамічнай галіне паміж Расіяй і Беларуссю, такое партнёрства. Чарговы сюрпрыз — рашэнне расійскіх эканамічных экспертаў аб тым, што Расія можа і павінна абыходзіцца ўласнай сельскагаспадарчай прадукцыяй. Што варта істотна скараціць імпарт гэтай прадукцыі з краін блізкага замежжа. Прычым расійскі рынак мяркуецца абараняць высокімі мытнымі бар'ерамі. Ёсць аб чым здумацца нашым вытворцам бульбы і мяса і ўвогуле прыхільнікам «рублёвай зоны».

УПАРТАСЦЬ ТЫДНЯ

Кіраўніцтва Узброеных Сіл Беларусі ўпарта трымаецца за савецкія традыцыі. На нядаўнім пасяджэнні парламенцкай Камісіі па пытаннях абароны, нацыянальнай бяспекі і барацьбы са злачыннасцю падтрымана паступіўшая з Саўміна РБ прапанова лічыць 23 лютага святочным днём: Днём узброенага абаронцы — Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Нагадаем, менавіта 23 лютага 1944 года нямецкі гаўляйтэр Беларусі Готберг падпісаў загад аб стварэнні антыбальшавіцкіх узброеных фарміраванняў — Беларускай Краёвай Абароны. Сёлета, 23 лютага — Беларускай Краёвай Абароне — 50 год. Адсвяткуем? Вярхоўны ж Савет не супраць.

АБВЯРЖЭННЕ ТЫДНЯ

Ваенны савет унутраных войск звярнуўся да грамадскасці з заявай, у якой скардзіцца, што апошнім часам некаторымі сродкамі масавай інфармацыі распаўсюджваюцца чуткі і навязваюцца меркаванні, нібыта дзейнасць унутраных войск набывае антынародны, антыдэмакратычны і антыдзяржаўны характар. У публікацыях, публічных прамовах прадстаўнікоў палітычных партый, заяўах народных дэпутатаў унутраныя войскі прадстаўляюцца як інструмент палітычнага ціску і шантажу.

Ваенны савет не згодны з такой трактоўкай падзей, што мелі месца 9 лістапада і 20 студзеня, мяркуе, што для выраду войскаў на плошчу Незалежнасці і ў раён Дома ўрада былі ўсе падставы. «Мы з усёй адказнасцю заяўляем, што ўнутраныя войскі Рэспублікі Беларусь ніколі не будуць інструментам амбіцый палітыкаў, якія сумніцельнымі сродкамі змагаюцца за ўладу». Так. Але, здаецца, Бісмарк раіў не верыць чуткам, пакуль іх афіцыйна не абверглі.

З нагоды

НЯМА ДЗЯРЖАВЫ — НЯМА ПРАБЛЕМЫ?

Драматычны паварот у палітычнай кар'еры Станіслава Шушкевіча даў новы імпульс агульнай цікаўнасці да гэтай асобы. Нешта падобнае назіралася адразу пасля падпісання Белавежскіх пагадненняў аб дэмантажы СССР і ўтварэнні СНД, калі мала каму вядомы за межамі Беларусі палітык прычыніўся да вялікай гісторыі. Чалавекам тыдня быў, безумоўна, не новы Старшыня Вярхоўнага Савета, а пазбаўлены гэтай пасады Шушкевіч. Ён досыць хутка ачуняў, ужо паспеў даць некалькі грунтоўных інтэрв'ю /адно з іх пад назвай «Я зрабіў больш чым мог, але менш, чым хацеў...», надрукавана ў большасці сталічных газет/, наладзіў прэс-канферэнцыю. Гэта добрая якасць — хутка збірацца з сіламі пасля паразы.

Не памылюся, калі скажу, што Станіслаў Шушкевіч ужо распачаў прэзідэнцкую кампанію. І ягоныя камуністычныя апаненты паспрыялі якраз не знішчэнню, а ўмацаванню палітычнага іміджу Станіслава Станіслававіча.

Стасункі Шушкевіча з наменклатурнай большасцю ў Вярхоўным Савеце апошнім часам складваліся па адпрацаванай схеме. Напярэдадні чарговай сесіі парламента ў газетах кшталту «Мы и время», на бальшавіцкіх сходках, мітынгах і «кангрэсах» Шушкевіча бэсцілі, вінавацілі ва ўсіх яўных і ўяўных грахах, ва ўсіх бедах Беларусі і блізкага замежжа. Даходзіла да абсурду, калі Шушкевічу інкрымінавалася праліццё крыві ў Малдове альбо грамадзянская вайна ў Грузіі і Азербайджане. А логіка такая: корань зла — развал Саюза, «сабака закапаны» ў Віскулях, а значыць — на Шушкевіча можна вешаць усіх сабак. Звычайна такія публікацыі і выступленні канчаліся патрабаваннем «імпічмента» спікеру Вярхоўнага Савета.

З адпаведнымі заявамі ў адказ выступаў Станіслаў Станіслававіч. Ён апраўдваўся і нават пагражаў, здавалася — вось-вось ён назаве імёны і пасады тых, хто на самай справе павінен несці адказнасць за наш сённяшні стан. Але да гэтага зноў, як і раней, не даходзіла.

Потым на сесіі /так было неаднойчы/ уздымалася пытанне аб адкліканні Шушкевіча з пасады і адначасова яму празрыста намякалі, што трэба зрабіць у якасці «адкупнога»: не перашкаджаць камуністам адраджаць сваю партыю, «прыпыненую» пасля жнівеньскага путчу; заплюшчыць вочы на яўныя парушэнні існуючага заканадаўства, самой Канстытуцыі Беларусі, калі справа датычыць інтарэсаў наменклатуры /прыгадаем забарону рэферэндуму, скасаванне нейтралітэту праз далучэнне да «коллективной безопасности», «рублёвую зону»/; не прыспешваць прыняцце законаў, якія б маглі пакласці канец наменклатурнай «прыхватызацыі». У рэшце рэшт, кожны атрымліваў сваё: камуністы чарговае рашэнне Вярхоўнага Савета, якое надавала бачнасць законнасці іхняму «беспределу», Шушкевіч — адтэрміноўку адстаўкі.

Не трэба тлумачыць, якія пачуцці выклікалі гэтыя гульні ў апазіцыі, увогуле ў дэпутатаў дэмакратычнага кірунку, у патрыётаў Беларусі.

У сваім інтэрв'ю «Я зрабіў больш, чым мог, але менш, чым хацеў...» Шушкевіч гаворыць: «Я быў гатовы да кампрамісаў ва ўсіх сферах, акрамя адной — страты незалежнасці Беларусі». Мне падаецца, што ў дадзеным выпадку былому спікеру парламента крыху адмаўляе логіка. Незалежнасць складаецца са шмат якіх кампанентаў. І калі «ісці на кампраміс», скажам, у фінансавай сферы, адмаўляючыся ад сваёй валюты на карысць Масквы; у палітычнай — адмаўляючыся ад нейтралітэту дзеля «коллективной безопасности» і згаджаючыся на, скажам шчыра, бестэрміновую прысутнасць на беларускай зямлі расійскіх ваенных баз; калі апраўдваць плюралізмам антыбеларускую дзейнасць Рускай праваслаўнай царквы і польскага касцёла на Беларусі, не звяртаць увагі на тое, як уваходзяць у сілу ўсялякія «славянскія саборы», што адкрыта абвяшчаюць сваёй мэтай скасаванне нашай дзяржаўнасці праз «братні саюз» з Масквою, — дык што ад незалежнасці застанецца? Дзе ж мяжа кампрамісу?

У сувязі з гэтым згадаю, што бальшавіцкая газета «Мы и время» вельмі своеасабліва «працытавала» прыгаданыя вышэй словы Станіслава Шушкевіча /нумар за 3 лютага/: «Я мог пойти на любую сделку, кроме потери белорусской государственности...», — отметил С. Шушкевич». І пракаментавала: «Фраза: «Я мог пойти на любую сделку...» очень хорошо подчеркивает принципиальность профессора Шушкевича».

У дадзеным выпадку гэтая фраза добра падкрэслівае «прынцыповасць» яе аўтараў.

Разгарнуўшы кампанію па зняцці Шушкевіча з пасады, камуністы кіраваліся старым бальшавіцкім прынцыпам: «Няма чалавека — няма праблемы». Але супраць свайго жадання яны падарылі яму тое, што сам Шушкевіч паспеў за апошнія, паслявіскулёўскія, два гады, растраціць — палітычны імідж. Яшчэ ўчора Шушкевіч быў «згоднік», амаль «здраднік», а сёння— пакутнік. Другі раз /першы — у Віскулях/ лёс робіць Станіславу Шушкевічу каштоўны падарунак.

Так што і чалавек застаўся, і праблемы нікуды не падзеліся. Усё роўна іх давядзецца рашаць, толькі цяпер ужо няма спікера — «дэмакрата», якога можна было вінаваціць у развале эканомікі і заняпадзе дзяржавы. Цяпер, шукаючы вінаватага, спадар прэм'ер і ягоная каманда будуць вымушаны глядзецца ў люстэрка. Каб пазбегнуць адказнасці, яны могуць пайсці на творчую перапрацоўку прынцыпу «няма чалавека — няма праблемы». Яны добра засвоілі на сваю карысць некаторыя ўрокі дэмантажу СССР. Сёння амаль немагчыма прыцягнуць да адказнасці тых, хто, займаючы ўтульныя кабінеты ў Маскве і сталіцах саюзных рэспублік, давёў Савецкі Саюз да крызісу, які лагічна скончыўся Віскулямі, хто павінен бы панесці адказнасць за Чарнобыль, Афганістан, згвалтаваную зямлю і даведзеных да жабрацкага стану людзей.

Далучэннем жа да Расіі наша наменклатура цалкам вырашае свае праблемы. «Кажаце, мы разрабавалі Рэспубліку Беларусь, прысабечылі дзяржаўную маёмасць? А што, ёсць такая дзяржава — Беларусь? Была, кажаце, яшчэ ўчора? Вы яшчэ прыгадайце, што сто гадоў назад было!..» Няма дзяржавы — няма праблемы. Для іх. А для нас?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

СТАРШЫНЯ ЗАГАДАЎ РАЗАБРАЦЦА

Рэспубліканскі страйкам на сваім пасяджэнні 2 лютага прыняў рашэнне абвясціць з шасці гадзін 15 лютага бестэрміновы палітычны страйк з патрабаваннямі адстаўкі кабінета Кебіча, фарміравання кааліцыйнага ўрада народнага даверу і датэрміновых выбараў у Вярхоўны Савет.

Час пакажа, якія формы і памеры прыме мяркуемая акцыя. Зразумела, што падстаў для яе правядзення вельмі і вельмі шмат. Досыць красамоўным з'яўляецца і той факт, што рабочы рух выспеў настолькі, каб звярнуцца да такога метаду /дарэчы, цалкам законнага/ барацьбы за свае інтарэсы, як палітычны страйк.

Тым часам Старшыня Вярхоўнага Савета Мечаслаў Грыб у якасці аднаго з першых крокаў на новай пасадзе даў даручэнне выконваючаму абавязкі старшыні КДБ Генадзю Лавіцкаму разабрацца з рашэннем страйкама. На думку спікера, у ім гучыць заклік да гвалтоўнага звяржэння ўлады.

Зараз цяжка каменціраваць гэтую сітуацыю. Аднак робіцца трывожна з той прычыны, што супрацьстаянне народа і ўлады набывае новы і небяспечны віток.

ДЗЯРЖАЎНЫ ГІМН: ВАРЫЯНТАЎ НЯМА?

НОВЫЯ ЛІСТЫ ЧЫТАЧОЎ

Шаноўнае спадарства! Мы вельмі багатыя людзі! Колькі часу мы правялі ў нарадах, спрэчках, каб з многіх геніяльных твораў здабыць адзін для Дзяржаўнага гімна. Ну, якая яшчэ дзяржава можа гэтым пахваліцца? Сапраўды, на конкурс пададзены творы выдатныя. Аднак больш не трэба губляць час. Бо гімн у Беларусі ўжо ёсць. І ёсць даўно. Гэты музычны цуд вядомы кожнаму грамадзяніну Беларусі. У ім велізарнейшы запал энергіі закадзіраваны ў ноты. Гэта гінучая дзяржава — Вялікае княства Літоўскае праз асобу геніяльнага М. К. Агінскага перадала сваім нашчадкам музычны ключ да Адраджэння, уздыму, аднаўлення нацыі. Спрошчаная формула паланеза «Развітанне з Радзімай» ніяк не асэнсоўваецца й не суадносіцца з глыбінёй і магутнасцю твора і як аргумент супраць прызначэння яго Гімнам Беларусі /гл. «ЛіМ» ад 12.11.93 г./ усур'ёз не ўспрымаецца. Разважце, і можна адмовіць у працы людзям, што пражывалі ў Менску на праспекце Леніна? Пры адным жа вымаўленні назвы г. Рыгі ўсіх павінна было б ванітаваць, бо ў слоў «Рыга» й «адрыжка» фармальна — адзін корань.

Этыкетка «Развітанне з Радзімай» сатрэцца сама сабой, як назоў «БССР» ці «праспект Леніна». Трэба даць дазвол на працу Паланезу Агінскага, каб штодзень, апоўначы, мы маглі азірнуцца на пройдзены Дзяржавай

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ СЯБРОЎСТВУ НЕ ПЕРАШКОДА

Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада выступіла з заявай па ўзаемадачыненнях паміж беларускім і расійскім народамі.

У ёй адзначаецца, што сённяшнія цяжкасці ва ўсталяванні цывілізаваных міждзяржаўных адносін паміж краінамі, якія ўзніклі на месцы былога СССР, не павінны адбівацца на ўзаемадачыненнях народаў. Зараз усе народы былога СССР перажываюць псіхалагічны пералом, абумоўлены савецкім комплексам мыслення і крушэннем камуністычных міфаў. Расійскі народ — не выключэнне. Як расіянам трэба пазбавіцца імперскага сіндрому, так беларусам — комплексу непаўнавартасці, палітычнай і сацыяльнай апатыі.

БСДГ упэўнена, што на Беларусі няма падстаў для міжнацыянальных спрэчак, і адмоўна ставіцца да ўсялякіх праяўленняў шавінізму і нацыянальнага экстрэмізму, да ўмяшання ў той ці іншай форме ў справы другіх краін.

Грамада будзе намагацца ўсталёўваць цывілізаваныя стасункі з усімі нашымі суседзямі, у тым ліку паміж беларускім і расійскім народамі, паміж суверэннымі беларускай і расійскай дзяржавамі.

Такі асноўны змест заявы.

Прэс-цэнтр БСДГ паведаміў аб рабочай сустрэчы паміж сацыял-дэмакратамі Беларусі і Расіі. На ёй прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады і Сацыял-дэмакратычнай партыі Расіі прынялі сумесную заяву з нагоды ўваходжання Беларусі ў «рублёвую зону», якое, па меркаванні абедзвюх партый, не адпавядае інтарэсам ні беларускага, ні расійскага народаў. Для Расіі гэты шлях азначае перакідванне часткі фінансавых праблем Беларусі на плечы расійскага народа, адпаведна — павелічэнне інфляцыі і пагаршэнне адносін расіян да Беларусі. Для Беларусі — адцягванне радыкальнай эканамічнай рэформы, захаванне пракамуністычнага рэжыму, падрыў суверэнітэту, абразлівы стан «бедного родственника» і нахлебніка. Даўшы кароткачасовыя перавагі на некалькі месяцаў, у перспектыве гэты крок створыць пагрозу поўнага эканамічнага краху.

Н. К.

Сцяпан СІНІЦА

ПРЫПЕЎКІ

ПАВОДЛЕ КОНКУРСУ «ЗВЯЗДЫ»

●

Перамены, перамены...
Спікер наш
сышоў са сцэны,
Бо ВС, як крот, сляпы,
Там амаль адны грыбы...

●

Ох, карупцыя,
ох, нягодніца!
З-за цябе
што цяпер у нас робіцца!
КДБ і міліцыя — сіраты,
Б'юць у ладкі
тутэйшыя ірады...

●

Лукашэнкі голас зычны
Нам як снег зімой прывычны.
Колькі можна, тваю ...,
Ўсё не тых «разаблачаць»!

...ШАНАВАЦЬ І ЛЮБІЦЬ БЕЛАРУСЬ

З новай прыгожай назвай — «Раніца» выходзіць з пачатку гэтага года старэйшая ў рэспубліцы дзіцячая газета «Піянер Беларусі». Наўрад ці гэта здзівіла кагосьці з больш чым за сорак дзве тысячы яе падпісчыкаў. Размовы пра замену назвы вяліся ўжо даўно, ды і з боку саміх чытачоў рабіліся такія прапановы.

Новае імя газеты — не проста даніна модзе. Ужо даўно «Піянер Беларусі» не абмяжоўваўся на сваіх старонках толькі піянерскай тэматыкай, вызначыўшы накірунак так: выданне для дзяцей і падлеткаў. Новая назва, натуральна, больш адпавядае такому «агульнадзіцячаму» зместу газеты. Аднак перайменне ні ў якім разе не азначае адмаўлення «Раніцы» ад больш чым шасцідзесяцігадовай гісторыі свайго папярэдніка. Газета будзе гэтак жа вучыць юных чытачоў любіць Беларусь, шанаваць і паважаць родную мову, гісторыю і культуру.

І. СВІРКА

ВІЛЕНЦЫ ПАМЯТАЮЦЬ ШЫРМУ

Памяць Рыгора Шырмы віленскія беларусы, пры актыўнай дапамозе сусветнай арганізацыі «Бацькаўшчына», ушанавалі ўрачыстым адкрыццём мемарыяльнай дошкі-барэльефа на будынку, у якім калісь жыў музыкант.

Нягледзячы на халодны зімовы дзень, ля касцёла св. Ганны сабралася каля сотні сяброў Таварыства беларускай культуры, Таварыства беларускай школы, «Сябрыны», віленскага Згуртавання палітычных вязняў, гасцеў з беларускай сталіцы і раёнаў Віленшчыны. Урачысты сход адкрыў сп. Хведар Нюнька. Пасвяціўшы адкрытую табліцу, святар Еўфрасіннеўскай царквы а. Уладзімір з кароткай прамовай звярнуўся да прысутных, падкрэсліўшы, што верныя Богу беларусы застаюцца вернымі свайму народу нават у сённяшні цяжкі час.

З асабліваю ўвагаю выслухалі прысутныя цёплыя словы паверанага ў справах Беларусі сп. Уладзіміра Шчаснага. Ён напомніў, што віленскія беларусы ў рашаючым перыядзе барацьбы Летувы за незалежнасць цвёрда і рашуча падтрымалі братні народ у яго законным імкненні да сваёй дзяржаўнасці і сёння шчыра працуюць на карысць поўнага нацыянальнага і гаспадарчага адраджэння ў краіне.

Сп. Ганна Сурмач, шчыра жадаючы поспехаў віленчукам у іх нялёгкай адраджэнскай дзейнасці, адзначыла, што «Бацькаўшчына» заўсёды, па меры магчымасці, поруч з пасольствам Беларусі, гатовая прыйсці на дапамогу суайчыннікам Віленшчыны і Вільні — калыскі беларускай культуры.

З аглядам дзейнасці Рыгора Шырмы выступілі спадары Мурашка і Луцкевіч. А на заканчэнне вучні малодшых класаў беларускай школы прадэкламавалі некалькі вершаў на роднай мове.

Неахвотна разыходзіліся прысутныя, пакідаючы аздобленую кветкамі і вянком адну з найпрыгажэйшых у горадзе дошак /аўтар і выканаўца яе — таленавіты мінскі скульптар Алесь Мірончык/. Праз гадзіну сустрэча прадоўжылася ў будынку кампазітараў «На Звярынцы». Прысутныя дзяліліся думкамі ды ўспамінамі пра Рыгора Шырму. Асабліва цікавымі былі каларытныя, прыпраўленыя гумарам выступленні мастацкага кіраўніка хору Дзяржтэлерадыё Беларусі Віктара Роўды і спевака Лявона Мурашкі. З цікавым паведамленнем, зробленым палітоўску, выступіла віленская музыкантка сп. Юратэ Буракайтэ. Былы супрацоўнік Шырмы ў «Беларускім Летапісе» сп. А. Анішчык падкрэсліў ахвярнасць і спагаднасць выдатнага дырыжора і фалькларыста, яго рэдкую абаяльнасць і дабрыню, шматграннасць ягонай дзейнасці.

Андрэй ЧЭМЕР

г. Вільня

шлях, падзякаваць Гаспадару Сусвету за тое, што гэты дзень адбыўся, і развітацца да заўтра. А заўтра раніцай пад гукі Гімна зноў сустрэцца з Радзімай — новай, адпачыўшай, акрыленай, асветленай сонцам. І так заўжды!

Ад імя Рады Латвійскага Таварыства беларускай культуры «Світанак» старшыня Таварыства Мікола ЯРЧАК

Я пазнаёмілася з артыкулам В. Скорабагатава «Варыянт, варты ўвагі» /«ЛіМ» за 12.11.93 г./ і лічу, што тая песня, якую прапанаваў ён, вельмі добра падыходзіць на ролю Дзяржаўнага гімна. Яна цалкам адпавядае ўсім патрабаванням і сапраўды адлюстроўвае годнасць народа: «Сцяг і Пагоню высока трымай, годна і слаўна між роўных навечна жыві!» Прапанаваная песня дапамагае спадзявацца на заўтрашні дзень і нарэшце зразумець, хто ж мы такія. Гэта заўсёды будзе актуальна.

З павагай,

студэнтка філфака ГДУ імя Ф. Скарыны В. КЛЮЙКО

Уважліва сочым за абмеркаваннем у друку конкурсу на Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Найбольш удалым лічым гімн «Жыве Беларусь» на музыку Раінчыка, словы Пранчака. На наш погляд, ён валодае менавіта тымі якасцямі, якія павінны быць у Дзяржаўнага гімна — урачыстай, узнёслай і разам з тым вельмі мілагучнай мелодыяй, кранаючымі душу словамі, — і выгадна адрозніваецца ад іншых твораў, прадстаўленых на конкурс.

І. НІКАЛАЕВА, Л. ДЗЕМІДЗЕНКА, магіляўчанкі

Выказваюся адназначна: «Магутны Божа» і ёсць тое, што выказвае дух нацыі. І словы, і музыка. Мікола Равенскі — дастойны пераемнік Нестара Сакалоўскага як аўтара гімна. У руцэ Божай і ў руках нацыянальнай інтэлігенцыі Дзяржаўны гімн Беларускай рэспублікі. Віктар Скорабагатаў прапанаваў тэкст, які не толькі камісія, нават ніхто, апрача глухога, не можа ўхваліць. Варыянтаў няма. «Магутны Божа». Ці — «Маладая Беларусь».

З маленства на сабе віну нашу...
Пазбаўлены правоў самасцвярджэння,
З надзеяй неба я прашу:
«О, госпадзі, дазволь нам Адраджэнне».

З павагай,

Мікола ЛУФЕРАЎ

г. Магілёў

Адгалоскі

Ліст Леаніда Анціпенкі «Навошта ігнараваць слоўнікі?» /«ЛіМ», N 47, 26.XI.93/ выклікаў нечакана шмат водгукаў. Два з іх прапануем увазе нашых чытачоў.

«НЕ ТРЭБА НАМ БЕРАГ ТУРЭЦКІ»

Прачытаў нататку Леаніда Анціпенкі «Навошта ігнараваць слоўнікі» і вырашыў сам заглянуць у іх.

Дык вось што даюць слоўнікі: «Беларуска-расійскі слоўнік» М. Байкова і С. Некрашэвіча, выданне 1926 года — хвіля, хвіліна — мінута; «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» А. Баханькова, І. Гайдукевіча і П. Шубы, выданне 1990 года — хвіліна — кароткі прамежак часу, момант, імгненне; «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», складальнік — Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР у 5-ці тамах, 1984 г. — хвіліна — кароткі прамежак часу, момант, імгненне; «Беларуска-рускі слоўнік» С. Грабчыкава, выданне 1991 года — хвіліна — мінута, момент, міг, мера времени.

Як бачна, слоўнікі перакладаюць даволі адназначна. У трох з іх слова «мінута» нават не ўпамінаецца /праўда, магчыма, з-за абмежаванасці аб'ёму/, а ў акадэмічным 1984 г. выдання ўпамінаецца «мінута» — кароткі прамежак часу, адзінка вымярэння вугла і дугі. Як бачым, уся соль у тым, у якія слоўнікі глядзець і з якой мэтай. Да ведама спадара Анціпенкі, да вайны і ў першыя пасляваенныя гады на Беларускім радыё ўжывалася слова «хвіліна». Потым, у сорак сёмым або сорак восьмым годзе, нейкім загадам слова «хвіліна» было заменена на «мінуту». У тлумачэнні было сказана, што слова «хвіліна» з'яўляецца ўкраінскім і таму не можа ўжывацца на Беларускім радыё. Мяне, тады яшчэ малога, здзівіла, што агульнае з украінскай мовай слова ўжывацца не можа, а вось агульнае з рускай — можа. Дарэчы, наша сучасная мова вельмі засмечана русізмамі, або калькамі з рускай мовы. Мяне заўсёды здзіўляла, што нават у афіцыйных паведамленнях, пастановах, законах ужываецца слова «граніца». Зазірнуў я, як і раіць сп. Анціпенка, у слоўнікі: «Расійска-беларускі слоўнік» В. Ластоўскага, выданне 1924 г. — граница — рубеж, мяжа, дукт; «Беларуска-расійскі слоўнік» М. Байкова і С. Некрашэвіча, выданне 1926 года — мяжа — граница; «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» А. Я. Баханькова, І. М. Гайдукевіча, П. П. Шубы, выданне 1990 г. — мяжа — граніца паміж зямельнымі ўчасткамі, лінія, якая дзеліць тэрыторыю сумежных дзяржаў. «Беларуска-рускі слоўнік» С. М. Грабчыкава, выданне 1991 г. — мяжа — граница между государствами.

Такім чынам, слова «мяжа» мае ўсе падставы на грамадзянства ў беларускай мове. А таксама і вытворныя ад яе: памежная ахова, памежнае войска і г. д.

Патрэбна прызнаць, што з лёгкай рукі «прараба перабудовы» ў апошні час у беларускую мову цераз рускую хлынулі ракой словы з іншых моў, выцясняючы беларускія. Ну, скажыце, навошта нам ужываць «спонсар», «кансенсус», калі ў нас ёсць аднолькавыя па сэнсу «фундатар», «згода»? Такіх слоў можна набраць процьму.

Лічу, што ўсім, хто карыстаецца беларускай мовай, на радыё, тэлебачанні, у органах друку, а згодна з «Законам аб мовах» і тым, хто займаецца справаводствам, трэба вельмі ашчадна адносіцца да мовы і не ўжываць чужое, калі ёсць роднае.

Р. ЛОЙКА, ветэран працы

г. Мінск

ВЯРТАЦЬ ЗАБЫТАЕ

У адрозненне ад Л. Анціпенкі я не думаю, што карыстанне словам «хвіліна» замест слова «мінута» ў значэнні часткі гадзіны можа быць данінай модзе. Зрэшты, з гэтым магчыма было б пагадзіцца, калі лічыць модай само адраджэнне матчынай мовы. Але паважаны Л. Анціпенка, як і кожны, хто неабыякава ставіцца да яе лёсу, здаецца, так не мяркуе.

Чым жа ён незадаволены? «Перш чым уводзіць тую ці іншую навацыю, — чытаю ў газеце, — варта заглянуць у слоўнік». Чыстая праўда! Яшчэ лепш пастаянна трымаць слоўнікі пад рукой, хоць яны, праўду кажучы, не заўсёды ідуць у нагу з жыццём. Што тычыцца навацый, дык у дадзеным выпадку іх зусім няма. Ёсць проста вяртанне да таго, што ў нашай мове ўжо было, пакуль не пачалася яе гвалтоўная русіфікацыя. Мне, напрыклад, урэзалася ў памяць — гэта было яшчэ да вайны, — як наш школьны настаўнік, напрыканцы кожнага ўрока, паглядваючы на свой гадзіннік, голасна гаварыў, колькі хвілін /менавіта так, а не «мінут» засталося да перапынку.

Давайце, аднак, возьмем прыклад з аўтара нататкі і разгорнем «Русско-белорусский словарь», толькі не другое выданне, на якое ён спасылаецца, а першае, выпушчанае ў 1953 годзе. Праца над ім распачалася падчас вайны і вялася, калі яшчэ не было такога моцнага націску на нашу мову, асабліва на яе слоўнікавы склад, які /націск/ стаў адчуваць пазней. Слова «хвіліна» /побач з «мінутай»/ тады азначала не толькі кароткі прамежак часу /момант, імгненне/, але і меру часу /частку гадзіны/. Гэта і было зафіксавана у першым выданні слоўніка.

Шкада газетнай плошчы, таму не стану перапісваць з яго ўвесь артыкул «мінута», а звярну ўвагу толькі на тры ілюстрацыйныя прыклады на беларускай мове, якія гавораць самі за сябе: «без 20 хвілін /мінут/ чатыры», «10 хвілін /мінут/ на пятую», «хвілінная /мінутная/ стрэлка». Ва ўсіх наступных выданнях «Русско-белорусского словаря» са згаданых прыкладаў «хвіліну» выкідвалі, робячы «мінуту» манапалістам. Але радуе /праўда, не ўсіх/, што з'яўляюцца ўжо слоўнікі, якія рэабілітуюць гэта прыгожае беларускае слова, выцягваюць яго з цёмнага кута, куды яно было зацісну та...

Працэс адраджэння таго, што душылася машынай камуністычнага рэжыму на працягу дзесяцігоддзяў, ідзе, на жаль, нялёгка. Гэта адносіцца і да роднай мовы. Таму, на мой погляд, сродкі масавай інфармацыі робяць добрую справу, пашыраючы ўжыванне тых слоў, якія ўчора пад маркай «нармалізацыі» і «ўпарадкавання» замяняліся расійскімі ці перароблены мі на расійскі лад, а сёння яшчэ не паспелі трапіць у новыя слоўнікі. Недарэчна ў гэтых варунках вінаваціць журналістаў і дыктараў у імкненні ўнесці нейкую «блытаніну» і тым больш «збядніць» беларускую мову. Дальбог жа, не трэба замінаць яе разняволванню, паважаны калега!

Генадзь ЛАГУНОВІЧ

г. Мінск

Алесь АДАМОВІЧ

Алесь Адамовіч заўсёды заставаўся патрыётам, верным сынам роднай Беларусі.

Светлы вобраз Алеся Міхайлавіча Адамовіча назаўжды застанецца ў памяці суайчыннікаў, ягоных сяброў і блізкіх.

26 студзеня на 67 годзе жыцця раптоўна памёр вядомы пісьменнік і грамадскі дзеяч член-карэспандэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Алесь Адамовіч.

Алесь /Аляксандр Міхайлавіч/ Адамовіч нарадзіўся 3 верасня 1927 г. у вёсцы Канюхі Капыльскага раёна. Пятнаццацігадовым юнаком ён ваяваў у партызанскім атрадзе на Бабруйшчыне. Пасля вайны скончыў філалагічны факультэт БДУ і аспірантуру. Значная частка жыцця Алеся Адамовіча звязана з працай у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі, дзе ён прайшоў шлях ад навуковага супрацоўніка да загадчыка сектара ўзаемасувязей літаратур. Абараніў доктарскую дысертацыю, быў абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук. У 1962—1966 гг. і з 1987 г. Алесь Адамовіч жыў у Маскве, дзе вучыўся на Вышэйшых курсах сцэнарыстаў і рэжысёраў, выкладаў беларускую літаратуру ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце, а ў апошнія гады працаваў дырэктарам Навукова-даследчага інстытута кінамастацтва.

Алесь Адамовіч быў глыбокім вучоным-літаратуразнаўцам і крытыкам, адным з вядучых на Беларусі. Яго пяру належаць такія вядомыя працы, як «Беларускі раман. Станаўленне жанра», «Маштабнасць прозы. Урокі творчасці К. Чорнага», «Здалёк і зблізку», «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» і шматлікія літаратурна-крытычныя зборнікі. Ён адкрыў магістральны накірунак у беларускім літаратуразнаўстве, звязаны з глыбокім эстэтычным і духоўным пошукам, з увядзеннем нашай літаратуры ў сусветны кантэкст.

Алесь Адамовіч — аўтар раманаў «Вайна пад стрэхамі», «Сыны ідуць у бой», «Хатынскай аповесці», твораў «Асія», «Карнікі», «Апошняя пастараль» і іншых дакументальных кніг, напісаных у сааўтарстве з Я. Брылем, У. Калеснікам «Я з вогненнай вёскі...» і Д. Граніным — «Блакадная кніга». У гэтых творах ён пераасэнсоўваў трагічныя падзеі другой сусветнай вайны, асабісты і народны ўдзел у ёй з пазіцый мастака-гуманіста, актыўнага змагара за праўду ў літаратуры, за адвечныя маральныя каштоўнасці, за мір на планеце. Яго літаратурная дзейнасць адзначана прэміяй Міністэрства абароны СССР /1974/ і Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа /1976/.

На матэрыяле ўласных твораў пісьменнік стварыў сцэнарыі кінадылогіі «Партызаны» і мастацкага фільма «Ідзі і глядзі», які атрымаў першую прэмію на Сусветным кінафестывалі ў Маскве.

Алесь Адамовіч вёў шырокую грамадскую дзейнасць у Беларусі і за яе межамі, меў прынцыповую грамадзянскую пазіцыю, цвёрда адстойваў свае погляды. У 1989 г. ён быў выбраны народным дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

ДЗЯМЧУК М.І., БУТЭВІЧ А.І., ПЛЕП У.А., ПЛЕВІЧ Н.С., БАРАДУЛІН Р.І., БРЫЛЬ І.А., БЫКАЎ В. У., ПАНЧАНКА П.Е., СКУРКО Я.І. /МАКСІМ ТАНК/, ШАМЯКІН І.П., АДАМЧЫК В.У., АЛЕКСІЕВІЧ С.А., АНДРАЮК С. А., БЛАКІТ /БОЛТАЧ/ В. У., БУРАЎКІН Г. М., ВЯРЦІНСКІ А. І., ГНІЛАМЁДАЎ У. В., ДАЛІДОВІЧ Г. В., ДУДАРАЎ А. А., ЖАЛЯЗОЎСКІ А. П., ЗАКОННІКАЎ С. І., ЗУЁНАК В. В., КАВАЛЕНКА В. А., КАЗЬКО В. А., КАЛЕСНІК У. А., КІСЛІК Н. З., КОЛАС Г. Д., КУДРАВЕЦ А. П., ЛОЙКА А.А., МАЛЬДЗІС А.І., НАВУМЕНКА І.Я., ПАЎЛАЎ У.А., ПІСЬМЯНКОЎ А.У., ПТАШНІКАЎ І.М., САЧАНКА Б. І., СІПАКОЎ І. Д., СУПРУНЧУК В. П., ТАРАС В. Я., ТЫЧЫНА М. А., ЧЫГРЫНАЎ І. Г., ШАБАЛІН А. А., СУШЧЭНЯ Л. М., ГАНЧАРЭНКА А. М., ВЫСОЦКІ М. С., ГАРЭЦКІ Р. Г., ЛЫЧ Г. М., НІКІФАРАЎ В. А., КРАСІНСКІ А. В., ТУРАЎ В. Ц., КЛІМАЎ Э. Г.

ГОРКА І БАЛЮЧА БЕЗ ЯГО НА БЕЛАРУСІ

Цяжка ўявіць цяпер беларускую літаратуру без ягонага аўтарскага слова, яго мудрых разваг аб шмат якіх з'явах сучаснага мастацтва — беларускага, расейскага ды і еўрапейскага таксама. Без ягонага жывога ўдзелу трудней будзе і расейскім і беларускім дэмакратам у іх вялікай палітыцы, якая і надламіла ўрэшце яго надта ўражлівае сэрца. Ён не шкадаваў сябе — ён заўжды шкадаваў людзей, — пагарджанае, абрабаванае, заняволенае на гады камуністычным пачварствам, з якім ён змагаўся, мабыць, з юнацкіх гадоў. Увесь ягоны талент літаратуразнаўцы, пісьменніка, публіцыста і палітыка быў свядома скіраваны ім менавіта на тую барацьбу за праўду і справядлівасць. Ядзерна-ракетнае ачмурэнне нядаўніх гадоў, злачыннае няшчасце Чарнобыля, камуністычная Вандэя /а цяпер з яго трапнага вызначэння — і беларускі Парагвай/, — усё тое выклікала яго палкі чалавечы пратэст і клікала на змаганне ўсімі магчымымі сродкамі — ад друкаванага слова да мітынговай трыбуны. Вядома, тое ў наш час не абыходзіцца марна. Яго пераследавалі ў Маскве, — пры Хрушчове, пры Брэжневе, яго спрабаваў не пусціць у Менск хвалёны Машэраў. Урэшце іхнія нашчадкі дамагліся — яго выжылі з Беларусі на своеасаблівую маскоўскую эміграцыю. Але ён і там жыў і змагаўся ўсё з тым жа найвялікшым злом XX стагоддзя і яшчэ ствараў свае выдатныя творы — пра вайну /сваю, партызанскую, і народную/, пра жыццё людзей пад камуністычнай узвалай, пра неабходнасць праўды і справядлівасці — якасцяў заўжды дэфіцытных як у жыцці, так і ў літаратуры. Вядома, найперш ён быў празаік, але бясспрэчны ягоны ўплыў на развіццё пасляваеннага літаратуразнаўства. Менавіта ягонымі высілкамі вернуты з небыцця наш Максім Гарэцкі, адноўлены шмат якія старонкі зарыштаванай літаратуры. Урэшце як свой запавет беларускаму народу ён надрукаваў нядаўна ў «Полымі» апошнюю сваю аповесць, надта ж беларускую па светаадчуванні, пранізлівую і горкую, тым праспяваўшы свой развітальны амэн роднай яго старонцы.

Дужа бедна, горка і балюча будзе цяпер на Беларусі без яе яшчэ аднаго вялікага і смяротнага сына, мілага Сашы, мудрага Алеся, самаадданага і сумленнага барацьбіта за праўду пагарджанага народа — Алеся Адамовіча.

Васіль БЫКАЎ

Здымак зроблены 29 студзеня ў час развітання з Алесем Адамовічам у мінскім Доме літаратара. Пахаваны пісьменнік у вёсцы Глушо Бабруйскага раёна побач з магілай маці...

ДБАЎ НЕ ПРА СЯБЕ

Прыходзяць і адыходзяць людзі. Шчаснае з'яўленне ў гэтым свеце любога чалавека. Багата чаго даецца яму. Нямногія па-сапраўднаму расплачваюцца за дар жыцця. Ціха прамаўляюцца словы ў сувязі /о, Божа, як проста ўсё пад сонцам і месяцам! / са смерцю Алеся Міхайлавіча Адамовіча. Дбаў ён не пра сябе, і любое гучнае слова будзе тут мітуслівым. Ён як мала хто разумеў — «и капля вод полна страданий, и неизбежностей полна». Ён як мала хто «браму скарбаў тваіх адчыняў» — беларускі народзе. Пайшоў ад нас змагар справядлівасці. Ёсць нешта дзіўнае й трагічнае ў тым, што гэта здарылася менавіта цяпер. Пайшоў у нябыт самы, можа, апантаны рыцар нашага зусім не донкіхоцкага беларускага часу. Даруйце, Алесь Міхайлавіч, — Вы пайшлі назаўжды ў нашую памяць.

Супрацоўнікі часопіса «Крыніца».

Саюз пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці пісьменніка Алеся Адамовіча — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, члена-карэспандэнта Акадэміі навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Аб'яднанне Дзяржаўных літаратурных музеяў Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшаму навуковаму супрацоўніку Літаратурнага музея Якуба Коласа Адамовіч-Шувагінай Наталлі Аляксандраўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці бацькі Аляксандра Міхайлавіча Адамовіча.

Беларускі ПЭН-цэнтр смуткуе з прычыны заўчаснай смерці аднаго са сваіх заснавальнікаў Аляксандра Міхайлавіча Адамовіча і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

Калектыў Літаратурнага музея Якуба Коласа глыбока спачувае старшаму навуковаму супрацоўніку музея Наталлі Аляксандраўне Адамовіч з прычыны смерці бацькі.

Калектыў рэдакцыі часопіса «Нёман» глыбока смуткуе з выпадку смерці выдатнага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча, члена рэдкалегіі нашага часопіса Алеся Міхайлавіча Адамовіча і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў рэдакцыі часопіса «Полымя» глыбока смуткуе з выпадку смерці выдатнага беларускага пісьменніка і грамадскага дзеяча Алеся Міхайлавіча Адамовіча і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

НЕ ХАПАЛА «МАЙСТЭРСТВА»? ЁСЦЬ І ЯНО!

Майстэрства патрэбна ў любой справе, каб працаваць па-сапраўднаму творча, з карысцю. Дзеля гэтага трэба вучыцца. Вось таму Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі і вырашыў выдаваць часопіс менавіта з такою назваю — «Майстэрства». Сёлета мяркуецца выдаць шэсць кніжак, што будуць паступаць у розніцу, а з наступнага года арганізаваць падпіску. Толькі што пабачыў свет першы нумар «Майстэрства». Як і звычайна ў падобных выпадках, ён адкрываецца зваротам «Да чытачоў». Сваёй галоўнай мэтай «М» ставіць «услаўленне ўмельства ва ўсіх яго стваральных праявах». Змешчаны інтэрв'ю з міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь В. Гайсёнкам /«Адукацыя працуе на будучыню»/, гутарка з намеснікам міністра А. Гарнаком /«Простая ісціна: грамадства жыве так, як яно вучыцца»/ і самыя розныя матэрыялы, якія тычацца надзённых праблем нашага складанага жыцця.

У «БЕЛАРУСКАЙ ДУМЦЫ»

Адзінаццаты нумар часопіса «Беларуская думка» адкрываецца артыкулам У. Лазавога «Замак у Міры», у якім ідзе гаворка пра ўчарашні і сённяшні дзень помніка архітэктуры. Друкуюцца вершы З. Дудзюк і Л. Аляксеевай, рэцэнзуецца кніга М. Казакова «Вянок васільковы». У. Казлякоў /«Пачынаючы ад Дзяржавіна...»/ расказвае аб падарожжы паэта па Беларусі. М. Маліноўскі запрашае ў Нясвіж — «Слуцкая брама». М. Огнеў гутарыць з мастацкім кіраўніком ансамбля «Свята» В. Купрыяненкам /«Свята» — еўрапейскі ансамбль»/.

ГАРЫ, ГАРЫ, СВЯТЛО...

Цуд-кніжачка з'явілася ў выдавецтве «Беларусь». Невялікага фармату, з густам афармленая. Называецца яна «Святло таямнічага вогнішча». А напісаў яе кандыдат філалагічных навук Аляксей Ненадавец, творча пераасэнсаваўшы шмат якія народныя легенды і паданні. Прытым пераважна рэдкія, уласна запісаныя: не прайшлі дарам вандроўкі Аляксея Міхайлавіча па роднаму краю. Перагортваеш старонку за старонкай і ... быццам ажываюць старыя заімшэлыя валуны, пачынаюць гаварыць каменныя крыжы, гамоняць хвалі азёраў, прыадкрываюць таямніцы жывёлы. Так і хочацца сказаць: «Гары, гары, святло вогнішча, запаленага рупліўцам!» Гары, асвятляючы нам шлях, што вядзе ад нацыянальнага нігілізму да Адраджэння.

САБАЛЕЎСКАМУ — МІЖНАРОДНАЯ ПРЭМІЯ

Рашэннем Камітэта па прысуджэнні Міжнароднай прэміі «Адзінства» /Масква/ вядомаму беларускаму тэатразнаўцу, доктару мастацтвазнаўства, галоўнаму рэдактару часопіса «Тэатральная Беларусь» Анатолю Сабалеўскаму за выдатныя заслугі ў развіцці тэатразнаўчай навукі, падрыхтоўку спецыялістаў высокай кваліфікацыі для СНД і актыўную прапаганду ідэй дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі прысвоена званне ЛАЎРЭАТА.

КАЛІ Ў ВАС НЯМА БАБУЛІ...

Добра, калі ў доме, дзе нарадзілася дзіця, ёсць рухавая бабуля-выхавацелька: яна навучыць маладую маці, і як купаць дзіця, і як правільна да грудзей прыкладваць, і многаму іншаму. Такой вось дасведчанай, вопытнай «бабуляй» стане для маладых бацькоў кніга М. Дзяругінай «Ад калыскі да школы і далей» /на рускай мове, выд. «Беларусь»/. Гэта другое, дапоўненае і перапрацаванае выданне, дзе расказваецца пра догляд, асаблівасці развіцця і выхавання дзіцяці ад першых дзён жыцця да школьнага ўзросту. Карысная кніга і тым, што апавядае пра тыповыя захворванні гэтага перыяду і як з імі змагацца.

Ліст, які прапануецца ўвазе чытачоў «ЛіМа», цікавы ў двух аспектах. Па-першае, таму, што адрасаваны сусветна вядомаму літаратару, якога камуністычная ідэалогія абвясціла вялікім пралетарскім пісьменнікам, заснавальнікам метаду «сацыялістычнага рэалізму».

Як здагадаўся чытач, гаворка ідзе пра Максіма Горкага. Праўда, у час, на які прыпадае гэты ліст, ён жыў яшчэ ў Італіі, у сонечным Сарэнта. Але артыкулы яго, напісаныя ўдалечыні ад Савецкага Саюза, на вялізных прасторах якога разгортваліся буйнамаштабныя сацыяльныя эксперыменты, услаўлялі распачатую ВКП/б/ «вялікую будоўлю» і друкаваліся ўсімі вядучымі газетамі краіны.

Ліст невядомага аўтара з Беларусі, перахоплены ДПУ і адразу ж перададзены кіраўніцтву ЦК КП/б/Б /падпісаны 1 лістапада 1930 г. ён ужо 5 лістапада быў зарэгістраваны ў сакрэтным аддзеле ЦК, адкуль і трапіў у архіў/, каштоўны ўжо тым, што перадае атмасферу тагачаснага жыцця рэспублікі, жыцця невыносна цяжкага для большасці народа, змушанага весці паўгалоднае існаванне. І хоць масавы голад, які панаваў на Украіне і некаторых рэгіёнах Расіі, яшчэ тады ў поўнай меры не зачапіў Беларусь, але, як сведчаць архіўныя дакументы, у шэрагу раёнаў Гомельшчыны мелі месца выпадкі смерці ад голаду.

Цікавымі, на маю думку, з'яўляюцца і сведчанні аўтара аб сацыяльнай няроўнасці так званага «бяскласавага грамадства» з яго спецразмеркавальнікамі, спецпайкамі, спецсанаторыямі і іншымі «спец» для партыйна-дзяржаўнай эліты.

Р. ПЛАТОНАЎ,
вядучы навуковы супрацоўнік БелНДЦ дакументазнаўства і архіўнай справы, доктар гістарычных навук

«УСЁ РОБІЦЦА З-ПАД ПАЛКІ...»

Італія. Сарэнта

Максіму Горкаму.

Тав. Горкі! Вельмі сумна, што ў гады нашага найвялікага вопыту пабудовы сацыялізму ў адсталай і малакультурнай краіне Вы дазволілі абраць сваім месцам жыхарства далёкую Італію, дзе набылі шматмільённую маёмасць і сродкі. Вам, пэўна, асабістыя інтарэсы вышэй за грамадскія і сукупнасць вашых паводзін пераканалі нас дастаткова ў меркантыльнасці і фанабэрыстасці Вашай натуры.

Наогул, як можна аднесці Вас да сяброў, калі дзеі Вашага асабістага жыцця далёка разыходзяцца з тымі фактамі, якія Вы так маляўніча выкладаеце ў сваіх творах. Няма веры таму, што Вы пішаце.

Цяпер Ваша прысутнасць у СССР была б вельмі каштоўнай для ўсіх нас і дала б новыя сілы і веру ў пераадоленні ўсіх цяжкасцей, асабліва апошняга часу. Мы літаральна галадаем і прадастаўлены выпадковым фактам і абставінам палітыкі. А апошняя хваля гвалту і дэспатызму? Калі мы пішам пра нечуваныя ахвяры фашысцкага тэрору на Захадзе, то часам задумваешся, чым жа не тэрор, яшчэ, магчыма, горшага парадку, праводзіцца і ў нас? Сотні тысяч людзей высланы за пасіўнасць да калектывізацыі або толькі смеласць выказаць праўду ў вочы.

Пішуць у «Известиях», што нібыта арыштаваныя і сасланыя не працуюць у прымусовым парадку на лесанарыхтоўках і золатапрыісках, а мы добра ведаем ад родных і знаёмых, што няпраўду пішуць, і сасланыя працуюць у самых цяжкіх умовах у лесе і ў шахтах. Дзе ж праўда? Чаму так шмат стала хлусні цяпер і падману?

Вазьміце Беларусь, дзе тэрор дасягнуў вышэйшай мэты і дзе няма людзей, якія вераць у добрае будучае, бо ўмовы жыцця пагаршаюцца з кожным днём. Карміцца няма чым, у сталоўках памыі, жалаванне затрымліваецца месяцамі і шмат іншага. Дзе ж абяцаны рай? А, побач з гэтым, тыя, хто пры ўладзе, жывуць інакш. Ім усё можна. Сталоўкі пры ЦК партыі, пры ДПУ, пры Саўнаркоме і пры Камвузе — маюць усё. І гэта ў той час, калі ўсе астатнія мушаны цаніць кожны кавалак хлеба. Дроў няма, мяса не бачым з вясны. А гэтыя сталоўкі штодня выдаюць сваім шчаслівым наведвальнікам мясныя харчы. Праўда, усе гэтыя сталоўкі зачынены і для шырокіх мас недаступныя.

Як жа можна працаваць на галодны страўнік? Мы маем выстаўку, але на ёй паказваюць, чаго не маем. Для чаго трэба было траціць каля 2-х мільёнаў на такую нерэнтабельную справу, калі сядзім галодныя? У гады грамадзянскай вайны было лягчэй: тады былі ідэалы, спадзяванні, ды і ўсе былі роўныя ў пайку і адзенні. А цяпер? Паглядзіце і пераканайцеся.

Сялянства азлоблена да крайнасці, і няма магчымасці паказацца ў раён, вёску. Ніхто вам не верыць, і абрыд ва ўсім падман.

Тупік стаў відавочным, і непазбежнасць краху адчуваецца больш востра з кожным днём. Уся зямля стогне ад жаху і хлусні. Стаміліся мы ад усяго. Не хапаем перамены ўлады, а жадаем перамены палітыкі, бо і Рыкаў, і Бухарын былі правыя заўсёды, а дапушчаныя доследы вядуць нас да пагібелі.

Вам трэба было б прыехаць і паглядзець, якімі фактамі можна падмацаваць справядлівасць сказанага. Усё ж робіцца з-пад палкі, і людзі прывыклі да гвалту, іншыя проста запалоханы. Ёсць затое прайдзісветы, якія ў гэты жахлівы момант ловяць рыбку ў балоце і здабываюць уласны дабрабыт. І такіх шмат.

Трэба паглядзець і пераканацца. Вулкан блізкі да вывяржэння, і трэба падумаць, навошта было траціць столькі чалавечай крыві, каб выхаваць яшчэ большае рабства, чым яно было да рэвалюцыі.

Нам нават лячыцца няма чым: няма лекаў — ёду, давераускіх парашкоў, анісавых кропляў і іншага. А навошта ўсё гоняць за мяжу і за бясцэнак? З намі не лічацца: мы, маўляў, быдла, можам пагаладаць. А дзеці нашы як галадаюць і якая цяжкая ўся гэта карціна! Не верце таму, што пішуць, а спытайце ў нас, паглядзіце, пагаварыце ў сёлах і вёсках...

Пішуць пра забарону чырвоных франтавікоў і іншых арганізацый на Захадзе. А ці ж у нас лепш? Хто хоча мець сваё асабістае меркаванне — уцякайце. У нас усё паралізавана і прыбіта і нікому не дадзена права самастойна разважаць, імкнуцца да распазнання ісціны і ўстанаўлення праўды. Праўды даўно няма і не даводзіцца яе чакаць, няма веры і нават проста надзеі. Усё і перакручана, і аплявана...

Пра хлеб і пісаць моташна. Па-першае, яго даюць абмежавана — па 300 грамаў на чалавека, яго зусім не хапае, а, па-другое, ён непрыгоднай якасці, з дабаўкамі аўса і іншых сурагатаў. Белага хлеба мы і не бачым, яго няма нават для хворых.

Вельмі цікавы Ваш артыкул у газеце «Известия» пад назвай «Умники». Нам здаецца, што гэта назва і па змесце самога артыкула больш за ўсё падыходзіць менавіта да Вас. На самай справе, навошта Вы седзіце там, далёка ад нас, за мяжой, і не карыстаецеся ўсімі правамі нашага быту і ўмоў існавання? Чаму Вы іменна не далі свайму сыну адукацыі ў нас, а прадаўжаеце выхоўваць усю сям'ю ва ўмовах капіталізму, з усімі выгодамі і ненармальнасцямі гэтага парадку?

А гэтак жа лёгка і свабодна пісаць, атрымліваць за напісанае ганарары і не бачыць сапраўдных фактаў. Як лёгка есці і піць колькі хочаш у Італіі, не бачачы нашых пастаянных нягод і недахопаў.

Наогул смешныя усе падобныя Вашы апісанні і паперапэцканні. Верыць зможам толькі тады, калі Вы прадасце ўсю сваю маёмасць і ўнесяце кошт яе ў агульны кацёл нашай краіны.

Калі б Вы хоць крыху хацелі быць аб'ектыўным, то павінны былі напісаць праўду пра нас. А гэта праўда Вам вядома добра. Спытайце Клару Цэткін, як галадаюць рабочыя і служачыя Саюза і як бязлітасна праводзіцца гэтая галадоўка за кошт вывазу ўсяго, што ў нас каштоўнага, за мяжу. Як паляць нашы лепшыя папяросы, ядуць нашы харчы, носяць наш абутак, смакуюць нашу садавіну, грыбы, цукеркі, цукар і г.д. Затое мы нічога гэтага не маем, а атрымліваем крошкі для сябе і нашых дзяцей. Нам абяцаюць: рай у будучыні, але цяпер знясільваюць нашы арганізмы і прыводзяць нас у стан апатыі і разбурэння. Калі ўсё гэта робіцца ў імя сацыялізму, то мы не разумеем ні мэты, ні задач такога эксперыменту...

Нам не даюць газы больш за літр на чалавека ў месяц, затое мы накіроўваем яе за мяжу. Нам не даюць цукру, але прадаюць яго па цэнах спекуляцыі, а паёк атрымліваем паўкілаграма на месяц. А мы ж былі заўсёды супраць спекулянтаў, змагаліся супраць спекуляцыі, тысячы людзей расстралялі за гэта, а цяпер самі сталі спекулянтамі, прадаючы розныя тавары ў тры разы даражэй. Капусты, гародніны, яблыкаў мы таксама не маем ўдосталь. Мяса знішчылі самі, а цяпер шукаем шкоднікаў і ствараем ілжывыя працэсы аб шкодніках, не аддаём іх галоснаму суду, а расстрэльваем. Нам да гэтага не прывыкаць: у перыяды замінак і цяжкасцяў мы шукаем стрэлачнікаў і расстрэльваем абы-каго. Жыццё стала пеклам. У вёсках п'янства і разгул. Грошы-жалаванне выдаюць неакуратна, а патрабуюць подзвігаў ад паўгалодных і абяздоленых людзей, якія не бачаць выйсця з тупіка і жахаў гэтага становішча. Дайшло да таго, што школьнікаў пасылаюць на палі для ўборкі ўраджаю, а калгасы развальваюцца і ўсё трымаецца пад сілай і пагрозамі штыкоў. Праўда, ім патакаюць, ім даюць добрыя пайкі.

Увогуле трэба было б Вам больш сур'ёзна і сумленна паставіцца да абавязку бытапісьменніка і пісаць пра тое, што сапраўды існуе, што ёсць і што з'яўляецца нашым штодзённым існаваннем...

Прыязджайце і пераканайцеся самі, а" прыехаць варта і паглядзець, што мы сабой уяўляем, да чаго дайшла наша галеча і якія мы бедныя, не маем нават элементарных выгод у кватэры, у харчаванні і адзенні. Словам, жывём крыху горш, чым жылі ў старой Расіі беднякі. Асабістай думкі мы не маем і не можам мець, яе у нас даўно забралі, нас абезгаловілі інтэлектуальна і маральна.

Голад насоўваецца на краіну, і ў сталоўках мы не маем нічога, акрамя бурды, затое нашы кіраўнікі і глаўкі ўсё маюць і на нашых касцях будуюць свае асабістыя дабрабыт і «сацыялізм».

Час Вам напісаць карціну рэчаіснасці, а не апісваць хлуслівыя факты і не ўводзіць іншых у зман.

Мінск, 1/XI-30 г.

Заўвага: Дакумент надрукаваны на машынцы.

Правільна: Ст. упаўнаважаны 3-га аддзялення ІРО ПП АДПУ БВА

/Лабзін/

Адгалоскі

РУСІНЫ — ЛІЦЬВІНЫ — БЕЛАРУСЫ

Мушу ўступіць у дыскусію са спадаром Віталем Кошалевым /«ЛіМ» за 3.XII.1993 г./, раз ён палічыў неабходным адгукнуцца на мой допіс у «ЛіМе».

Не так даўно выйшла кніга матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў Маладзечне 19—20.08.92 г.

Вельмі добры артыкул у ёй паводле даклада Вячаслава Насевіча «Да пытання пра саманазву беларусаў у перыяд ВКЛ». Трэба пагадзіцца з аўтарам, што ў той час існавала шматступеневая самасвядомасць людзей. Першы ўзровень — магілёвец, палачанін, другі — беларусец, ліцьвін, паляшук /Усход, Захад, Палессе/ і, нарэшце, трэці ўзровень — жыхар ВКЛ /ліцьвін/.

Да таго ж нацыянальнасць замянялася часта веравызнаннем — рускія /беларусцы/ — праваслаўныя, ліцьвіны /потым палякі, да сённяшняга часу/ — каталікі.

Але мы разглядаем гістарычны этнонім. Безумоўна, варта забыць пра меркаванне В. Ластоўскага наконт «крывічоў». Бо чаму не «дрыгавічы» ці «радзімічы». Значыць, застаецца выбар паміж «беларусамі» і «ліцьвінамі». Тут варта адзначыць, што, як вядома, тэрыторыя нашай краіны падзялялася на дзве асноўныя гістарычныя вобласці: Літва і Русь /з XIII ст./. «Белая Русь» жа адносілася спачатку да Масковіі /Уладзіміра-Суздальская зямля/, потым — Пскова і Ноўгарада, і толькі ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя стала ўжывацца ў Вялікім княстве. Жыхары ўсходу Беларусі — Літвы зваліся да гэтага часу «русінамі», «рускімі», бо, па-першае, атаясамлялі рускую веру з праваслаўем, па-другое, памяталі часы Русі IX—XIII стст. /улада варажскіх князёў і дружын з племені «Русь»/. І, урэшце, насілі субэтнонім усходу за лініяй Браслаў — Лагойск — Петрыкаў /ці дняпроўскай Бярэзінай/. Меншчына, Наваградчына, Віленшчына, Гарадзеншчына і г. д. былі «Літвой», а жыхары «ліцьвінамі».

Такім чынам, бачым, што субэтнонімамі былі «русін» ці «рускі», «ліцьвін / літвін» і «паляшук». А дзе ж «беларус»? А ён з'явіўся значна і значна пазней, у канцы XVI стагоддзя. Падзел жа на «Літву» і «Русь» быў з XIII стагоддзя /»Палессе» адыгрывала значна меншую ролю/.

Але нельга згадзіцца з аўтарам, што «Літва» і «ліцьвін» адыгрывалі ролю толькі субэтнасу. У «Этнаграфіі Беларусі» чытаем у артыкуле «Літвіны, ліцьвіны» /стар. 292/: «У наш час ужываецца... як лакальны этнікон... /Бяроза, Івацэвічы, Косава, Пружаны, Наваградак, Воранава, Гародня, Паставы, Браслаў і інш./, /увага!/ — некаторых раёнаў бел.-укр. Палесся.., і часткова беларускамоўнага насельніцтва паўн. Чарнігаўшчыны, Кіеўшчыны, зах. Браншчыны і Смаленшчыны». А там жа субэтноніма «ліцьвіны» не магло быць! Значыцца, беларусы-ліцьвіны гэтых сумежных з Украінаю і Расіяй тэрыторый завуць сябе паўнавартасным этнонімам /!/.

Такім чынам, пры наяўнасці этніконаў /палачанін/, субэтнонімаў /русін, ліцьвін, паляшук/, палітоніма «ліцьвін» усё насельніцтва на этнічнай тэрыторыі ўжывала да сябе этнонім «ліцьвіны». Як кажуць, што і патрабавалася даказаць.

Трэба адзначыць, што ўсход Жамойці /Аўкштайція/ таксама з цягам часу стала звацца Літвой. Але тут мы бачым ланцужок — летапісная Літва /паміж Менскам і Наваградкам/, уся заходняя і цэнтральная частка нашай краіны, усходняя Жамойць. Першапачатковая /летапісная Літва/ была на тэрыторыі нашай краіны /дарэчы, невядома, ці была тая Літва наогул балцкай?/

Так што я прапаную не глядзець на розныя там рэаліі, не выдумляць нічога, а з цягам часу перайменаваць нашу дзяржаву ў Рэспубліку Літву і этнонім узяць вядома які. А жамойты хай сябе завуць хоць рымлянамі.

Сяржук ВАСІЛЕНКА

г. Мінск

ЛАЎРЭАТЫ ЧАСОПІСА «МАЛАДОСЦЬ»

Рэдакцыя часопіса «Маладосць» разгледзела публікацыі 1993 года і прысудзіла прэміі за лепшыя творы. Лаўрэатамі на гэты раз сталі: Ігар Пракаповіч /кніга вершаў «Рэха малітваў» у «Бібліятэцы часопіса «Маладосць»/, Таццяна Мушынская /кніга крытыкі ў «Бібліятэцы часопіса «Маладосць» «Гаркавы смак ісціны»/, Барыс Лагода /апавяданні, N 4/, Сяргей Квіткевіч /нарыс «Як я быў настаўнікам», N 6/, Наталля Салаўёва /мастацкае афарміленне N 6 часопіса, NN 1, 5, 6, 7, 11 «Бібліятэкі часопіса «Маладосць»/.

ПРА НАШ РОДНЫ МІНСК

Камплект з дванаццаці паштовак з выявамі нашай сталіцы выпусціла выдавецтва «Беларусь». Падобныя выданні з'яўляліся і раней. Але разглядаеш здымкі, зробленыя А. Ліхтаровічам, В. Ганчарэнкам, В. Грабяньковым, і з прыемнасцю зазначаеш для сябе, што гэтыя своеасаблівыя візітныя карткі горада адлюстроўваюць не толькі звыклыя вуліцы, палацы, як гэта практыкавалася колісь, а і помнікі, на якія яшчэ нядаўна не шмат звярталася ўвагі. Прынамсі, на паштоўках ёсць Праваслаўная царква Пятра і Паўла, Рымска-каталіцкі Траецкі касцёл /св. Роха/ на Залатой Горцы, Рымска-каталіцкі касцёл св. Сымона і св. Алены на плошчы Незалежнасці.

УРОК НЯСКОРАНАГА ДУХУ

Як мы паведамлялі ўжо, выдавецтва «Мастацкая літаратура» сумесна з СШ N 11 горада Мінска /да гэтай важнай справы падключылася і рэдакцыя «Настаўніцкай газеты»/вырашылі правесці шэраг прэм'ер найбольш значных кніг, якія выйшлі ў «МЛ» летась, ператварыўшы гэтае важнае мерапрыемства ў свайго роду ўрокі Адраджэння. Першы з іх называўся «Мацярынскае сэрца» і прысвячаўся кнізе У. Зянько «Спадчына маёй маці».

І вось чарговы ўрок — урок няскоранага духу. Адбыўся ён у Літаратурным музеі Янкі Купалы. І невыпадкова, што менавіта ў сценах Купалавага дома. Школьнікі прыйшлі на свята кнігі «Жыве Беларусь» Я. Купалы, якая пабачыла свет дзякуючы складальніку і аўтару прадмовы В. Рагойшу.

Вячаслаў Пятровіч і адкрыў гэтую сустрэчу, расказаўшы, як ідэйныя «цнатліўцы» да нядаўняга часу не друкавалі ўсе творы народнага песняра. Найперш тыя, у якіх аўтар, так бы мовіць, не надта збіраўся ўслаўляць рэвалюцыю, паслякастрычніцкія падзеі на Беларусі.

Уладзіслаў Рубанаў, Генадзь Шупенька, якія выступілі затым, таксама акцэнтавалі ўвагу на невядомым Купале, падкрэсліваючы, што менавіта ў творах, якія ўвайшлі ў кнігу «Жыве Беларусь», і раскрываецца душа паэта, улюбёнага ў Бацькаўшчыну, адданага ёй.

Выступіў таксама прэзідэнт дабрачыннага фонду садзеяння развіццю літаратуры і культуры «Палескі смутак» Мікола Мятліцкі, па ініцыятыве якога і праводзяцца гэтыя адраджэнскія ўрокі.

А яшчэ самадзейныя артысты СШ N 11 спявалі песні, танцавалі, чыталі неўміручыя Купалавы радкі.

Выступае Вячаслаў РАГОЙША.
Фота В. СТРАЛКОЎСКАГА

...І НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Тэалагічны часопіс «Рыцар беззаганнай», які выдаецца Беларускай каталіцкай грамадой сумесна з ордэнам францішканаў, стаў беларускамоўным. Першы нумар, што выйшаў і па-беларуску, прысвечаны Маці Божай і святому Максіміліяну Кольбэ, які заснаваў гэты часопіс ў дваццатыя гады ў Гародні.

Крыгтыка

УКРЫЖАВАНАЯ БЕЛАРУСЬ

ПАЭМА ЯНКІ КУПАЛЫ «НА ДЗЯДЫ»

Ледзь не згубілася ў купалаўскай спадчыне адна невялікая паэма, прарочы сэнс мастацкіх сімвалаў якой асабліва выразна выяўляецца зараз, у канцы XX стагоддзя, у кантэксце нашых нацыянальных бедаў. Паэма «На Дзяды» была напісана ў 1912 годзе, друкавалася ў «Нашай Ніве» /1912, N 48 ад 29 лістапада/, у кнізе паэзіі «Шляхам жыцця» /1913/ у раздзеле «Байкі і аповесці» побач з паэмамі «На Куццю» і «Курган», перадрукоўвалася ў прыжыццёвых зборах твораў паэта ў 1926, 1929 і 1940 гадах, у віленскіх /заходнебеларускіх/ перавыданнях кнігі «Шляхам жыцця» ў 1923 і 1935 гадах, а затым, аж да 1989 года — толькі за межамі Беларусі /Янка Купала. Спадчына. — Нью-Йорк — Мюнхен, 1955/. Сучасныя перадрукі паэмы — часопіс «Спадчына» /1989, N 1/ і кніга выбраных твораў паэта пад назвай «Жыве Беларусь» /«Мастацкая літаратура», 1993, укладанне В. Рагойшы/.

Мала друкаваная, але ўсё ж пазначаная ў бібліяграфічных даведніках савецкага часу, паэма Купалы «На Дзяды» не стала, на жаль, здабыткам мастацкай свядомасці нашчадкаў паэта, хоць ёй і прадвызначана была свая адметная роля ў духоўным адраджэнні нацыі.

Паэма абпальвае трагізмам усведамлення лёсу Беларусі як маці, што гадуе сваіх дзяцей ахвярнаю любоўю, а ўзнагародай мае толькі пакутніцкае ўкрыжаванне. Ува ўсім хрысціянскім свеце святым пачуццём ушаноўваюць тую, што дае жыццё, прыпадабняючы яе да Маці Божай, а на гэтай горкай зямлі ўчужанелы сын здзекуецца з уласнай маці.

Здзекі далей строіць дай жа,
Ласку з сэрца выжыў:
Суд судзіў, што я — не я ўжо,
І распяў на крыжы.

Мацярынская іпастась Беларусі ў паэтычнай уяве Купалы паўстала невыпадкова. Так спрацавала генетычная памяць, што не ўсведамлялася яшчэ духоўнай традыцыяй, хоць падспудна жыла ў глыбінях нацыянальнай свядомасці ад старажытнасці — ад фальклорных уяўленняў пра маці-зямлю, ад «Трэнаса» Мялеція Сматрыцкага з яго вобразам Маці-Царквы, якую пакінулі родныя дзеці, а ў новым часе праявілася ў вобліку Плачкі Яна Баршчэўскага. Гэтая памяць, як слушна заўважае Уладзімір Калеснік, абудзілася з «уздымам духоўнай актыўнасці ахопленых нацыянальна-вызваленчым рухам народаў».

У творчасці самога Купалы глыбока роднасная чалавеку-патрыёту мацярынска-жаночая прырода Айчыны, роднай зямлі спазнавалася рознымі гранямі ў шмат якіх творах. Жанчына-маці ў паэме «На Дзяды» адначасова і спрацаваная, трывушчая ў сваёй цярплівасці і ахвярнасці мацярынскай любові жанчына-сялянка /як, можа, Марыля ў «Раскіданым гняздзе»/, і княгіня, укаранаваная славай мінулых вякоў /пэўная сувязь з гераіняй паэмы «На Куццю»/. Пераважае рамантычная ідэалізацыя мінулага Маці-Беларусі, што і ў блізкіх па часе напісання «На Куццю», «Над Нёманам»:

Шла мая ў даль дзіва-сіла,
Як бы хвалі Нёмну;
На касе сваёй насіла
Княжацку карону.

. . . . . .

Засядала, расцвітала
За гадамі годы;
Залатыя думкі ткала
З шчасця і свабоды.

Прычыны трагедыі роднай Маці-Беларусі Купала шукае тут не ў знешніх момантах, не ў панаванні чужынскай сілы-гвалту, а ў самім народзе, у цемры ягонай прыспанай

НЯЗГАСНЫ РАНАК ЯГО ПАЭЗІІ

Хачу неспакойнаю хмарай грымець,
Маланкамі ўвесь апавіты.

Гэтыя, акрыленыя маладосцю радкі загучалі ў 1940 годзе. І ў той жа самы час душу Аркадзя Куляшова глыбока трывожыла філасофія жыцця і смерці.

Помню пачатак вясны 1940. Пухавічы. Дом творчасці, непадобны да нашых лясных Каралішчавічаў, ні, тым болей, да занадта мадэрнаванай «Ісламы». Ён стаяў у садзе, непадалёк ад рэчкі. Невялічкія пакоі не мелі ніякіх дываноў: толькі самае неабходнае і — чысціня. Светлае аблічча Куляшова гарманічна супадала з той чысцінёй.

Аднаго разу, надвячоркам, у шарую гадзіну, я зайшла ў гасцёўню. Пацыху іграла на піяніна мелодыі любімых песень. Прыйшлі Куляшоў і Бярозкін. Аркадзь сказаў: «Я здалёк пачуў «Выхожу один я на дорогу». А ты заспявай!» Я спявала напаўголаса. Ды хіба яна з тых песень, што спяваюць на поўны голас? Куляшоў задумаўся, засмуткаваў. Рэдка ў каго бачыла я /і ў пазнейшыя часы/ такія журботныя вочы. Пасля слоў «Надо мной, чтоб вечно зеленея, темный дуб склонялся и шумел». Куляшоў раптам сказаў: «Я, напэўна, буду жыць столькі ж, як Лермантаў. Я нарадзіўся праз сто гадоў пасля яго, у 1914, і памру ў яго ўзросце, у 1941».

Што гэта было? Прадчуванне немінучай бяды? Тут Бярозкін страпянуўся: «Што ты выдумляеш? Кінь, Аркадзе!» — закурыў папяросу і, як віхор, вылецеў з гасцёўні. У свае дваццаць два гады ён тонка адчуваў паэзію, высока цаніў Куляшова. Пазней, у кнізе «Звенні», з'явіцца цікавае даследаванне Р. Бярозкіна «Куляшоў і Твардоўскі», а ў 1978 выйдзе яго кніга «Аркадзь Куляшоў. Нарыс жыцця і творчасці».

Але вернемся да Лермантава. Калі выбег Бярозкін, Аркадзь ціха сказаў: «Паўтары яшчэ раз». Я зайграла мелодыю, уторыла без слоў. Аркадзь неяк асабліва пранікнёна заспяваў:

Что же мне так больно и так трудно?
Жду ль чего? Жалею ли о чем?

У яго быў абсалютны слых і прыгожага тэмбру голас. І праз далячынь гадоў мне помніцца той надвячорак і чуецца голас Куляшова.

...Мінуў год з нечым. 24 чэрвеня 1941, у напаўразбітай цяплушцы, мама і я ехалі з палаючага Мінска. Неба здавалася чорным ад «Месэршмітаў», якія безупынна бамбілі. Жанчыны і дзеці ляжалі на падлозе цяплушкі. Нас асабліва страшэнна абстрэльвалі, калі пад'язджалі да Пухавічаў. Ізноў Пухавічы! Але якія?! Дзеці горка плакалі. Бежанцы!

У той жа самы час па маскоўскай шашы ішлі разам: паэты Аркадзь Куляшоў і Генадзь Шведзік і малады будаўнік Мінска, мой муж Міхаіл Саламонік. Замест ваенкамата яны ўбачылі абгарэлыя сцены і вымушаны былі пайсці з Мінска. Міша ўспамінае пачатак таго цяжкага шляху. Ішлі, маўчалі. Глядзелі на грузавікі з людзьмі, у спадзяванні ўбачыць сваіх родных. Аркадзь быў вельмі ўсхваляваны, бледны. Ні мілай жонкі Ксаны, ні малых Валі і Вовы не было ў грузавых машынах. Міша не знайшоў мяне. Так прайшлі яны разам кіламетраў дзесяць-дванаццаць. Затым, пад шалёнай бамбёжкай, у развілку ля пасёлка Калодзішчы згубілі адзін аднаго...

Пэўна, у тыя трагічныя хвіліны нарадзіліся радкі, якім суджана было пачаць непаўторную паэму «Сцяг брыгады»:

Як ад роднай галінкі
дубовы лісток адарваны,
Родны Мінск я пакінуў,
нямецкай бамбёжкаю гнаны.

Паэму Куляшоў пісаў на фронце ў жніўні-верасні 1942. Ён даражыў думкай Аляксандра Твардоўскага і яму, першаму, прачытаў «Сцяг брыгады». Твардоўскі быў незвычайна ўзрушаны паэмай. Прыгадаем яго словы, сказаныя ўлетку 1944, у толькі што вызваленым Мінску, аб творы, напісаным «яшчэ маладым, але ўжо вядомым і выдатным па таленту... беларускім лірыкам Аркадзем Куляшовым. Сам франтавік, які прайшоў увесь горкі шлях нашага адступлення ад заходніх граніц да прадмесцяў Масквы, бачыў сваімі вачыма страшэнныя няшчасці, што выпалі на долю краёў і гарадоў роднай Беларусі, паэт проста і ашаламляльна расказаў аб гэтым у сваёй паэме». /Твардоўскі А. Зб. тв., том 4. М., 1960, с. 114/.

Паэт усё жыццё адчуваў сябе «На пасадзе цяжкой» — і ў франтавым бліндажы, і на Асамблеі Аб'яднаных Нацый, і за сваім пісьмовым сталом.

Дакладна сказаў пра свайго паплечніка і аднадумца Пімен Панчанка: «Вершы і паэмы Куляшова не старэюць, бо яны таленавіта ўвасобілі ў сабе і канкрэтныя адзнакі нашага часу, і авеяны дыханнем вечнасці... У Аркадзя Куляшова заўсёды было сваё бачанне свету, свой слоўнік, свае яркія метафары. Ён ніколі не быў паэтам правінцыяльным, ставіўся з маладых гадоў да літаратурнай працы сур'ёзна, з вялікай адказнасцю... У яго радках заўсёды гучала трапяткая праўда жыцця». /Уступ да кнігі «Крылы». М., 1985/.

Аркадзь Куляшоў быў чулым і добрым чалавекам. Такія ж рысы характару ў яго жонкі Аксаны Фёдараўны. У чэрвені 1950 года я апынулася ў доме творчасці Каралішчавічы дзякуючы Куляшовым. /Да гэтага я перанесла цяжкі грып/. Сям'я

А.Куляшоў. 1971 г.

Куляшовых займала два пакоі: меншы быў кабінетам Аркадзя Аляксандравіча. Дом творчасці быў на той час перапоўнены. Пакояў — зусім небагата. Куляшовы прапанавалі мне з малым пляменнікам свой другі пакой.

— Не толькі ж нам дыхаць лясным паветрам! — сказала Аксана. А Куляшоў усміхнуўся: — Што мне кабінет? Хіба мала месца ў лесе?

Якраз у той час Куляшоў стварыў шэдэўры лірыкі: «Вянок» — пра вялікае каханне Адама Міцкевіча і цяжкі лёс Паэта і верш «Аб любві». Дарэчы, у канцы таго ж 1950-га А. Куляшоў напісаў дзівосныя па глыбіні пачуццяў і філасофскім разуменні жыцця «Зямля і мора» і «Зямля і неба». Потым яны сапсавалі яму нямала крыві, калі пайшла па загаду «зверху» новая хваля барацьбы з «безыдэйшчынай». Танку не маглі дараваць пераклад цудоўнага верша У. Сасюры «Любі Украіну». Куляшоў ледзь абараніў сваю лірыку ад бурнага націску аднаго пісьменніцкага начальніка...

У чэрвені 1950 у Каралішчавічах працавалі і адпачывалі Я. Маўр, К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Броўка, М. Танк, П. Панчанка, М. Лужанін і Жэня Пфляўмбаўм, Я. Брыль, А. Вялюгін. А. Русецкі, які досыць доўга хадзіў халасты-нежанаты, раптам з'явіўся з золатавалосай прыгажуняй-жонкай. За сталом — віншаванні маладых, жарты.

У той час не было аніякіх дач, «маёнткаў». Жылі вясёлай сям'ёй. На ўвесь лес гучаў раскацісты смех Максіма Танка. Ён, як дзіця, радаваўся кожнай сваёй перамозе, калі, пад дрэвамі, гуляў «у пульку».

гуманістычнай свядомасці. Здзек з маці чыняць у паэме «На Дзяды» яе родныя сыны, крэўныя свайго працавітага брата-аратага. Адзін з іх — «у плуг запрог свайго браточка навек, да сканання», другі аказаўся «дасціпнейшы... у крыўдзе»:

Над старэйшым братам ставіў
Стражы і запоры,
Цела ранамі крывавіў,
Здзекаваўся ў горы.

У гэтай невялікай паэме Янка Купала мусіў дакапацца да сутнасці рэчаў, даць разгадкі нашых крыўд і бед, як скажа ён крыху пазней у «Магіле льва». Зло ў душах сыноў гаротнай маці не прыўнесенае аднекуль звонку, хоць і развітае, гіперэрафіраванае чужароднымі ўплывамі: сярэдні і малодшы сыны ў сваёй маладосці сышлі ў чужы свет — і «ўтапілі ў чужаніцы душы маладыя» /у кнізе «Жыве Беларусь» памылка друку: «утапілі чужаніцы»/. Паводле Купалы, зло і разбурэнне ёсць у зародку ў духоўным вобліку самога народа, і ўмоўна пазначаныя постаці трох сыноў выяўляюць шматмерную духоўную рэальнасць народнага быцця.

Працавітага быў першы
Складу і нагібу.
Так, здаецца, што й памершы
Ўсё араў, касіў бы.

За другім была ахвота
К лежні, к панаванню;
За чужой бы жыў работай,
Спаў бы да змяркання.

Трэці ўсіх бы толькі мучыў —
Склад меў быці катам,
З паганякаю на ўзруччы
К здзекам быў заўзятым.

Ці не гэтая страшная праўда і сталася прычынай зацятага выкрэслівання паэмы «На Дзяды» з Купалавай спадчыны? Жорстка і бязлітасна сказаў паэт пра свой народ, — як далёка бачыў ён наперад, на цэлае стагоддзе пакут і братазабойстваў, адчужэння ад мацярынскай любові. А ў нас, як на заезджанай пласцінцы: памяркоўны і талерантны, талерантны і памяркоўны... Скуль жа тады ахвяры і каты, неадольнасць халуйства і звыродства, і прыкладаў — «несть им числа».

Наколькі трывожыла паэта немагчымасць прымірэння з існуючым станам рэчаў, сведчаць і вершы, народжаныя адначасна з паэмай «На Дзяды». За два дні перад тым быў напісаны верш «Пад крыжам».

Бяссільна народ свой пытаю,
Абняўшы пахілены крыж:
За што ты ад краю да краю
Магілай жывою ляжыш?

Духоўныя сілы народа бачацца Купалу ў такім знемажэнні, што ён назваў свой край магілай. Аксюмаран «жывая магіла» дадае ў гэты вобраз магутны экспрэсіўны штрых.

Амярцвелае, прыніжанае рабскаю пакораю і звыраднелае асяроддзе не здольнае ўспрыняць сцвярджальна-творчы парыў Прарока і ў адказ на яго імкненне да волі здаволена кідае: «Па колькі нам дасі чырвонцаў, калі мы пойдзем за табой?» Гэта ўжо з вядомага верша «Прарок», напісанага ўслед за паэмай «На Дзяды».

Такія ідэі, вобразы, трагічныя адчуванні трывожылі Купалу ўвосень 1912 года — тою парою, калі чалавек шукаў спакою і мудрай засяроджанасці на чыстых памкненнях душы, чакаючы сустрэчы з душамі «дзядоў».

У паэме зусім абыдзены матывы старажытнага народнага абраду ўшанавання продкаў, якія асэнсоўваюцца ў папярэдняй паэме «На Куццю» /1911/. Але гэтая тэма, па ўсім відаць, не адпускала паэта, пабуджала да новага асэнсавання. Сама назва «На Дзяды» скіроўвала да сімволікі старажытнага абраду, заснаванага яшчэ на паганскіх уяўленнях пра душы памерлых членаў роду, на кульце продкаў. Паэма Я. Купалы і ўяўляе сабой амаль суцэльны маналог адной такой душы — душы жанчыны-маці, у асобе якой прыходзіць на Дзяды да сваіх нашчадкаў сама Маці-Беларусь. Але паколькі ў тэксце паэмы адсутнічае нават згадка пра названае свята, а гісторыка-міфалагічны фон вельмі невыразны, то гераіня паэмы ўспрымаецца хутчэй як сімвал сучаснай паэту Беларусі, тым болей што драматычныя калізіі твора выклікалі шмат сацыяльна-гістарычных асацыяцый. Гэты асацыятыўны ланцужок нарошчваецца аж да нашых дзён, і ўжо наша Маці-Беларусь разгублена і роспачна прамаўляе аб сваім прыніжэнні ўласнымі дзецьмі.

Сімволіка вобразаў, рамантычная палярызацыя дабра і зла надаюць драматычнай калізіі твора нейкі глабальна-касмічны характар. Але філасофская парабалічнасць зазямляецца ў праблемы нацыянальнага быцця. Купала адкрывае бездань трагізму ў пакутах мацярынскай душы сваёй Беларусі, балюча рэагуе на тэктанічныя зрухі ў народнай свядомасці, што прыводзяць да яе разлому, самазнішчэння. Гісторыя не раз ужо пацвярджала і даказвае цяпер, што наймагутнейшы дэтанатар нацыянальнай катастрофы беларусаў спрацоўвае ў іх саміх, ва ўласцівасцях іх уласнага светаразумення і жыццядзеяння, скалечаных ад самага нараджэння чалавека — залежнасцю ад ненармальных абставін выхавання, патульнасцю іншароднай, нават варожай першаіснаму менталітэту сіле /тое ж адрачэнне ад роднай мовы і інш./.

Засяроджаны на самым горкім роздуме пра долю Бацькаўшчыны, Купала свядома пазбягае спроб канкрэтызаваць сімволіку вобразаў трох братоў — сыноў адной маці. Улічваючы фальклорна-стылёвую зададзенасць твора, можна было б чакаць наступнага сэнсавага вырашэння ў адпаведнасці з казачнай традыцыяй: з маці застаецца яе малодшы, добры і працавіты сын, а здзекі яна церпіць ад злых старэйшых. Але тады вобраз старэйшага брата непазбежна выклікаў бы асацыяцыі, устойліва замацаваныя імперскай ідэалогіяй за вобразам суседняга народа. Тым самым пафас паэмы скіроўваўся б у іншае рэчышча /такая менавіта праблематыка вершаў «Над Нёманам», «Забраны край» і інш./. Купала не пакідае намёкаў на традыцыйную сэнсавую «расшыфроўку» мастацкіх умоўнасцей, усю сваю ўвагу скіроўваючы на самую цяжкую для яго сітуацыю. Хто ты такі, мой народзе?..

Люба ТАРАСЮК

Куляшоў, Танк, Панчанка. Якая таленавітая, гарачая, дружная тройка! Спрачаліся аб паэзіі. Згадвалі розныя вясёлыя гісторыі. А, часам, зрываліся з месца і разам імчаліся ў горад на футбол.

У пяцідзесятыя гады Саюз пісьменнікаў Беларусі разгарнуў «кіпучую дзейнасць». Неардынарныя вечары, семінары, сустрэчы з людзьмі па ўсёй рэспубліцы. Увосень 1951 года я мела гонар увайсці ў брыгаду Куляшова. Меліся паехаць на яго радзіму, на Магілёўшчыну. Стаяла залатая пара. Мне пазваніў Аркадзь Аляксандравіч: «Паслязаўтра едзем. Твой удзел — пажаданы». Я ўзрадавалася: «Паедзем!»

Але, як на тое, нечакана захварэлі мае дамашнія. Я не магла іх пакінуць без догляду. Як шкада было няўбачаных прастораў і непачутых песень Магілёўшчыны!

...Цяпер той успамін пра маё падарожжа, якое не адбылося, выклікае цяжкія думкі. Паэт многае прадчуваў у паэмах «Хлопцы апошняй вайны» і «Цунамі». Што б ён сказаў пасля чарнобыльскай катастрофы, якая выбухнула і над яго мілай Бесяддзю?! Яго параненае сэрца разарвалася задоўга да гэтага страшэннага ўдару... Аркадзь Куляшоў пакутліва перажываў усё, што адбывалася ў нашу трагедыйную эпоху. «Маналог»-рэквіем па бязвінна загінуўшых сябрах яго маладосці, паэтах З. Астапенку і Ю. Таўбіну, раскрывае ўсю яго душу:

Дзе б я ні быў, дзе б мне не давялося
Убачыць дол сівы ад палыну,
Пякуча сэрца сціснецца, і лёс я,
Загінуўшых без весткі, памяну.

Добрая ніць звязала сям'ю Куляшовых з Балгарыяй. Дачка Валянціна выйшла замуж за маладога балгарскага паэта і перакладчыка Хрыста.

З імі я ўбачылася ў Сафіі ў красавіку 1960. Мы, турысты з Беларусі і Сібіры, былі зачараваны Балгарыяй — яе сардэчнымі людзьмі і шматколернай, казачнай прыродай. Вельмі прыемна было сустрэцца ў нашым гатэлі з маладымі, закаханымі Валяй і Хрыста. Я прывезла ім ліст і маленькую пасылку ад Куляшовых. Нядаўні падлетак з пышнымі, белымі бантамі ў цёмных валасах, Валя заставалася такой жа імклівай. У Хрыста былі яркія, адухоўленыя вочы, інтэлігентны твар. Прыгожая пара! Як узрадавалі яны мяне і Марыну Барсток! /Мы з ёй разам прыехалі ў Балгарыю/. Назаўтра, пасля цудоўнага спектакля «Аіда», пастаўленага ў Сафійскай Народнай оперы, мы наведалі сціплую кватэру Валі і Хрыста. Там быў і трэці жыхар — сынок Вука. Ён моцна спаў у ложку, расчырванелы, светлы. «Вука спіць» — так названы мой верш пра хлопчыка, які слухаў дзве люлянкі — адну ад беларускай мамы і другую, прынесеную татам з балканскіх гор.

У Мінск мы з Марынай прывезлі Куляшовым паклон ад дзяцей. Аркадзь быў вельмі ажыўлены, распытваў аб жыццібыцці сваіх блізкіх. Я ўгаворвала Аркадзя паехаць туды ў госці. Ён сказаў, што абавязкова паедзе наступным летам. Але, але... Пачало падводзіць сэрца. Паехаць не давялося.

Потым я здала ў часопіс «Полымя» вершы пра Балгарыю, якая жыла ў маёй душы. Анатоль Вялюгін, шчыры, удумлівы рэдактар паэзіі, параіў мне прысвяціць верш пра Вуку А. Ф. Куляшовай. І цяпер, слухаючы арыгінальны фальклорны ансамбль «Ліцвіны» і яго прыгожага, рослага кіраўніка Уладзіміра Берберава, я не веру сваім вачам. Няўжо гэта той самы маленькі Вука, унук Аркадзя Куляшова?..

Куляшоў ні на хвіліну не даваў сабе спакою. Калі не пісаліся ўласныя вершы, — паэт перакладаў. Але як! З якім майстэрствам, з якой пранікнёнасцю!

...У літаратуры, як і ў медыцыне, амаль кожны лічыць сябе надта дасведчаным. Часам некаторыя іранічна запытваюць: «Ці трэба перакладаць з адной славянскай мовы на другую? Які тут сэнс?» На вялікі жаль, такія «жартаўнікі» ніколі не думалі пра ўзбагачэнне культуры, і сумняваюся, ці чыталі яны ў арыгінале творы Міцкевіча, Шаўчэнкі, Вазава і нават усяго Дастаеўскага... Жыццё абвяргае недарэчныя кпіны.

Калі ў 1972 годзе ў Пяцігорску на свяце лермантаўскай паэзіі я прачытала куляшоўскі пераклад «Ветразя», — людзі ў зале ўсталі. Усе былі заварожаныя тым, як натуральна, па-беларуску, гучаў «Ветразь» — сімвал паэзіі Лермантава. Мне вельмі прыемна было перадаць для Дома-музея Лермантава падарунак ад народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова — аднатомнік выбранай паэзіі Лермантава.

Д.Кугульцінаў, А.Куляшоў, П.Панчанка. 1973 г.

Мне і твораў чужых пераклады
Саграваюць работай душу.

Гэта была тытанічная работа сэрца і думкі. Пераклады рамана «Яўгеній Анегін» Пушкіна, выбраная паэзія Лермантава, «Энеіда» Катлярэўскага, «Спеў аб Гаяваце» Лангфэла. Называю толькі асноўнае.

Першы варыянт перакладу «Яўгенія Анегіна» загінуў у Мінску ў час бамбёжкі... «У новым перакладзе, — пісаў Куляшоў — я смялей ішоў на ажыццяўленне пастаўленай перад сабой задачы — творчага, а не парадковага прачытання і пераўвасаблення пушкінскіх строф... Даводзілася пераадольваць яшчэ адну, спецыфічную цяжкасць: заманлівую блізкасць рускай і беларускай моў. Блізкасць гэта ў асобных выпадках, амаль дакладна перадаючы сэнс, часта пераходзіла ў сваю супрацьлегласць, гэта значыць рабіла такі даслоўны пераклад непаэтычным».

Многія госці вельмі хацелі мець беларускі пераклад лермантаўскай паэзіі. А там жа былі людзі самых розных нацыянальнасцей! Думаю: ці не пара перавыдаць унікальную кнігу? Але сёння гэтае пажаданне можа застацца «гласом вопиющего в пустыне».

Беларуская школа перакладу можа ганарыцца тым, што сярод найлепшых яе творцаў — Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа — назаўсёды застанецца імя Аркадзя Куляшова.

У наш час мы часта асабліва пасля чарнобыльскай трагедыі, гаворым аб экалогіі, аб варварскіх адносінах да прыроды. Куляшоў трапяткой любоўю любіў беларускія лугі, лясы, рэкі. У вершы «Я ў лузе кветкі не сарваў ніводнай...» ёсць такія радкі:

Хай цешаць вока кветкі на палянцы,
Каб мы з табой гулялі сярод іх, —
Яны змарнеюць
у гранёнай шклянцы,
Як мы без сонца сярод сцен нямых.

Пэўна, сваё асабістае ён адчуваў і ў паэме Някрасава «Саша». Перакладзены мною ўрывак з паэмы «Саша» я прачытала на вечары ў Купалаўскім тэатры ў снежні 1971 г. Куляшоў вёў някрасаўскі вечар. «Плакала Саша, як лес высякалі...» Помню, колькі слёз я праліла ў дзяцінстве, чытаючы ўпершыню паэму! Пасля вечара адзін наш пісьменнік хваліў і хваліў мяне за добрае, мастацкае чытанне. Аркадзь Куляшоў строга перапыніў яго: «Галоўнае, што пераклад вельмі добры».

Даволі доўгі час паэзія Аркадзя Куляшова заставалася неадкрытай планетай для нашых кампазітараў. Думаю, што яны проста не чыталі яго кніг, не адчувалі мелодыі, рытмікі, арыгінальнай аркестроўкі яго верша. Не бачылі яго Крылаў... Першы кампазітар, які адкрыў для беларускай музыкі Куляшова, — Анатоль Багатыроў. «Я сустрэўся з табой маладою, як быў маладым» — светла, паэтычна гучыць гэты раманс, які з'яўляецца адным з лепшых твораў камернай вакальнай музыкі. Натхнёны паэзіяй Куляшова, Багатыроў стварыў і такія рамансы: «Ростань» /на верш, напісаны падлеткам-паэтам у 1928 г./, «Маладосць», «Кожны мае свой бор». Нядаўна мы гутарылі з Анатолем Васільевічам. «Куляшоў — вялікі паэт, — сказаў Багатыроў, — з вострым болем я пісаў творы на яго ваенныя вершы «Ліст з палону», «Балада аб чатырох заложніках», «Над брацкай магілай». Думкі аб тым, што гэтыя творы можна толькі чытаць, аказаліся недарэчнымі! Я рад, мая араторыя «Бітва за Беларусь» была вельмі цёпла прынята на маім творчым вечары ў філармоніі. Паэтычнай асновай твора з'явіліся вершы Куляшова, Бураўкіна, Гілевіча».

Беларускія кампазітары адчулі сілу самабытнай паэзіі Аркадзя Куляшова. Г. Вагнер стварыў цікавую тэлевізійную оперу «Ранак» паводле паэмы «Песня аб слаўным паходзе» /лібрэта Я. Шабана/; І. Жыновіч у сааўтарстве з П. Падкавырывым напісалі музыку да радыёспектакляў «Прыроды цымбал» і «Толькі ўперад». Ці кожны, зачараваны рамантычнай песняй І. Лучанка «Алеся», ведае, што напісана яна на верш 14-гадовага Куляшова? А песні таго ж Лучанка «З далёкага» /«Адкукавала, адышло»/, «Спакойнага шчасця не зычу нікому», балада «Маці»?!

Куляшоўская паэзія акрыліла і маладога кампазітара І. Паліводу. Нядаўна ён напісаў цыкл лірычных песень «Я — матчын спеў» для вакалістаў і аркестра М. Фінберга.

Ёсць у паэта свой аблог цалінны,
Некрануты прастор для баразён,
Дзе ён працуе з першае хвіліны
І да апошніх вечаровых дзён...

Быў апошні вечаровы дзень. Але ёсць і будзе нязгасны ранак Паэзіі Аркадзя Куляшова.

Эдзі АГНЯЦВЕТ

«І СВЕЧКІ Ў СВЯТЛА СВЯТЫЯ...»

Яшчэ адзін фільм стварылі вядомы кінарэжысёр-дакументаліст Марыя Андруковіч і народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Як і ў папярэдніх іх стужках, у «Існасці» гаворка ідзе аб вечных маральных каштоўнасцях. Не тых, што становяцца моднымі з кожным чарговым павевам часу, а якія выяўляюць чалавечую сутнасць, людскую існасць. Адбываецца чарговае падарожжа ў беларускую вёску. Многімі забытую, па-свойму зняважаную абыякавасцю, але якая па-ранейшаму моцна трымаецца каранямі роднай глебы. Найперш дзякуючы людзям, якія жывуць у ёй. Пра асобных з іх і адбываецца гаворка ў фільме. Пра Рэгіну Вінцэнтаўну Выжыкоўскую з вёскі Лабуцееўцы на Браслаўшчыне, якая любіць народныя казкі. Пра старых братоў Шопікаў з вёскі Поразава Свіслацкага раёна — не адзін дзесятак гадоў робяць яны з гліны цудоўныя збанкі, гарлачыкі. Пра майстра куфраў са знакамітага Агова Іванаўскага раёна Фёдара Жыдко...

Што ні лёс, то песні варты. Але адначасова і трывога гучыць: а хто ж прадоўжыць традыцыі гэтых народных умельцаў, хто далей будзе рухаць іх справу? Пусцеюць жа вёскі, старэюць вёскі! «І свечкі ў святла святыя служкі. І крыжы як цені продкаў...» Вершы Р. Барадуліна — працяг гэтага патрэбнага ўсім нам, такога светлага і адначасова пакутнага роздуму. Пра час і чалавека на зямлі. Пра родную Беларусь, якая адраджаецца і якая...

Усё ж верыцца: адродзіцца!

«ЗРОК» — АДРАДЖЭННЮ

У шостым нумары часопіса «Зрок» /дарэчы, сёлета ён будзе выходзіць штомесячна/ апублікаваны ўрывак з аповесці Л. Класкоўскай і А. Класкоўскага «Станіслаў Шушкевіч», працяг публіцыстычных разваг М. Ермаловіча «Аб усім, што баліць» /пад рубрыкай «Гісторыю не перапішаш»/, вершы С. Панізніка, Г. Шутэнкі і іншых аўтараў. На старонцы для дзяцей «Ліхтарык» — творы Л. Геніюш. «Капэла весялосці» — проза У. Клімовіча. Пад рубрыкай «З духоўнай спадчыны» — легенды, запісаныя А. Ненадаўцам.

ШОСТЫ НУМАР «СПАДЧЫНЫ»

за мінулы год адкрываецца раздзелам «Гісторыя і культура». У ім артыкулы «Старажытнаеўрапейцы» В. Сядова, «Гербы Берасця» Г. Церабунь, «Лінія Керзана на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зменаў ва Усходняй Еўропе» М. Волаціча. Сярод іншых матэрыялаў — «Соф'я Гальшанская — апошняя жонка Ягайлы, маці Ягелонаў» Э. Рудскага, «Беларуска-рускія перасяленні ў XIV—XVIII стст.» В. Грыцкевіча, «Аб паходжанні вялікіх князёў літоўскіх» Л. Галяка. Змешчаны і публікацыі, вядомыя па папярэдніх нумарах: «Кс. Вінцэсь Гадлеўскі» В. Панцэвіча, «Князі на абшарах Вялікага княства Літоўскага ад канца XIV ст.» Ю. Вольфа, «Невядомая вайна» Г. Сагановіча. У раздзеле «Літаратурныя помнікі» — «Апісанне земляў» /з Дублінскага рукапісу XIII ст. /каментарыі і пасляслоўе В. Чамярыцкага, пераклад з лацінскай А. Жлуткі/. Алесь Карлюкевіч рэцэнзуе кнігу І. Быхаўца «Лынтупы і наваколле».

НАМ НЕ ЖЫЦЬ БЕЗ ФРАНЦЫІ?

Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь зацікавілася, кнігі якіх французскіх аўтараў падабаюцца чытачам Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. З мэтай вывучэння попыту была распаўсюджана спецыяльная анкета. Найперш сярод школьнікаў, якія цяпер, як вядома, поруч з іншымі замежнымі мовамі вывучаюць і французскую. І вось вынікі апытання — так сказаць, практычныя. Аташэ па лінгвістыцы французскага пасольства пані Марцін Лефеўр падарыла шэраг кніг гэтай бібліятэцы.

ПРАЗ СМУГУ СТАГОДДЗЯЎ

Муж і жонка Варэцы — мастакі, якія ў творчасці сваёй пільна прыглядаюцца да сівой даўніны, імкнучыся даць ёй уласнае асэнсаванне. Прынамсі, на выстаўцы іх твораў, што арганізавала Нацыянальная бібліятэка Беларусі, можна ўбачыць постаці знакамітых беларускіх дзеячаў, прадстаўнікоў нацыянальнай культуры. Гэта — Ефрасіння Полацкая і Францішак Скарына, Леў Сапега і Канстанцін Астрожскі, Жыгімонт Аўгуст і Міхал Клеафас Агінскі...

Акрамя таго выстаўлены акварэлі, што па-свойму асэнсоўваюць вядомыя фальклорныя сюжэты.

Паэзія

Рыгор БАРАДУЛІН

ВЫДЫХАЮЧЫ ПАРЫЖ

маладзічок вершаў

•

Без лістоў, у ягадах рабіна,
Як начны Парыж гарыць
У снезе.
Цыгана няма,
А ёсць драбіна,
Каб палезці ў неба,
Аб начлезе
Думаючы.
Там і ў дождж шалёны
Можна ўкрыцца
Зорнай бараною.
Тут шаломы
З яравой саломы
Мог бы прызімак
Прымераць Ною.
Далягляду хістка ад патопу,
Што заліў Каляды з берагамі.
Хоча —
Аж тапырыцца рагамі —
Бык завеі
Выкрасці Еўропу...

ПАМІНАННЕ МІХАСЯ СТРАЛЬЦОВА

Калісьці любілі мяне мерцвякі —
Услед паўтараю за Апалінэрам.
Іх цені яшчэ не зніцелі, які-
я сніліся птушкамі досвітку шэрым-
і, межы сумежыўшы ўсе, да ракі
Ва ўрочышчы ценаў прыпалі з даверам.

На мёртвай рацэ, дзе чаўнарыць Харон,
Нікому хвалі яшчэ не ўсміхалі-
ся, зоркі не спелі пулятымі гронкамі,
дзе пажалі сярпамі жалю
Вачніцы сон незямны, як загон,
Звязаўшы снапы, пазямнелі амаль і-
мі.

Мглісты Міхась як з сузор'я Стральца
Глядзеў на мяне з-пад нябёс Нотр-Дама.
І я як жывому яму абяца-
ў адведаць забытыя сны нашы да ма-
разоў, і паднесці напіцца з карца,
З якога паіла крыніца як мама...

ДРАЎЛЯНЫ ГАЛУБОК

Ляцеў, ляцеў
І ў бок
Упаў на дол нясвежы
Драўляны галубок
Ля Эйфелевай вежы.

І чорная рука
Крылу імпанавала,
Слабога галубка
Купіць прапанавала.

Не ўзяў і не купіў
Нягеглае стварэнне.
Парыж і піў, і кпіў,
І статуі старэлі.

І галубок наноў
І трапятаўся й падаў.

Хто наскіпаў са сноў
Лучыны для прыгадаў?

Загадка пра клубок
— Крыж на крыжы,
Калі знаеш, не кажы.
— Клубок!
— Скулле табе ў бок!
Кальнула напамінам.
...Клубіўся галубок...
Не даўся ў рукі кпінам...

І расстаўляў лубок
Няхітрыя мярэжы,
Каб падаў галубок
Ля Эйфелевай вежы...

УШАЦКІ СОН

Я загадваў няраз, цот ці ліш
Засталося мне ў долі ў прыполе.
І прысніўся ў Вушачы Парыж.
Заблудзіўся я ў ім,
Як у полі.

І, як гэта заведзена ў сне,
Я спазніўся,
Таму ж і не ўбачыў
Нечага.
І хацелася мне
Перанесці, як хату, Вушачу ў
Пасуседдзі Парыжу,

Каб вяз,
Бацькаў вяз на палях Елісейскіх
Зелянеўся на яблычны Спас,
Як зямляк
На азёрах усвейскіх.

Каб у гіз,
Разганяючы кроў,
Паспытаўшы з гароду грыжанкі,
На паўдзён заганялі кароў
У шкляныя хлявы парыжанкі.

І прачхнуўся.
Прыхмарваўся дзень,
Як прытомлены думнік Радэна.
І лавіла свой цень-круцень
Над страхою ў суседа антэна.

ПАРЫЖАМ ПОЎНАЯ ГАЛАВА

Анёл вясёлы лыжы
Настроіў на Парыж.
І я жыву ў Парыжы,
Бо смутак мой,
Як віж

За радасцю цікуе,
Што там маёй была,
І похапкам цюкуе
Парыжскага святла

Бязважкасцю цяжкія,
Як воблакі, цюкі.
І рэжуць смутку шыю
Дакору асцюкі.

З Булонскага, былога,
У лес ушацкі свой
Яму ляжыць дарога
З лірычнаю жарствой.

Хай смутак пакарпее!
А я наўспыш,
Як пыж,
Са стрэльбы нецярпення
Лячу —
Абы ў Парыж!

ЗАПОМНІЛАСЯ

Карласу ШЭРМАНУ

Гляджу на афішы
І забірае ахвота
Забраць дадому,
Каб прымацаваць на фіранцы
Гэтае
На фоне нацыянальнага сцяга
Каляровае фота
Лепшае попкі Францыі
1991 года...

ВЫХОДЗІЦЬ...

Туга, як пад венікам мыш,
Чакае тае хвіліны,
Каб зноўку
Сасніўся Парыж
Лятучы,
Як рой чмяліны.

Каб вуліцу перайшла
Як рэчанька парыжанка,
Пакуль набірае цяпла
У хаце свая ляжанка.

Хай пал прабяжыць наўздрыж,
Нібы той цягнік з адхону...

Выходзіць з мяне Парыж,
Як градусы з самагону.

У першыню

Валерыя Кустава... Хто яна? Дзяўчынка, 9 кастрычніка якой мінулага года споўнілася дзевяць. Ёй падабаецца гэтая лічба — д з е в я ц ь. Падабаецца ласкальная форма свайго імя — Валерушка. Яна вучыцца ў трэцім класе 136 школы г. Мінска. Чымсьці яна падобная на іншых дзяцей, чымсьці — незвычайная. Раз-пораз яна прамаўляе, а мама або бабуля занатоўваюць, пісьмова афармляюць в у с н ы я /вымаўленыя вуснамі/ вершы. Такая завядзёнка захавалася з самых ранніх гадоў, калі Валерушка, акрыяўшы пасля цяжкай хваробы, яшчэ не ведаючы нават азбукі, загаварыла вершамі.

Загадка, вядома, як дзевяцігадовая дзяўчынка можа быць такою дарослаю ў сваіх пачуццях і думках, хто ці што — Зямля, Неба, Прырода — дыктуюць ёй гэтыя думкі і пачуцці? І чаму такая ноша кладзецца на дзіцячую душу?

Васіль ЖУКОВІЧ

Валерыя КУСТАВА

•

Бабулі Валі прысвячаю

Божа!
Зрабі нас вольнымі,
як птушак,
каб адчуць
вецер цёплы
і мора халоднае,
каб зразумець,
як жыццё
над краем прадоння
вісіць.

Божа!
Зрабі нас шчаслівымі,
як малых дзяцей,
каб не ведалі жаху,
мучэнняў
і злосці.

Божа!
Зрабі нас бязгрэшнымі,
як ты сам.

ЗЯМЛЯ

Я люблю цябе,
Зямля мая ад Бога,
за тое, што тут нарадзілася
і жыву,
дзе горы і мора,
дзе дрэвы...
і птушкі пяюць,
плаваюць рыбкі ў вадзе.
Тут сее поле земляроб
і ловіць рыбу рыбалоў.
Усё добра, але не вельмі,
бо страляе паляўнічы
у птушку, у птушанятка,
якое плача, бо гіне душа.
І чую я стрэлы,
крык чалавека
і радасць яго...
Чаму?
Я ж знаю, што гэта —
забойства і смерць,
а калі смерць,
дык там і грэх,
вялікі грэх...
Ой, чалавек!
Ты — грэшны!
Ты — грэшны!
Ты — грэшны!
Перад Небам і Зямлёй!
Перад дрэвам і травой!
Перад зверам і вадой!
Ты — грэшны!
А каб замест чорнага каршуна —
у тваю душу, у сэрца —
белага жарабя...
Шкадуй усё:
Неба і Зямлю,
дрэва і траву,
звера і ваду.
Тым больш Чалавека —
ты ж сам чалавек,
ты ж брат яго родны.
Чалавек, шкадуй...

МУЖЧЫНАМ

Мужчыны,
гэта вам гавару я, дзіця:
жанчына не можа абараніць сябе.
Хай ваша душа і сэрца
падкажуць вам,
як трэба любіць
жанчыну і дзіцятка
і асабліва — сваё дзіцятка
і асабліва — родную жанчыну.
Не трэба караць маленькага,
калі ён правініўся ў чым-небудзь.
Не крычыце на яго:
«Што натварыў ты?!»
Растлумачце яму,
што і як зрабіць трэба.
Бацька — вы,
бацька, вы не крычыце на маму.
Вам пасля будзе сорам,
што вы крычалі
на роднага чалавека.
Я малю, я прашу вас,
не трэба ніколі крычаць
на жанчыну, на маці,
таму што маміны слёзы
надта горкія,
калі яна плача.
. . . . . .
Калі вы, мужчыны,
прачытаеце мае словы,
перадайце іх іншым
і самі
не крыўдзіце ніколі
дзяўчыну,
жанчыну,
жонку,
матулю,
дачку.

Проза

Лідзія АРАБЕЙ

НА БЕРАЗЕ ЛА-МАНША

АПАВЯДАННЕ

Як апынулася Вера на гэтай выставе? Можа, папракнула сябе, што зусім абабілася, што не памятае — калі была ў тэатры, а некалі ж, не зважаючы на цяжкасці жыцця, бегала на ўсе спектаклі — у драматычны, у оперны, хадзіла з сяброўкамі на канцэрты і, вядома ж, не прапускала ніводнай цікавай выставы. А цяпер? Што гэта, старасць? Яно, канечне, за шэсцьдзесят... Але яна ніяк не хоча прызнаць сябе старою, і калі аднойчы ў тралейбусе маладая маці з дзіцяткам назвала яе бабулькаю, яе ўсю ажно перасмыкнула. А маладая маці сказала прыязна:

— Падсунься, дачушка, няхай бабулька сядзе...

Бабулька, бабулька... Канечне, некалі Вера са сваіх маладых гадоў на такіх, як яна цяпер, глядзела падобна той маладой маме. Ды яшчэ і не на такіх... Ёй было семнаццаць... І пачаў да яе сватацца чалавек — гадоў пад трыццаць... Дык яна прыйшла ў такое абурэнне, была абражаная да слёз... Як ён мог, такі стары...

Уздоўж вялікай залы, дзе па сценах віселі карціны, хадзіла не шмат людзей. Найбольш маладыя, хлопцы, дзяўчаты, то там, то там спыняючыся па двое, а то і па адным. Ступалі ціха, гаварылі між сабою амаль шэптам, як у касцёле ці царкве.

Пры сцяне, на нізкім услончыку, сядзела служыцелька — з завіўкаю на сівых валасах, з белым каўнерыкам блузкі на цёмным пінжачку. Яна сачыла тут за парадкам, але ніхто яго не парушаў, і ёй, мусібыць, сумна было сядзець вось так цэлымі днямі. А можа, і радавалася спакойнай рабоце, мела недзе прыварак да пенсіі.

Вера хадзіла па гэтай выставе, спыняючыся перад карцінамі ў сціплых рамах, перад аднымі — коратка, перад іншымі даўжэй і адчувала, як свет мастака пранікае ў яе душу, адводзіць ад будзённага, прымушае нешта адчуваць. Што — яна і сама не магла разабраць, ды і не думала пра гэта, як не думаем мы, слухаючы добрую музыку, што яна гаворыць. Музыка проста кранае душу, нацягвае ў ёй нейкія струны, і яны гатовы ўжо адазвацца і на добрае, і на благое сваім чуйным гукам.

На карцінах яна бачыла чалавечыя твары... Твары выступалі з туману, з воблакаў, са струменяў дажджу... Яна бачыла чалавечыя постаці, поўныя пакут і болю... Яны былі дэфармаваныя, гэтыя постаці мужчын, жанчын — доўгія рукі, сагнутыя спіны, і дэфармавала, змучыла іх, мусібыць, пакута.

На іншых карцінах былі пейзажы, і амаль за кожным лесам, узгоркам, полем пабліскваў купалок царквы, прыносячы ў той лес, на ўзгорак, на поле прывабнасць і святасць.

Яна змалку выхоўвалася ў бязвер'і, але, сама не ведае чаму, царква, касцёл выклікалі ў яе замілаванне. Калі заходзіла ў царкву альбо ў касцёл — не для малітвы, а з цікавасці, душу агортвала хваляванне. Чаму так? Хіба гены продкаў, якія шчыра верылі, маліліся, не загінулі ў ёй, давалі сябе адчуць? І цяпер, на гэтых пейзажах, белыя цэркаўкі з залатымі макаўкамі купалоў таксама кранаді душу.

Яна прамінула яшчэ адну карціну, ужо крыху стомленая, не спыніўшыся каля яе, але калі ўжо адышла, нешта быццам зачапіла яе, і яна вярнулася. Аббегла вачыма карціну, адчуваючы ў ёй нешта знаёмае, спынілася на дзяўчыне, што была намалявана ў цэнтры, і раптам адчула, як гарачыня аблівае ўсё яе цела. Зрабілася нават крыху млосна, расплыліся фарбы, нібыта быў страчаны фокус... Яна сабрала сілы, прымусіла вочы зноў уважліва зірнуць...

У цэнтры карціны стаяла дзяўчына... У фартуху з мешкавіны паверх паласатай сукенкі. За яе спіною відаць быў змрочны куб трохпавярховага будынка на фундаменце з буйных камянёў, з маленькімі закратаванымі вокнамі... За будынкам, зусім блізка падступаючы да яго, бліскала палоска вады... А спераду, у вялікім двары, абгароджаным каменнаю сцяною, вакол дзяўчыны, горбіліся чалавечыя постаці ў паласатай вопратцы. Твараў іх нельга было разгледзець, яны наогул нагадвалі нейкіх паласатых жукоў, што поўзалі па зямлі, калупаючыся ў ёй, нешта шукаючы.

Тая, што ў цэнтры, глядзела перад сабою вялікімі шэрымі вачмі, поўнымі тугі. У яе былі каротка падстрыжаныя валасы, тонкая шыя і гэты фартух з мешкавіны. Карціна выступала нібы з туману, але ўсё было відаць на ёй выразна — і куб цаглянага будынка, і вада, на якую падаў прамень сонца, і людзі-жукі, і дзяўчына. І Вера пазнала ўсё — казарму ў Шэрбуры, пабудаваную яшчэ Напалеонам, ваду праліва Ла-Манш і сябе... Так, дзяўчына, што стаяла ў цэнтры карціны, была яна... З валасамі, што пачыналі адрастаць — пастрыглі падчас цяжкай хваробы, якою перамучылася ў лагеры, у тым знакамітым фартуху з мешкавіны на паласатай сукенцы, у драўляных сабо, як іх тут называлі, на нагах.

Яна ступіла ад карціны, апусцілася на нізкі мяккі услончык, што былі расстаўлены па зале, сядзела, глядзела на карціну і ўспамінала. Успамінала тое, што ўсё жыццё імкнулася забыць і забыць не магла...

Другі год як яна паланянка... Немцы вывезлі яе з Мінскай турмы ў канцэнтрацыйны лагер, у Францыю... Шэрбур... Чарапічныя дахі старадаўніх будынкаў, што грудзіліся ўбаку ад лагера, ашчаціненыя гарматамі палубы караблёў, што прыплывалі ў порт з заваяванага немцамі свету і часта губляліся ў туманах, якія наплывалі з праліва Ла-Манш, тугі пясок набярэжнай, каменная сцяна, што адгароджвала іх ад усяго гэтага, вышка, на якой сядзеў немец з аўтаматам, казарма, дзе яны зімою калелі ад холаду, хоць у пакоях былі каміны, але для палонных іх не палілі.

Яны, жанчыны, працавалі грузчыцамі, і калі іх вывозілі на работу, адносна вольныя французы і францужанкі прыходзілі глядзець на іх. Часам прыносілі кавалак свайго хлеба — доўгага белага батона. Давалі той, якая нечым спадабалася, альбо якую болей шкадавалі. Разы два кавалак таго хлеба перапаў і ёй.

А побач, у водах Ла-Манша, насыпаныя яшчэ Напалеонам, астравы са старадаўнімі крэпасцямі, якія павінны былі абараняць Шэрбур ад англічан. На гэтыя астравы, у тыя крэпасці, з часоў Напалеона пустыя, немцы вывезлі нашых палонных, савецкіх. Тысяч шэсць. Не кармілі іх, і тыя харчаваліся слімакамі, марскімі водарасцямі. Хутка з тых тысяч засталося чалавек трыста. Тых, трыста, ужо ў сорак чацвёртым, прывезлі ў Шэрбур. Пасялілі таксама ў казарме, але ў іншай, за каменнаю сцяною. І пачалі ганяць на работы. Разам з жанчынамі...

Тыя, што засталіся, выжылі, відаць, былі самыя дужыя. І тут, у Шэрбуры, нават на зусім мізэрным пайку, крыху акрылялі.

Як яны пазнаёміліся? Здаецца, падчас работы ў яе вырвалася беларускае слова. І ён падышоў да яе, радасны, спытаўся:

— Зямлячка?..

Яна не магла сказаць пра яго, што ён вельмі худы, ён быў такі, як усе тут, і таксама, як і ва ўсіх, на ім быў фартух з мешкавіны паверх паласатай робы. Але што вылучала яго з іншых, дык гэта вочы. Яны былі вялікія, сінія і глядзелі, быцта з глыбіні душы, і відаць было, што душа гэта яшчэ жывая.

У яго быў высокі лоб, таксама кароткія, светлыя валасы, што адрасталі пасля стрыжкі, тонкія вусны, якія цяпер усміхаліся ёй. Ён быў малады і, нягледзячы на хваравіты выгляд, здзеклівае адзенне, усё роўна прыгожы. Можа, хараства яму надаваў той выраз твару — не пакутлівы і змрочны, як тут ува ўсіх, а нейкі светлы, прамяністы. Ён шчыра радаваўся:

— Зямлячка!..

— А вы адкуль? — спыталася яна.

— З Беларусі... А з якога вы горада?

— Я? З Мінска...

— А я з Віцебска...

Гэтага было даволі, каб ім зблізіцца... А потым ён пачаў яе апякаць. Ён дапамагаў ёй валачы цэглу, хапаўся за насілкі з цэментам, якія яна насіла з Вандаю — дзяўчынаю з Польшчы, дапамагаў цягаць бярвенні.

Немцы тым годам палонных ужо без дай прычыны не катавалі, не ганялі мужчын ад жанчын, толькі чулася іх адрывістае:

— Шнэлер, шнэлер!..

Яны будавалі каля порта вал і дзоты, палонныя былі іх рабочаю сілаю, і немцы глядзелі, каб рабочая сіла працавала.

Покліч жыцця... Змучаныя голадам, цяжкаю працаю мужчыны і жанчыны шукалі сустрэч. І намячаліся парачкі. І вечарамі, замест адпачынку, мужчыны і жанчыны, пралазячы праз замаскаваныя ад немцаў дзіркі ў сцяне, спатыкаліся, то пад штабялямі дошак, то ў высокай траве, якою зарасталі пустыры. Немцы хоць і забаранялі такія сустрэчы, аднак вельмі не ганялі, часам рабілі выгляд, што не заўважаюць такіх парушэнняў: дысцыпліна ў лагеры залежала ад высокага начальства, а высокае начальства той год ужо больш клапацілася пра ўласны лёс. Не баяліся немцы і таго, што палонны можа ўцячы з лагера. Куды тут уцячэш, калі з трох бакоў вада — Шэрбур стаіць на паўвостраве, — калі вакол чужая зямля, чужая мова? Праўда, даходзілі чуткі, што ёсць у Францыі партызаны — макі, — ёсць Супраціўленне, але дзе ты знойдзеш тых партызан, тое Супраціўленне?

Яго звалі Сяргей, Сярожа. Яны таксама спатыкаліся, то каля тых штабялёў, то ў высокіх цыбунах незнаёмай Веры травы. На Шэрбур часта наплывалі густыя туманы, і яны, хаваючыся ў тых туманах, часам беглі да берага праліва, дзе ў іх было ўжо сваё месца — у глыбокай ямцы, выкапанай невядома кім альбо чым — можа, хвалямі ў час прыліву альбо шторму, а можа, людзьмі, якія бралі з берага пясок.

Ён прыносіў ёй хлеб. Яна не хацела браць, адмаўлялася, але ён казаў, што гэта знаёмы француз яму прыносіць, што ён ужо еў. Яна верыла і не верыла, але ела. Ён расказваў ёй пра сябе — што ён мастак, вучыўся ў Віцебску ў мастацкім вучылішчы, з Віцебска пайшоў у армію, разам з усімі студэнтамі... І вось, палон... У Віцебску засталася маці... Але хутка, хутка ўжо разаб'юць немцаў, Сталін пераможа... І ён маляваў дубчыкам на тугім сырым пяску партрэт Сталіна. І яна верыла, што Сярожа мастак, бо Сталін быў вельмі падобны. А потым яны далонямі сціралі той партрэт, каб не ўбачылі немцы, бо чаго-чаго, а гэтага яны не даравалі б.

Іх адносіны былі шчырыя і нявінныя. Яны нават не цалаваліся, толькі часам падоўгу сядзелі, прыпаўшы шчака да шчакі, адчуваючы, як пачынаюць гарэць іхнія твары.

Аднойчы, калі яны зноў разам цягалі насілкі, ён сказаў ёй:— Я запомню цябе такой на ўсё жыццё... І калі буду жывы — намалюю цябе. Такою, як ты цяпер... У гэтым фартуху з мешкавіны...

Стрымаў сваё слова, намаляваў...

Яна сядзела на тым услончыку, не маючы сілы скрануцца з месца, быццам успаміны прыгнялі яе і яна не магла зрушыцца, падняць той цяжар...

Надышло вызваленне, і іх разлучылі. Яе і шмат іншых паланянак адразу пусцілі дадому. Мужчын затрымалі для праверак. На развітанне ён горача абяцаў, што знойдзе яе, знойдзе, дзе б яна ні была... Калі будзе жывы... Але цяпер надзеі на жыццё прыбавілася, вайна выдыхалася, набліжалася перамога.

Яна чакала яго... І год, і два, і тры... Ён не абзываўся. Потым дазналася ад адной знаёмай, што жыла ў Віцебску і ведала Сярожаву маці, што Сярожа зноў у лагеры... Ужо савецкім. Сталін, партрэт якога Сярожа маляваў на тутім сырым пяску, палічыў яго здраднікам... І адправіў адбываць пакаранне.

Яна яшчэ чакала яго... А потым сустрэла Васіля... Нарадзіла сына... Цяпер ужо мае ўнучку. Былое зацягвалася туманам часу, праз які, бывала, прарывалася, часцей за ўсё у сне — казарма, іх прытулак на беразе праліва, Сярожаў твар, які быў непадобны на таго Сярожу, але яна ведала, што гэта ён.

Сяргей Каляда... Можа, гэта яго прозвішча, напісанае вялікімі літарамі на шчыце, што стаяў пры Палацы мастацтваў, падсвядома прывяло яе на выставу? Чаму ж яна, так даўно не ходзячы сюды, раптам завітала? Якая сіла прывяла? Каб сустрэцца з маладосцю, з ім?

Мусіць, яна доўга сядзела на ўслончыку, бо да яе падышла служыцелька, спытала прыязна:

— Можа, вам кепска? Я бачу, вы так даўно седзіце...

Яна нібы ачнулася, глянула на кабету. Зблізку твар выдаваў яе немаладыя гады — увесь бляклы, як выцвілы.

— Не, дзякуй, усё нармальна,— паспяшалася адказаць Вера.

Служыцелька сабралася адысці, але яна затрымала кабету.

— Скажыце, калі ласка, а гэты мастак... Дзе ён жыве? Ці можна з ім пабачыцца?

Служыцелька памаўчала, потым далікатна пачала:

— Разумееце... Гэта выстава пасмяротная... Мастак памёр... Гадоў пяць таму... Гэта сябры наладзілі... Ён жыў у Віцебску...

— Дзякуй, дзякуй... Вы не турбуйцеся, са мною ўсё нармальна, я скора пайду, — адказала яна.

— Ды сядзіце, вы нікому не перашкаджаеце, я так, падумала... — нібы апраўдвалася жанчына.

Служыцелька пайшла, а Вера ўсё сядзела, ужо гледзячы, здаецца, не на карціну, а ў самую сябе.

Неяк падумалася, што жыццё яе ўвесь час працякала нібы між пальцаў, ні на хвіліну не спыняючыся, і нібы ў вечным чаканні невядома чаго. Усё здавалася, што самае важнае наперадзе, за нейкім паваротам. Яна заўсёды чамусьці прыспешвала час, нібы падганяючы яго да сустрэчы з тым, самым важным. Так плыло, пакуль была маладзейшая, пакуль працавала. І нават калі пайшла на пенсію, зноў кацілася жыццё, як тое кола — хоць і чапляючыся за карчы, трасучыся на выбоінах, але далей, далей і — зноў — у чаканні. І раптам, цяпер, гэтае кола нібы спынілася. Яна здаецца, толькі цяпер зразумела — тое, што нібы працякала між пальцаў, і было жыццё, што болей няма чаго чакаць, ні за якім паваротам, што наперадзе толькі старасць з яе хваробамі, а далей — тое, што чакае ўсіх — і шчаслівых і няшчасных, і багатых і бедных, і геніяў і звычайных людзей.

Чаго яна чакала, што прыспешвала? Можа, надзею на сустрэчу з Сярожам? Хоць дзе, хоць калі. Аказваецца, быў не так і далёка... І не знайшоў. Чаму? А можа, знайшоў? Пасля сталінскага лагера, ды яна была ўжо за Васілём?

Не, лёс не да канца быў да яе жорсткі. Васіль не кепскі муж, хоць падчас бывалі і крыўды. У яе ёсць сын, унучка — Леначка. Што яшчэ жанчыне трэба?

Але чаму ж тады так нядобра ўсярэдзіне, чаму так ные ў грудзях і немагчыма падняцца з гэтага ўслончыка? Як ты жыў, Сярожа? Хто прыняў твой апошні ўздых? І чаму так рана?

Яна глядзела на сваю маладосць на той карціне, і на Сярожаву маладосць... Як ні дзіўна, але і там, тады перажываліся шчаслівыя імгненні. Божа, як чакалі яны ўсе канца вайны! І, здаецца, яна не перажыла ў жыцці большай радасці, чым вызваленне. Каб можна было вярнуцца ў той міг? Не, божа барані! Яна часам чуе ад людзей, што каб даравалі ім пражыць сваё жыццё яшчэ раз, то яны з радасцю згадзіліся б. Яна не хацела б... Зусім не хацела б пражыць яшчэ адно такое жыццё. Нямецкі лагер... А потым тут, дома... Яе не прынялі ў інстытут — пабывала ж пад немцам, нахапалася чужога духу. Ды, можа, ты сама туды паехала, па сваёй волі? Ага, сама пайшла ў канцлагер... Не мела дакументаў, што арыштавалі і вывезлі яе ў канцлагер за сувязь з партызанамі, немцы такіх дакументаў не выдавалі, а на слова хто паверыць? А потым колькі шукала работы, бо — таксама не бралі. Дзіва, такая пляма ў біяграфіі. Задавалася адно пытанне, у якім было шмат падазрэння: а як гэта вы засталіся жывая? Гэта ўжо цяпер адумаліся, нават ільготы далі...

Яна зноў бачыла перад сабою чарапічныя дахі старадаўняга французскага горада, ашчаціненыя гарматамі палубы караблёў у порце, казармы, пабудаваныя яшчэ Напалеонам; глядзела на сябе ў тым фартуху з мешкавіны паверх паласатай сукенкі і, здаецца, чула гартанны нямецкі крык:

— Шнэлер, шнэлер!..

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ «АЛЬБЫ»

Але, таго самага славутага парку, што знаходзіцца на паўночнай ускраіне Нясвіжа, а быў закладзены яшчэ ў другой палове шаснаццатага стагоддзя. Па сённяшні дзень у ім зберагліся дрэвы, узрост асобных з якіх налічвае 500 гадоў. І ўсё ж у цэлым парк прыйшоў у запусценне. Цяпер яго мяркуецца адрадзіць. Праўда, беражліва паставіўшыся да самога гістарычнага помніка.

Комплекс турызму і адпачынку размесціцца поруч са знакамітай «Альбай» і зойме ўчастак плошчай 60 гектараў, а сама забудова — 0,7 гектара. Аўтары праекта архітэктары А. Калантай, В. Мусіенка, Ю. Мамлін пры ўдзеле А. Барадаўкі звярнулі ўвагу на тое, каб стварыць эручнасці для адпачынку і адначасова па меры магчымасці захаваць гістарычную частку парку. А тое, што яны падышлі да даручанай справы /заказчык Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўны мастацкі музей/ па-сапраўднаму творча, сведчыць прысуджэнне праекту першай прэміі на аглядзе лепшых архітэктурных работ 1993 года Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, поспех да гэтага калектыву праекціроўшчыкаў прыйшоў і на аглядзе краін садружнасці ў Ташкенце — другое месца.

ЦЕСНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

11—12 студзеня 1994 г. у Варшаве адбылося другое пасяджэнне Беларуска-Польскай сумеснай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць пры паўнамоцных асобах урадаў Беларусі і Польшчы па справах гісторыка-культурнай спадчыны. У адкрыцці пасяджэння прынялі ўдзел Дзяржаўны сакратар канцылярыі Прэзідэнта Польшчы сп. Анджэй Закрэўскі і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Польшчы сп. Уладзімір Сянько.

На пасяджэнні старшынявай доктар Анджэй Цеханавецкі.

У працы камісіі галоўная ўвага была нададзена пытанням канкрэтнага ўзаемадзеяння ў справе рэгенерацыі комплексу гісторыка-культурных каштоўнасцей Нясвіжа. Апрача таго, закраналіся канкрэтныя праблемы інвентарызацыі беларутэнікаў і палонікаў, забеспячэння іх даступнасці для навуковых даследаванняў, а таксама арганізацыі выстаў.

Наступнае пасяджэнне камісіі запланавана правесці ў Беларусі ў верасні 1994 г.

«МОЙ МУЖ — ГІПАПАТАМ»

На прэм'еру напярэдадні Новага года запрасіў гледачоў Гомельскі абласны драматычны тэатр. Ён паказаў спектакль паводле п'есы беларускага драматурга Анатоля Дзялендзіка «Мой муж — гіпапатам». Паставіў спектакль рэжысёр Уладзімір Каратке́віч. З яго работамі гледачы ўжо добра знаёмы. Летась ён паставіў на сцэне тэатра дзесяць спектакляў, праявіўшы дзівосную актыўнасць. Частка з іх была паказана сёлетнім летам у Мінску і высока ацэнена крытыкамі і камісіяй Міністэрства культуры. А нядаўна калектыў вярнуўся з V Міжнароднага тэатральнага фестывалю, што прайшоў у Бранску, дзе з поспехам былі паказаны «Сцэны з сямейнага жыцця» І. Бергмана.

На здымку: сцэна са спектакля «Мой муж — гіпапатам».

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛІНФАРМ

ПАГАВАРЫЛІ... БЕЗ ТВОРЦАЎ

Як вядома, абгаварэння творчых набыткаў, прадстаўленых у справаздачных канцэртах XI з'езда кампазітараў Беларусі, на з'ездаўскай дыскусіі не адбылося. Але праз месяц, калі ўсталяваліся ўражанні, музыказнаўцы такое абгаварэнне наладзілі. Без удзелу кампазітараў. «Круглы стол» па выніках з'езда ў Саюзе кампазітараў адбыўся 28 студзеня, меркаваннямі падзяліліся музыказнаўцы Р. Аладава, Н. Бунцэвіч, В. Савіцкая, Т. Шчарбакова і інш.

БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ. БЕЗ АПАЗІЦЫІ. АЛЕ — З НАДЗЕЯЙ

З XI З'ЕЗДА КАМПАЗІТАРАЎ БЕЛАРУСІ

НЕНАВУКОВЫ прагноз — маўляў, гэта іх апошні з'езд — праверыць можна будзе толькі праз 4 гады. Каштоўнасць створанай музыкі правяраецца праз дзесяткі гадоў... Дык мо пагаворым без прагнозаў і без «зазірання ў вочы» Яго Вялікасці Часу — пагаворым, гледзячы ў вочы звычайнаму й няпростаму сённяшняму дню?

А сённяшні дзень — гэта як ніколі насычаныя з'ездаўскія канцэртныя праграмы, у якіх, па розных прычынах, былі перастаноўкі, замены й нават прыкрыя адмены /не прагучаў шэраг цікавых і чаканых твораў/.

Сённяшні дзень — гэта зусім відавочныя сімптомы разладу ў супольным кампазітарскім жыцці. З'ездаўскае пасяджэнне пачалося пазней прызначанай гадзіны, бо для кворуму не хапала дзесятка паўтара членаў саюза, прыходу якіх з надзеяй чакала найбольш дыспыплінаваная частка творчай грамады. Ну, а пры фарміраванні спісу кандыдатур у новае праўленне высветлілася, што некаторыя сталыя й паважаныя «праўленцы» па тры гады не ходзяць на саюзаўскія сходы, ігнаруюць музычныя прэм'еры і фестывалі, творчыя дыскусіі, дый з'езд, выбары кіруючых органаў, а ўрэшце — сам саюз. /Праўда, аб членства ў ім чамусьці не дамаўляюцца/.

Сённяшні дзень — гэта і ўсхваляванае выступленне З. Мажэйкі, якое засведчыла, што праблем у беларускіх этнамузыколагаў з гадамі не паменела. Гэта й нараканні Р. Суруса на няўвагу Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі Беларусі да творчасці беларускіх кампазітараў. Гэта і публічная заява В. Капыцькі пра свае выходзіны з цяперашняга саюза і ягоная прапанова ладзіць кампазітарскія стасункі на аснове іншай, заходняй мадэлі творчага супольніцтва. Гэта і прэтэнзіі прэзідэнта Беларускай асацыяцыі сучаснай музыкі А. Соніна да кіраўніцтва СК, якое, тым не менш, паспрыяла ўзнікненню і сталенню АСМа менавіта «пад крылом» саюза. Гэта і палымяная ды канструктыўная прамова В. Войціка, які сярод іншага звярнуў увагу І. Лучанка на неабходнасць стварэння здаровай апазіцыі кіраўніцтву, каб спажывецка-ўтрымальніцкія тэндэнцыі не заміналі творчаму духу ў жыцці саюза...

Наяўнасць пазіцыі спараджае апазіцыю, якая можа прапанаваць альтэрнатыву... Палітычная лексіка ўторгваецца ў жыццё творчага саюза, ды яшчэ прывід пічэміцца — той, які ўжо блукае па краіне, — прывід рынку. Але ёсць надзея, што музыка захавае сваю размаітасць і самакаштоўнасць, якую сілкуюць не апазіцыйныя ідэі або непрадказальныя альтэрнатывы, а жывіць вечны й невытлумачальны плюралізм талентаў.

Ёсць надзея, што захавае яна і слухача. Бо з'ездаўскія канцэрты праходзілі не ў пустых залах. Людзі прыходзілі. Дзівіліся смелай фантазіі Г. Гарэлавай у Канцэрце для трубы. Як падзею трактавалі Сімфонію N 1 С. Бельцюкова. Віншавалі А. Багатырова з класічнай Санатай для кантрабаса і фартэпіяна. Апладзіравалі А. Залётневу, які, натхнёны поспехам сваіх колішніх прэм'ер — Канцэрта для ўдарных і Трох калэнцый для аргана, — прадоўжыў плённы пошук у новым творы — Канцэрце для аргана і ўдарных інструментаў. Віталі ўжо вядомую 8-ю сімфонію Д. Смольскага і дэбют на справаздачным форуме У. Каральчука з «Сумным канцэртам» для флейты і аркестра...

Са светлымі астраўкамі ў нашым штодзённым напружаным палітычным і эканамічным жыцці параўнаў з'ездаўскія канцэрты старшыня праўлення Саюза кампазітараў І. Лучанок. Разгорнуты даклад, з якім выступіў ён у заключны дзень з'езда, цалкам адпавядаў жанру справаздачы, насычанай шматлікімі прозвішчамі, фактамі. Зыходзячы з магчымасцяў газеты, мы падрыхтавалі пераказ даклада: гэта дасць чытачу хоць і не поўнае, але пэўнае ўяўленне пра стан беларускай прафесійнай музыкі ды дзейнасць СК у апошнія гады.

ЗВЫЧАЙНА агляд творчасці па жанрах, заўважыў І. Лучанок, мы пачынаем з музычнага тэатра. Пасля пастаноўкі оперы «Дзікае паляванне караля Стаха», адзначанай Дзяржаўнай прэміяй Беларусі, У. Солтан напісаў яшчэ дзве новыя оперы. Будзем спадзявацца на іх шчаслівы сцэнічны лёс. На атрыманне Дзяржаўнай прэміі 1993 г. ДАВТам вылучана опера А. Бандарэнкі «Князь Наваградскі», прэм'ера якой сталася яскравай з'явай мінулага сезона. З поспехам ідзе опера Я. Глебава «Майстар і Маргарыта». Чакаецца прэм'ера балета А. Мдзівані «Рагнеда». Спадзяёмся, што і надалей у опернага і балетнага тэатраў будзе плённае супрацоўніцтва з беларускімі кампазітарамі, а клопаты пра замежныя гастролі будуць суіснаваць з клопатамі пра нацыянальны рэпертуар.

15-ты сезон ідзе ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі «Несцерка» Р. Суруса, што можа ўжо лічыцца своеасаблівым дасягненнем. Поспехам у гледачоў карыстаецца таксама мюзікл «Джулія» У. Кандрусевіча. Між іншым, у Брэсцкім драматычным тэатры пастаўлена опера-вадэвіль В. Кандрасюка «Падман за падманам» паводле А. Грыбаедава, а ў Гомельскім — ягоны ж мюзікл «Гіпапатам» /на вершы беларускіх паэтаў/.

Нарэшце, дзіцячы музычны тэатр-студыя «Казка», які ўзначальвае Г. Аляксандраў, парадаваў першай беларускай пастаноўкай — паэтычнай операй В. Войціка «Вясновая песня». Дзіцячыя оперы Э. Казачкова з вялікім задавальненнем спяваюць і граюць самі дзеці — вучні СШ N 1 г. Мінска; «Пра тое, што было» /таксама ў дзіцячым выкананні/ запісана на БТ.

У тэатры драматычным апошнім часам было створана цэлае суквецце спектакляў з цікавай музыкай С. Бельцюкова, У. Кур'яна, У. Кандрусевіча, А. Залётнева, А. Елісеенкава, В. Капыцькі, В. Кандрасюка.

ЗАТЫМ дакладчык спыніўся на здабытках беларускіх кампазітараў у жанры сімфоніі.

Глыбіню і адначасова дэмакратычнасць пры падыходзе да трагічнай тэмы можна бачыць у 8-й сімфоніі Д. Смольскага з вершамі І. Бродскага, першае ж выкананне якой моцна ўзрушыла слухачоў. Нетрадыцыйнасць формы, жанравых асацыяцый, пошукі новай прыгажосці вызначаюць камерную сімфонію В. Войціка «Апошняя восень паэта» /для сапрана, барытона і камернага ансамбля/ на вершы П. Верлена ў перакладзе М. Багдановіча. Высокі прафесіяналізм і творчая вынаходлівасць уласцівыя 2-й сімфоніі У. Дамарацкага. Сучаснасць сродкаў з'яўляецца візітнай карткай сімфоніі С. Бельцюкова «Гравюры» для хору і аркестра, натхнёнай ілюстрацыямі Скарынавых кніг. Своеасаблівасць нацыянальнага характару, выкарыстанне прыёмаў кінамузыкі рэтуальнасць тэмы ў 4-й сімфоніі К. Цесакова «Курапаты».

Нагадаўшы таксама нядаўна створаную 6-ю сімфонію Я. Глебава і 4-ю сімфонію А. Елісеенкава для габоя і камернага аркестра, І. Лучанок зазначыў, што ўжо сам пералік, да таго ж далёка не поўны, дазваляе ўявіць напрамкі ды маштабы развіцця беларускай сімфоніі — жанру вельмі ёмістага, шматаблічнага і, трэба падкрэсліць, на сённяшні дзень вядучага ў нашай музыцы.

Сярод здабыткаў у іншых сімфанічных формах дакладчык назваў «Цэзій-137» В. Кузняцова, эскізы Я. Паплаўскага «Поразава», «Супрэматызм» Н. Голубевай, паэму «Чытаючы Васіля Быкава» Г. Вагнера, «Уяўленне і плач аб пакінутай вёсцы» У. Дарохіна. Жанр канцэрта ўзбагацілі творы Г. Вагнера, У. Дамарацкага, Г. Гарэлавай, У. Кур'яна, С. Бельцюкова, У. Каральчука, А. Залётнева. Нягледзячы на цяжкасці з выкананнем, у перыяд паміж з'ездамі развіваліся і вакальна-сімфанічныя жанры, у першую чаргу кантата. У якасці ўзорных можна назваць «Куранты» В. Капыцькі, «Тысяча гадоў надзеі» ды «У год сусветнага пажару» /твор адзначаны Дзяржаўнай прэміяй/ Г. Гарэлавай.

РАЗВІЦЦЁ камернай музыкі ў апошнія гады ў значнай меры арыентавалася на ансамбль сапраўды сусветнага ўзроўню — «Класік-Авангард». Дзякуючы яго кіраўніку У. Байдаву ажылі многія складаныя творы беларускіх аўтараў, прычым загучалі на высокім мастацкім узроўні. Другім арыенцірам для нашай камернай музыкі было папаўненне рэпертуару сольных выканаўцаў ды рэпертуару музычных вучылішчаў і школ. У гэтай галіне працавалі практычна ўсе кампазітары, вылучыць можна імёны Г. Вагнера, Г. Гарэлавай, Р. Суруса, Э. Казачкова, В. Карэтнікава, К. Цесакова, Л. Мурашкі.

УСЕ ПАМЯТАЮЦЬ, як раней крытыкаваліся харавыя калектывы за нядбайныя адносіны да творчасці беларускіх кампазітараў. Прыемна адзначыць змены ў лепшы бок. У канцэртах з'езда ўдзельнічалі тры хоры: зусім малады Мінскі абласны /Маладзечна/ пад кіраўніцтвам А. Шута, Дзяржаўны камерны пад кіраўніцтвам І. Мацюхова і знакаміты калектыў прафесара В. Роўды. Першы з'ездаўскі канцэрт, які прапанаваў слухачам хор з Маладзечна, выклікаў, без перабольшвання, буру авацый. Гучалі творы Ю. Семянякі, І. Кузняцова, Л. Мурашкі, М. Літвіна, У. Карызны, Э. Казачкова, А. Туранкова, М. Равенскага, У. Солтана... Хор пад кіраўніцтвам І. Мацюхова выканаў не з меншым поспехам творы А. Бандарэнкі, С. Бельцюкова, А. Навахроста, У. Карызны, В. Кузняцова, Э. Наско. Калектыў пад кіраўніцтвам В. Роўды удзельнічаў у выкананні сімфоніі N 1 «Гравюры» С. Бельцюкова.

Нейкі зрух у «харавым цэху» адбываецца.

На жаль, у гэты працэс не ўключаецца Акадэмічная харавая капэла імя Р.Шырмы, якая мае магчымасць больш інтэнсіўна працаваць над буйнымі творамі, і хацелася б, каб побач з класікай у рэпертуары шырмаўцаў пастаянна былі беларускія араторыі і кантаты, буйныя хоры.

ШТО ДАТЫЧЫЦЦА нашай песеннай культуры, эстраднага жанру наогул... Прафесіяналы разумеюць, што ён **вельмі складаны**. Яркую мелодыю-прамень, шчыры, мудры, ад сэрца радок стварыць можна не кожны дзень.

Чатыры гады таму кампазітары былі ў роспачы перад так званым «рынкам» у галіне эстраднай музыкі. Але беларуская песня змагла выстаяць і ўмацавацца. Пра тое, што яна мае перавагу перад суседзямі, Расіяй ды Украінай, гаворыць тое, што ў двух фестывалях «Славянский базар», дзе праводзіліся нацыянальныя дні рэспублік, наша Беларусь гучала двойчы і канцэрты былі прызнаныя лепшымі з мастацкага пункту гледжання.

Значнай падзеяй стаўся фестываль беларускай песні «Маладзечна-93», які сабраў на гала-канцэрце 40 тыс. гледачоў і трансліраваўся па спадарожнікавым ТБ на Захад. У Расіі, ЗША, Германіі, Польшчы, Італіі, Францыі выконваліся песні Я. Глебава, У. Будніка, А. Елісеенкава, Э. Зарыцкага, Л. Захлеўнага, В. Іванова, У. Мулявіна, В. Раінчыка, Э. Ханка, А. Чыркуна, Д. Яўтуховіча...

І. Лучанок падзякаваў выканаўцам — Дзяржаўнаму канцэртнаму аркестру, студыі «Сябры», ансамблям «Верасы», «Песняры», калектывам абласных філармоній. А таксама адзначыў працу музыканта Канцэртнага аркестра І. Паліводы — ягоныя поп-оперы «Максім» з вершамі М. Багдановіча і «Беларушчына» на вершы Купалы.

Засяродзіўшыся на праблемах, прамоўца зазначыў, што некаторыя т. зв. гала-канцэрты, фестывалі выяўляюць не толькі нізкі, але й антымастацкі ўзровень так званай эстрады. Як правіла, у арганізацыі такіх «шоу» ўдзельнічаюць і самі кампазітары, і рэдактары, музычныя рэжысёры, работнікі Міністэрства культуры. Ім і карты ў руки: больш жорсткі, нягледзячы ні на што, адбор. І яшчэ, як падкрэсліў І. Лучанок, «у парадку самакрытыкі»: у апошні час стварыць песню ўсенародна любімую не ўдалося. Яркі прыклад — нацыянальнага гімна пакуль так і няма.

Дрэнна развіваецца наша інструментальная эстрада, а ёсць жа выдатны калектыў — Дзяржаўны канцэртны аркестр.

ВЯЛІКУЮ ЎВАГУ надае праўленне СК праблемам прапаганды беларускай музыкі, дзеля чаго неаднойчы сустракалася з кіраўніцтвам Беларускай філармоніі ды Міністэрства культуры, прадстаўнікамі музычных рэдакцый БТ і радыё. Ёсць пэўныя зрухі. /Цыклы тэлеперадач, прысвечаныя музыцы нашых кампазітараў, запісы новых твораў беларускіх аўтараў аркестрам Белтэлерадыёкампаніі, штодзённыя радыёперадачы, у тым ліку «Музычны канал»/.

Але ёсць і праблемы, якія неаднаразова СК ставіў перад кіраўніцтвам філармоніі ды Міністэрства культуры. Зразумела, што азначае нацыянальная музычная культура ў духоўным жыцці нацыі, кожнага грамадзяніна незалежнай суверэннай дзяржавы. Просьба ж у кампазітараў адна: каб такія калектывы, як аркестр філармоніі, капэла імя Р. Шырмы ды інш., павярнуліся тварам да беларускай музыкі і зрабіліся па сутнасці сваёй дзейнасці нацыянальнымі калектывамі. А для гэтага трэба толькі, па-першае, выконваць на працягу ўсяго сезона, а не толькі, як кажуць, «з нагоды», нацыянальную класіку: творы Я. Цікоцкага, М. Аладава, В. Залатарова, А. Багатырова, П. Падкавырава і г. д. Падругое, выконваць сучасную музыку беларускіх кампазітараў: можна прапанаваць для шырокай прапаганды сто партытур, за якія не сорамна будзе нікому. Па-трэцяе, ставіцца да гэтых партытур па-мастацку ўважліва, каб усё, што задумаў кампазітар, пачуў слухач. /Дакладчык мусіў казаць пра не заўсёды здавальняючы ўзровень выканання філарманічным аркестрам твораў беларускіх кампазітараў, адчувальную абыякавасць да іх/. І, па-чацвёртае, — каб падчас гастроляў філарманічных калектываў за межамі Беларусі гучала і нацыянальная музыка.

Калі ў бліжэйшы час нас не пачуюць у філармоніі і міністэрстве і не зменяць карэнна свайго стаўлення да нацыянальнай музыкі, мы будзем, запэўніў І. Лучанок, афіцыйна прасіць урад рэспублікі пераарыентаваць грашовыя датацыі, якія даюцца філармоніі, на прапаганду найперш беларускай музыкі. Іншага выйсця няма, бо каб не давялося на увесь час спачатку зніштажаць, а потым адраджаць.

І яшчэ. Хацелася б прынцыповых змен у дзейнасці Таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, Міністэрства замежных спраў, прадстаўніцтва рэспублікі пры ААН і да т. п. Досыць прадстаўляць у свеце нашу найбагатую культуру прымітыўнымі падробкамі пад нацыянальнае ці толькі самадзейнымі калектывамі, быццам мы жывём не ў цэнтры Еўропы, а невядома дзе. У невялікіх канцэртах маглі б гучаць нашы цудоўныя камерныя творы — рамансы на вершы беларускіх паэтаў, інструментальная музыка, у вялікіх канцэртах — адпаведныя творы.

З трыбуны з'езда прагучала шчырая падзяка адданым сябрам — выканаўцам, якія заўсёды дапамагаюць кампазітарам у творчасці: гэта і аркестры «Нямігі» Акадэмічны імя І. Жыновіча, духавы — Міністэрства абароны, і маладыя калектывы: «Беларуская Капэла», Гродзенская гарадская капэла, сімфанічны аркестр і камерны хор у Маладзечне, народны аркестр «Менск»... І многія, многія салісты.

ЯШЧЭ АДЗІН БОК дзейнасці СК у прапагандзе беларускай музыкі — работа камісіі музыказнаўства. Сярод новых формаў музычна-асветніцкай дзейнасці — выязныя пасяджэнні прадстаўнікоў камісіі ў абласных цэнтрах /ініцыятары — Г. Глушчанка, Б. Смольскі, Т.Дубкова, К.Сцепанцэвіч, Р. Сергіенка/. Музыказнаўцы Р. Аладава, Т. Дубкова, Р. Сергіенка, В. Савіцкая, Г. Глушчанка былі актыўнымі арганізатарамі Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі на тэму «Айчынны авангард у кантэксце сусветнага мастацтва XX ст.» /Мінск, 92 г./. У міжнародных канферэнцыях удзельнічалі таксама Т. Шчарбакова, К. Сцепанцэвіч. Музыказнаўцы супрацоўнічалі з рэдакцыямі газет і часопісаў, рыхтавалі радыё- і тэлеперадачы, удзельнічалі ў выданні навуковай і даведачнай літаратуры, падручнікаў. /Трохтомнік «Музычны тэатр Беларусі», «Беларуская музычная літаратура» і інш./.

Маштабы дзейнасці фальклорнай камісіі СК характарызуюцца навуковымі працамі З. Мажэйкі, Т. Варфаламеевай, Л. Мухарынскай, Т. Якіменкі, выпускам пласцінак з запісамі беларускага музычнага фальклору на фірме «Мелодия», падрыхтаванымі З. Мажэйкай разам з кінематаграфістамі фільмамі «Пранясі, Божа, хмару» /прыз Міжнароднага кінафестывалю ў Пярну/ і «Крывыя вечары». Старшыня камісіі З. Мажэйка стала лаўрэатам III Музычнага конкурсу імя акадэміка Б. Асаф'ева, а на XI Міжнародным з'ездзе славістаў у Брацісла.е яе абралі чальцом Міжнароднага камітэта славістаў.

ПРАПАГАНДА беларускай музыкі праз правядзенне музычных вечароў, творчых сустрэч была б больш актыўнай, калі б былі сродкі. Кампазітары выступаюць без аплаты, а вось выканаўцы — не пагаджаюцца, дый правільна робяць: за працу трэба плаціць. Раней прафсаюзы мелі грошы на культурныя мерапрыемствы, сёння не дапамогуць і прафкомы, бо такіх сродкаў цяпер у іх няма.

Гаварылася ў дакладзе і пра тыя праблемы, што ўжо не адзін год, а то і не адно дзесяцігоддзе, «баляць» і вымагаюць увагі: адсутнасць нотнага выдавецтва, студыі гуказапісу, годнага будынка для саюза, адсутнасць парадку ў абароне аўтарскіх правоў... Тым не менш, за між'здаўскі перыяд у СК прыйшлі 24 маладыя кампазітары і музыказнаўцы: гэта нямала! Усцешна, што хаця й павольна, але ладзяцца новыя кантакты з далёкім замежжам. Прыемна, што ўпершыню за мяжой /у Англіі/ выпушчаны кампакт-дыскі з беларускай музыкай — Я. Глебава, Д. Смольскага, У. Солтана.

ЗАВЯРШАЮЧЫ справаздачны даклад праўлення, І. Лучанок, прынамсі, сказаў так. Творчая незалежнасць, а мы яе маем, — гэта толькі адзін бок нашай рэчаіснасці. Ёсць і іншыя, як, напрыклад, крытычнае стаўленне да таго, што мы пішам, неабходнасць бездакорнага прафесіяналізму. Аднаго жадання ўвайсці ў сусветную культуру недастаткова, ды і жыццё ў ёй вымагае пастаянных творчых намаганняў, бесперапыннай працы — і не толькі творчай, але і арганізацыйнай, якую і павінен узяць на сябе Саюз кампазітараў. Але гэтая праца можа быць толькі галіной дзяржаўнай палітыкі. Бо мы добра ведаем і штодня, уключыўшы тэлевізар, бачым, як уплывае на асобу камерцыйнае мастацтва.

Сапраўдныя каштоўнасці трэба падтрымліваць, для іх трэба пракладаць шлях да слухача, яны ўтвараюць народнае духоўнае ды інтэлектуальнае багацце. Калі мы адмовімся ад гэтага ці спалохаемся перашкод — нам не даруюць нашчадкі. Трэба добра ведаць і памятаць нашу гісторыю.

Хочацца спадзявацца, што пазначаныя задачы будзе мэтанакіравана вырашаць новае праўленне, — так падсумоўваў сказанае І. Лучанок, які праз пару гадзін быў не безальтэрнатыўнай аснове зноў абраны старшынёй Саюза кампазітараў...

Падрыхтавала матэрыял С. БЕРАСЦЕНЬ

Балет

«ПАСЯЛІЦЬ У САБЕ СВАІХ ГЕРОЯЎ...»

Нядаўна вярнуліся з гастрольнай паездкі па Японіі салісты ДАВТа — народная артыстка Беларусі Інэса Душкевіч і Веніямін Захараў, з гутаркі з якім мне давялося даведацца, што артысты ўдзельнічалі ў гала-канцэрце зорак сусветнага балета. Імёны іншых удзельнікаў — М. Плісецкая, Ф. Рузіматаў, Л. Семяняка, І. Мухамедаў, Т. Куматава... Артысты пабывалі ў Токіо, Нагоі, Осака, Канадзаве і іншых гарадах Японіі.



Я пацікавілася ў В. Захарава:

— Якія ж уражанні ад знаёмства з Краінай Узыходзячага Сонца?

— Самы высокі ўзровень, які я калі-небудзь бачыў! Я вельмі шчаслівы, што мы, беларускія артысты, трапілі ў лік удзельнікаў гала-канцэртаў.

Японія... Лепш за Цветава пра яе ўжо ніхто не раскажа. Гэта трэба бачыць, адчуваць...

Трэба бачыць В. Захарава ў балеце А. Хачатурана «Спартак», дзе ў сцэне балявання ён экспрэсіўна і нястрымна расплёсквае свае страсці па крывавым планшэце сцэны. Партыя Краса вымагае не толькі высокага прафесіяналізму, але і значнага кругагляду. Артыст В. Захараў яшчэ вельмі малады, але ў партыі Краса ў цэлым пераканаўчы. Для яго Краса характэрныя пыхлівасць, страснасць, парывістасць і ўсепаглынальнае задавальненне ўладай.

Зусім іншым падаецца артыст у ролі Рамэо ў балеце С. Пракоф'ева «Рамэо і Джульета». Тут ягоны герой поўны юнацкага парывання, інакшая яго пластыка, інакшыя пачуцці.

«Суперзорка», «кароль танца», найвядомы французскі танцоўшчык Патрык Дзюпон перакананы: «Танцоўшчык не можа абмяжоўвацца толькі танцам, каб танцаваць. Неабходна, каб яму было што сказаць. Добры танцоўшчык — той, хто пасяляе ў сабе сваіх герояў і жыве іхнім жыццём».

Да гэтага імкнецца малады саліст Веніямін Захараў.

Першая вядучая партыя /люты 1989 г./ — Зігфрыд у «Лебядзіным возеры» П. Чайкоўскага — паказала, што ў тэатры з'явіўся цікавы, перспектыўны танцоўшчык, чуйны і спрытны партнёр.

Затым — гады напружанай працы і творчых пошукаў. Цяпер В. Захараў танцуе самыя розныя партыі ў балетным рэпертуары тэатра.

У «Карсары» А. Адана вядучыя партыі выконваюць «зоркі» беларускага балета. У гэтае свята класічнага танца, у гэтае буянне фарбаў у касцюмах і дэкарацыях Захараў-Алі прыносіць вострую і таемную атмасферу Усходу. Надзіва выразныя пазіроўкі; В. Захараў імпульсіўны і ўнутрана засяроджаны; рамантычнае аблічча танцоўшчыка, музычнасць, прыгажосць пластычных ліній выклікаюць бурныя авацыі па ходзе спектакля.

У неўвядальным «Дон Кіхоце» кожны саліст, які стварае вобраз Базіля, здае экзамен на права звацца танцоўшчыкам-прэм'ерам. Веніямін Захараў даказвае гэтае права, не маючы нават намёкаў на імпазантную «іспаністую» знешнасць — светлавалосы, блакітнавокі, урываецца ён на сцэну, быццам выклік усім нашым уяўленням пра Базіля.

Падобна Анёлу Смерці з'яўляецца Тарэра-Захараў у фінальнай сцэне «Кармэн-сюіты» Ж. Бізэ — Р. Шчадрына, рассякаючы плашчом, быццам маланкай, натоўп. І Кармэн, і Хазэ не ў сілах супрацьстаяць яму. Ён урываецца ў іх жыццё, быццам злы рок. Малады артыст пераканаўчы ў гэтым вобразе. Ад спектакля да спектакля напаўняе яго новымі фарбамі.

Смерч піруэтаў, высокія жэтэ — танец В. Захарава ў ролі Тарэра проста цудоўны! Фінальныя сцэны балета набываюць уражлівую вастрыню і драматычны напал ад сутыкнення бліскучай абыякавасці і самазадавальнення Тарэра і трагічнай глыбіні перажыванняў Кармэн у выкананні І. Душкевіч. Вось чаму ў хваляванні замірае зала.

Артысту дадзена сілай свайго таленту абуджаць у гледачах пачуццё далучанасці да Творчасці. Напэўна, у гэтым і ёсць сутнасць тэатра. Парыванне пачуццяў выканаўцы падхопліваецца глядзельнай залай і нараджае зваротную рэакцыю, якая натхняе артыста.

Аншлагі на балетных спектаклях сведчаць пра тое, што «нягледзячы на...» нашы маркотныя душы ўсё яшчэ прагнуць узвышанай прыгажосці і вялікай паэзіі.

Ларыса ВІШНЕЎСКАЯ

НА ГАСТРОЛІ Ў ФРАНЦЫЮ

«Гэта ўзрушае!» — сказала Хілары Клінтан, пабачыўшы спектакль «Карміна Бурана», выкальна-харэаграфічнае прадстаўленне на музыку К. Орфа ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка беларускага балета В. Елізар'ева. Менавіта гэты спектакль быў выбраны ў якасці «візітнай карткі» беларускага мастацтва для культурнай праграмы жонкі амерыканскага прэзідэнта падчас візіту Біла Клінтана на Беларусь.

Пасля спектакля Хілары Клінтан уручыла кветкі артыстам /у той вечар салiравалі вакалісты Н. Губская, М. Жылюк, В. Стральчэня, балерыны С. Гарбунова, Т. Шаметавец, танцоўшчыкі У. Даўгіх і А. Фурман/ і пашкадавала, што не мае магчымасці больш грунтоўна пазнаёміцца з трупай. А таксама заўважыла, што вельмі хацела б пабачыць беларускіх артыстаў на гастролях у Амерыцы.

Поўнасцю далучыўшыся да ацэнак госці, хачу звярнуцца да айчынных прыхільнікаў балетнага мастацтва: шаноўныя, спяшайцеся пабачыць балетныя спектаклі, пакуль нашы артысты яшчэ выступаюць на сцэне роднага тэатра. Бо графік замежных гастроляў на гэты сезон вельмі напружаны.

У лютым беларускі балет на дзесяць дзён выпраўляецца ў Польшчу, дзе ў Варшаве, Познані, Лодзі будуць паказаны «Балеро» М. Равеля, «Кармэн-сюіта» Ж. Бізэ — Р. Шчадрына /ды вялікая канцэртная праграма. У сакавіку — Францыя і Швейцарыя. Аматары харэаграфічнага мастацтва ў Жэневе, сусветна вядомых Канах і Ніцы, шэргу іншых гарадоў змогуць убачыць у выкананні нашых артыстаў «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага і пракоф'еўскі балет «Рамэо і Джульета».

А наступны, 1995 год, абяцае трупе шмат хваляванняў, незабыўных уражанняў і запатрабуе максімальнай самааддачы. НА ПРАЦЯГУ МЕСЯЦА ПЛАНУЮЦЦА ГАСТРОЛІ БЕЛАРУСКАГА БАЛЕТА Ў ПАРЫЖЫ, адной з агульнапрызнаных балетных сталіц свету. Для выступлення нашым артыстам будзе прадастаўлены самы вялікі тэатр французскай сталіцы — Пале дэ Кангрэ. Парыжскія балетныя крытыкі і аматары харэаграфічнага мастацтва, вядома, маюць магчымасць параўноўваць і аналізаваць, акрамя таго, што ў Парыжы выступаюць многія вядомыя харэаграфічныя калектывы, балетная трупа Гранд-Апера мае зараз рэпутацыю адной з найбольш моцных і перспектыўных у свеце...

Але вернемся ў сёлетні год... У чэрвені на працягу 10 дзён нашы артысты будуць выступаць у Гвадэлупе, невялікай дзяржаве Вест-Індыі, якая лічыцца французскай калоніяй, а таксама, магчыма, на востраве Ямайка і некаторых астравах Карыбскага мора. Свой адпачынак у ліпені і жніўні трупа правядзе ў Іспаніі. Толькі яна збіраецца там... працаваць. З гэтай нагоды Мінск днямі наведаў іспанскі імпрэсарыо.

Такім чынам, на зямным шары засталіся толькі тры кантыненты, не заваяваныя беларускімі артыстамі балета: Амерыка, Аўстралія, ну і, вядома, Антарктыда...

Т. МУШЫНСКАЯ

ЛіМ
ЧАСАПІС

Віншуем!

Якаву ХЕЛЕМСКАМУ — 80

Імя Якава Хелемскага на Беларусі добра вядома. Найперш як таленавітага перакладчыка нашай паэзіі на рускую мову. Дзякуючы яму ў свой час прыйшлі да ўсесаюзнага чытача такія кнігі, як «А дні ідуць...», «Кляновыя лісты», «Трубі, мой бор!», «Крокі» П. Броўкі, «Грозная пушча», «Новая зямля», «З новых вершаў» А. Куляшова, «Вершы з дарогі», «Усход зарой палае» і іншыя кнігі М. Танка.

Я. Хелемскім пераўвасоблены па-руску творы Е. Лось, К. Кірэнкі, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, А. Вялюгіна, Н. Гілевіча, С. Законнікава і іншых слынных паэтаў.

Беларусі, якую ён даўно ведае і любіць, на якой мае шмат добрых і адданых сяброў, Я. Хелемскі прысвяціў і многія свае вершы. Сярод іх — «Люблю паэтаў беларускіх», «Беларускім паэтам», «Няміга». Так, Якаў Аляксандравіч — яшчэ і паэт, які выдаў некалькі кніг. А да ўсяго ён і празаік. Чытачы ведаюць яго аповесці «Вечны падданы паэзіі», «На цёмнай яліне звонкая жалейка», «Не даязджаючы да Грэнады», а таксама «Аповесць пра паэтаў».

За пераклад на рускую мову твораў У. Дубоўкі, кніг А. Куляшова «Хуткасць», П. Панчанкі «Дзе начуе жаваранак», М. Танка «Нарачанскія сосны» Я. Хелемскаму ў 1980 годзе прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Якуба Коласа. Значна раней, у 1968 годзе, яму было нададзена званне заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

З днём нараджэння, дарагі Якаў Аляксандравіч! Доўгіх год жыцця Вам!

Арсеню ЛІСУ — 60

Арсень Ліс у сваёй асобе ўдала спалучае фалькларыста і літаратуразнаўцу, крытыка і празаіка, краязнаўцу і гісторыка літаратуры. Пра што б ён ні пісаў, робіць гэта самааддана і захоплена, з любасцю да роднай зямлі, багатай народнай спадчыны, з верай у нацыянальнае Адраджэнне. Вера ж гэтая рухала даследчыцкімі памкненнямі Арсеня Сяргеевіча яшчэ тады, калі многія з тых, хто сёння ледзь не ў грудзі грукае, які ён адраджэнец, пісалі ідэалагічна выверанымі артыкулы і кнігі і голасна прамаўлялі аб адданасці адзінай кіруючай...

Ужо на той час А. Ліс працаваў на Адраджэнне, узнімаючы мала даследаваныя, а то і зусім не вывучаныя пласты нацыянальнай культуры. Работа гэтая набыла мэтанакіраваны, выразна акрэслены характар тады, калі А. Ліс скончыў аспірантуру пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі і з 1962 года пачаў працаваць навуковым супрацоўнікам гэтай даследчай установы.

Адна за адной выходзяць яго кнігі «Браніслаў Тарашкевіч» /1966/, «Мікола Шчакаціхін» /1968/, «Пётра Сергіевіч» /1970/. Як бачна, аўтара /выхадца з вёскі Вётхава цяперашняга Смаргонскага раёна/ найперш цікавілі людзі, якія жылі і працавалі ва ўмовах заходнебеларускай рэчаіснасці. А гэты ж перыяд патрабуе свайго асаблівага прачытання, бо тут шмат яшчэ «белых плям».

Дарэчы, працу ў гэтым кірунку А. Ліс не спыняе і цяпер. Так, у 1981 годзе ён выдаў асобнай кнігай нарыс жыцця і творчасці актыўнага ўдзельніка нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, таленавітага мастака Язэпа Горыда «Пякучай маланкі след». Другі самародак — Язэп Драздовіч — стаў героем яго мастацка-дакументальнай аповесці «Вечны вандроўнік», выпушчанай выдавецтвам «Юнацтва». Нарэшце, у «Мастацкай літаратуры» ў 1988 годзе пабачыла свет кніга А. Ліса «Песню — у спадчыну», у якую ўвайшлі артыкулы, эсэ пра такіх выдатных нацыянальных дзеячаў, як Рыгор Шырма, браты Гарэцкія, Міхал Клеафас Агінскі, той жа Браніслаў Тарашкевіч і іншыя.

Талент жа А. Ліса-фалькларыста раскрыўся пры падрыхтоўцы асобных тамоў да серыі «Беларуская народная творчасць», якую выпускае выдавецтва «Навука і тэхніка», а таксама пры напісанні арыгінальных навуковых прац, выдадзеных той жа «Навукай і тэхнікай». Дарэчы, менавіта за падрыхтоўку серыі «БНТ» А. Лісу поруч з іншымі актыўнымі даследчыкамі была прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі.

І сёння юбіляр працуе надзвычай актыўна. Яго артыкулы, эсэ рэгулярна публікуюцца на старонках часопіса «Полымя», газеты «Культура» і іншых выданняў, якія вялікую ўвагу надаюць праблемам нацыянальнага Адраджэння. Сваім аўтарам лічыць А. Ліса і «ЛіМ».

Ад усяго сэрца віншуем Арсеня Сяргеевіча з 60-годдзем! Няхай і надалей спадарожнічае яму жыццёвы і навукова-творчы поспех.

Івану КАПЫЛОВІЧУ — 50

У літаратуру Іван Капыловіч прыйшоў з журналістыкі. Першыя апавяданні надрукаваў у 1973 годзе, калі, нягледзячы на даволі малады яшчэ ўзрост, паспеў ужо шмат пабачыць і нямала перажыць. Менавіта з гэтага перажытага і нарадзіліся яго творы, напоўненыя праўдай жыцця. Як і іншыя аўтары, І. Капыловіч не ўяўляў сваёй творчасці без прывязанасці да так званай малой радзімы, таму вуснамі герояў і гаварыў аб любові да яе. Аднак не толькі гэтым замілаваннем былі прасякнуты першыя яго творы, а і роздумам, пошукам адказаў на пытанні, ці знайшоў ты панацэю ад усіх бед, калі, па сутнасці, здрадзіўшы вёсцы, у якой нарадзіўся, перабраўся ў горад.

Праўда, ад паказу жыцця да яго належнага раскрыцця І. Капыловіч ішоў паступова. Вось чаму першая кніга пісьменніка «Сонца садзіцца ў травы» /1978/ пры ўсіх сваіх вартасцях у нейкай ступені яшчэ аўтарская заяўка на ўласны погляд на з'явы, на права гаварыць менавіта так, а не інакш.

Зборнік «Два дні ў лютым» /1981/ — далейшая проба голасу і досыць удалая. Найперш — дзякуючы аповесці, у якой прывабным атрымаўся вобраз галоўнай гераіні, вясковай жанчыны Надзеі Голік. Траіх дзяцей выхавала яна адна, усе больш-менш сталі на ногі. Чаму ж Надзея не знаходзіць душэўнага спакою і раўнавагі? Нялёгкія пытанні... На іх і шукае адказу пісьменнік, заглыбляючыся ў характар, спрабуючы разабрацца, а што ж знаходзіцца там, на сподзе чалавечай душы...

Гэткім жа роздумам напоўнена і кніга «Асенні гром» /1985/. Праўда, на гэты раз І. Капыловіч падступаецца да праблемы з іншага боку. Душэўнае пастаянства і раўнавагу шукае галоўны герой аповесці Васіль Сідорык, які, як і многія іншыя, апынуўся ў горадзе. Вось толькі ці свой чалавек ён тут? Ці не атрымалася так, што і ад зямлі адарваўся, і ў горадзе пастаяннага прыстанішча не знайшоў?

У аповесці «Сны не вяртаюцца» /яна дала назву аднайменнай кнізе, якая выйшла ў 1988 годзе/ — моцны аўтабіяграфічны момант. Расказваючы пра журналіста, які ў час камандзіроўкі трапіў у аварыю, аўтар пераканаўча ўзнаўляе жыццё творчай інтэлігенцыі, задумваецца над маральнымі праблемамі сучаснасці.

Як бы працяг гэтага даследавання рэчаіснасці — у рамане «Пасынак», які летась пабачыў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Аўтар «сутыкае» двух прадстаўнікоў аднаго і таго ж пакалення — Лёньку Ліса і Андрэя Цяжкага. Дзве біяграфіі і два стаўленні да жыцця. Андрэй — чалавек драматычнага лёсу, але не перастаў верыць людзям, у дабро і справядлівасць. Лёнька ж — прыстасаванец, у якога даўно ўжо нічога святога няма за душой.

І.Капыловічу ў гэтым творы ўдалося заглыбіцца ў атмасферу нядаўняга мінулага, калі бяднелі душы і буйныя парасткі давала зло, прыкрытае гучнымі фразамі.

Віншуючы Івана Іванавіча з поўднем веку, зычым яму і надалей жыццёвага аптымізму, плённай і актыўнай працы і за пісьменніцкім сталом, і на пасадзе галоўнага рэдактара газеты «Наша доля».

А.М

І ПАМЯЦІ — ЧУЙНЫ КАМЕРТОН

«КРУГЛЫ СТОЛ» У ВЫДАВЕЦТВЕ «ЮНАЦТВА»

Як вядома, сёлета наш народ адзначае 50-годдзе вызвалення Беларусі ад фашысцкай навалы. У памяці людской ніколі не згасне і не прынізіцца векапомны подзвіг нашага народа ў барацьбе супраць гітлераўскіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Да гэтай юбілейнай падзеі і быў прымеркаваны «круглы стол» на тэму «Не згаснуць памяці народнай», праведзены выдавецтвам «Юнацтва» і прысвечаны выпуску ваенна-патрыятычнай літаратуры, а таксама прэзентацыі кнігі «Дзеці вайны» — своеасаблівага працягу зборніка «Ніколі не забудзем», выдадзенага неўзабаве пасля Вялікай Перамогі пры актыўным удзеле класікаў нашай літаратуры Я. Коласа, К. Крапівы і Я. Маура.

У зацікаўленай гаворцы пра літаратуру аб велічы народнага подзвігу, праблемах і задачах у асвятленні тэмы патрыятызму прынялі ўдзел вядомыя пісьменнікі, у тым ліку і ўдзельнікі вайны, выдаўцы, журналісты, аўтары кнігі «Дзеці вайны», былыя малалетнія вязні фашысцкай няволі.

Адкрыў і вёў «круглы стол» дырэктар выдавецтва «Юнацтва» В. Лукша. Ён нагадаў, што за 13 гадоў існавання «Юнацтва» з 1659 кніг, выпушчаных ім, 141 прысвечана Вялікай Айчыннай вайне. Гэта кнігі І. Шамякіна і В. Быкава, І. Навуменкі і І. Чыгрынава, А. Савіцкага і А. Махнача, І. Сяркова і С. Шушкевіча, М. Гамолкі і А. Кулакоўскага, І. Новікава і У. Ліпскага, іншых аўтараў. Сёлета да юбілею выйдзе 8 кніг. Сярод іх новы раман І. Чыгрынава «Вяртанне да віны», у серыі «Школьная бібліятэка» — творы В. Быкава, кнігі А. Кандрусевіча «Юныя героі Магілёўшчыны» і А. Сульянава «Пасееш вецер...»

Галоўны рэдактар выдавецтва М. Пазнякоў гаварыў аб літаратуры пра дзяцей вайны, падкрэсліўшы, што гэта тая літаратура, якая выхоўвае сапраўднага, прыгожага, сумленнага чалавека, што ваенна-патрыятычная тэма знайшла свой працяг у літаратуры пра сучасную армію, у кнігах пра воінаў-беларусаў, якім выпаў незайздросны лёс ваяваць у Афганістане, пра армейскія будні лётчыкаў, ракетчыкаў, танкістаў, пра падрыхтоўку старшакласнікаў да вайсковай службы.

Затым слова ўзялі госці. Народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін выказаў занепакоенасць, што ў некаторых перыядычных публікацыях робіцца спроба прынізіць партызанскі рух, абяліць паліцэйскіх; зазначыў, што тэма дзяцей вайны распрацавана яшчэ слаба ў нашай літаратуры; паведаміў прысутным, што напісаў аповесць «Ахвяры», у якой узняў новыя праблемы партызанскага руху, якому падчас шкодзілі сваімі дзеяннямі Берыя і Чандрэ.

Сваімі думкамі, меркаваннямі і прапановамі падзяліліся таксама С.Панізнік, А.Сульянаў, Э. Скобелеў, А. Махнач, А. Капусцін, Г. Васілеўская, Я. Каршукоў.

Намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь С. Нічыпаровіч расказаў аб палітыцы дзяржавы ў кнігавыданні, адказаў на пытанні прысутных.

М. ПАЎЛАЎ

МУЗКАМЕДЫЯ НА ШЛЯХУ Ў ЕЎРОПУ?

Музычныя тэатры еўрапейскіх краін з мэтай каардынацыі сваёй працы аб'ядналіся ў грамадскую арганізацыю пад назвай Еўрапейская акадэмія музычных тэатраў. Разам з вядомымі тэатрамі Германіі, Аўстрыі, Італіі і з іншых краін Еўропы ў гэтую асацыяцыю ўвайшоў і Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі Рэспублікі Беларусь. Летась у Вене адбыўся II кангрэс Еўрапейскай акадэміі музычных тэатраў, у якім браў удзел мастацкі кіраўнік і дырэктар нашага тэатра С. Косцін. Удзельнікі кангрэса з увагай і цікавасцю паставіліся да новага прадстаўніка ЕАМТ: С. Косціну была дадзена магчымасць двойчы выступіць са сваімі дакладамі перад прадстаўнічай аўдыторыяй.

Па сутнасці, усе тэатры свету працуюць па аднолькавых законах. Галоўнае адрозненне — у спосабе іх фінансавання. На кангрэсе абмяркоўваліся пытанні менэджменту, міжнароднага супрацоўніцтва, арганізацыі фестываляў і г. д. Тыднёвае знаходжанне ў Вене было для С. Косціна карысным і ў плане канкрэтнай дапамогі тэатру, які ён узначальвае. Наладжаны сувязі з фондам «Культуркантакт» Міністэрства культуры Аўстрыі, куды кіраўнік нашага тэатра звярнуўся з просьбай прадаставіць копіі арыгіналаў /як музычных матэрыялаў, так і літаратурнай асновы/ класічных аперэт венскай школы.

Вядома, якім карэктурам падвяргалася класічная аперэта ў савецкіх тэатрах у 20-я гады. У мэтах барацьбы з буржуазнай ідэалогіяй бязлітасна правіліся і перарабляліся лібрэта, у сюжэтную канву ўводзіліся нематываваныя сацыяльныя канфлікты, якія скажалі аўтарскую задуму. Музычным матэрыялам было цяжэй маніпуляваць, але і яго «рэзалі». Мы цяпер не ведаем, якой была тая ці іншая аперэта Штрауса ў сапраўднасці, і калі наш тэатр паедзе са сваім спектаклем, скажам, на гастролі ў Аўстрыю, дык там гэты твор проста могуць не пазнаць.

І яшчэ ёсць у С. Косціна задумка: карыстаючыся сваім членствам у Еўрапейскай акадэміі музычных тэатраў, запрасіць на пастаноўку класічнай венскай аперэты творчую групу з Аўстрыі. «Пад крылом» асацыяцыі такое супрацоўніцтва магчымае.

Зоя ЛЫСЕНКА

ЮБІЛЕЙ АЛЕСЯ ЯКІМОВІЧА

адзначаны ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. На сустрэчу, прысвечаную 90-годдзю з дня нараджэння пісьменніка, прыйшлі яго родныя і блізкія, Э. Агняцвет, Н. Галіноўская, У. Ліпскі. Аб творчасці А. Якімовіча расказала М. Шаўлоўская. М. Яфімава прыйшла на сустрэчу са сваім тэатрам — студыяй «Летуценнік».

Дачка А. Якімовіча Рэната Аляксандраўна перадала музею матэрыялы аб жыццёвым і творчым шляху бацькі. Працуе ў музеі выстава, прымеркаваная да юбілею.

З. К.

БЕЛАРУСЬ — КІТАЙ: МАЦНЕЮЦЬ СТАСУНКІ

Мацнеюць стасункі паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай. Гэтаму ўсяляк спрыяе таварыства «Беларусь—Кітай». Пра вынікі яго работы гаварылася на пашыраным пасяджэнні праўлення, у якім прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Ван Сінда.

Падкрэслівалася, што супрацоўніцтва паміж двума народамі дае жаданы плён не толькі ў эканамічнай дзейнасці, а і ў галіне навукі, адукацыі, культуры. У прыватнасці, у Мінскім лінгвістычным універсітэце адкрылася аддзяленне кітайскай мовы. Мяркуецца, шырэй знаёміць беларускага чытача з лепшымі творамі кітайскіх літаратараў. Адзін з першых крокаў у гэтым кірунку зроблены часопісам «Полымя», які ў адзінаццатым нумары за мінулы год у перакладзе Рыгора Кашубы апублікаваў аповесць сучаснага кітайскага пісьменніка Лу Вэньфу «Калодзеж».

На пасяджэнні праўлення таварыства галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Сяргей Законнікаў уручыў экземпляры гэтага нумара Ван Сінду, каб той іх перадаў на радзіму.

Вячаслаў АДАМЧЫК

БЕРАЖЫ ЯГО, БОЖА!

СТАРОНКІ З ДЗЁННІКА

Пятніца, 15 сакавіка 1968 года. След ад лыжаў на счарнелым насце замецены новым снегам, сіняватым і чыстым. За пагоркі, у зацішак лагчынаў і яраў туляцца голыя кусты. Вусцішна-нямы, яшчэ не жылы шара-панельны мікраараён падступае да палявое дарогі, абапал якой звініць сухі леташні быльнік. У чорных проймах вокнаў і дзвярэй густа, нібы ў ружова-хваёвым лесе, шуміць вецер. Палявая дарога ў нарасцях мутнага лядку завалена чорнымі трубамі, друзам, бітаю цэглаю, ажно страшна глядзець на чалавечы прагрэс. Так наступаюць, няшчадна руйнуючы палявыя дарогі, падразаючы пакатыя грудкі, выварочваючы гліну, нібы па-жывому паласаючы цела зямлі, непрытульна-халодныя муры горада на затоеную ў чорных прысадах, знябожаную вёсачку. А за вёсачкаю — ужо на нашу мову, быт, норавы, песні, паданні, забабоны, замовы... Так паступова вынішчаемся мы — беларусы. Тут ужо жыцьме іншы чалавек, прагматычны і карыслівы. Яго не будзе абыходзіць ні наша скалечаная мова, ні нашая, зарослая дзяцелінай палявая дарога, што ўзбягае з яру на лабаты грудок.

Як крыўдна і горка думаць, што жывое зялёнае поле ўсё больш і больш залівае гарачы, топкі, як багна, руды асфальт і халодна-цвёрды, як сталь, шары бетон, бо ім, прагматыкам, патрэбна толькі хуткасць, каб нічога не бачыць, каб перад вачмі ўсё злівалася ў шарую безкалёрную стужку.

Але ж куды і насустрач чаму так імкліва шыбуе сённяшні чалавек?

Чацвер, 21 сакавіка 1968 года. Мужчына ў тралейбусе: белы, амаль бяскроўны твар у жаўтлява-карычневым рабацінні, губы таўставатыя і выцягнутыя, нібы ён хоча пацалавацца, на кончыку даўгаватага носа кусцік чорных валасоў. Зрэшты, самы звыклы чалавек, а запомніўся.

Субота, 18 мая 1968 года. Каралішчавічы. Росны ранак пасля дожджыку, камарыны тугі звон, нібы хто рве тонкую нітачку. Як у грайку — між дзвюх тронак перынка травы, — грае невядомая мне пташачка. Чмель садзіцца на крэмава-карычневы кілішачак гравілату. Не ведаю чаму, але нейкай асаблівай, калі не сказаць таямнічай любоўю люблю гэтую непрыкметную раслінку, мо таму, што яна была спадарожнікам маіх дзіцячых і падлеткавых гадоў, мае неадступнае адзіноты і смяртэльнага смутку, як і раскалыханая ветрам слепата /ветраніца/ у замшэлых ядлаўцовых кустах, яе белыя, разлітыя вясною азёрцы. Улетку майму шасцігадоваму пастухоўству спадарожнічала конская ў белых кутасіках цыбуля і сівая вострая, што рэзала пальцы, асака, ды жалосна-адчайны плач чубатае кнігаўкі, што да бясконцай нудоты неадчэпна вілася нада мною.

Пры сцежцы, дзе на леташняе дубовае лісце чуйна пакрапвае дажджавая раса, тонкі дубок абвіў маладую елку. На мокрым яловым камлі іскрацца бурштынавыя нарасці смалы. Схаваўшы пад лісце белыя дробныя кубачкі, цвіце бруснічнік. Гэтакія ж кубачкі, толькі ліловыя, і гэтаксама верхам уніз — на светла-зялёным чарнічніку. Зноў скупы, не вельмі прыкметны знак майго дзяцінства. Як помняцца яны, кілішачкі белых і ліловых кветак, а разам з імі кіслы смак цёплых, налітых сонцам цёмна-агністых, трохі сопкіх ягадаў, што вісяць цэлаю жменькаю пад блішчаста-зялёным драпастым лістком. Таксама было не меншае шчасце знайсці іх на лясным прыгрэве сярод кучаравага, гафтаванага ліловымі кветачкамі верасу.

І каля жоўтага драўлянага дамка, рубленага з круглага дрэва, бачыш светла-ліловы куст бэзу. Прыгадваецца ўжо Ван-Гог, або магілкі. Чамусьці яны стаяць поруч — мастацтва і смерць.

Пятніца, 24 мая 1968 года. Вывадкі маладых, у жоўтым пушку, качанят абгароджаны драцянаю сеткаю. Ім рэжуць траву. А над імі, на сліве, цэлы сівы клубок вусеняў, таксама, мусіць, пражорлівых, бо зараз папаўзуць аб'ядаць лісце. Яно ўсё суладна ці гарманічна ў прыродзе.

Субота, 14 чэрвеня 1968 года. Зялёнае. Ганалес. Раненька, толькі-толькі заднела, але яшчэ не згасла адзінокая востра-калючая зорка, у насцярожаным лесе скрыпуча, як нямазанае кола ў возе, — ці-р-р—, ці-р-р-р-у-ў — пачала падсвістваць невядомая мне пташачка. А потым усю гэтую шчыра-даверлівую песню перарвала варона, дзярката і ўладна закаркаўшы, як бывае дзе каркне начальства, перапыніўшы і заглушыўшы нашу песню. Аднак угоднік і за гэта карканне лісліва падхваліць начальства.

Панядзелак, 16 чэрвеня 1968 года. На хвойках ужо вялікія ружовыя стрэлкі, і елкі з ялаўцом убраліся ў жаўтлява-зялёныя кутасікі. Вось так на некалькі сантыметраў сягнула наперад жыццё. А як жа ж мне ўгнацца за ім? І, між іншым, шпакі пакінулі дупло ў ружовай прыгожай хвойцы каля пясчанай лясное дарогі. І мне, бяскрыламу, хочацца ляцець з свайго дупла на велічны прастор. Як жыве ў чалавечай душы вечнае і неадступнае жаданне волі.

Субота, 20 ліпеня 1968 года. Фаніпаль. Чыгуначная станцыя. Чырвоны грузавы вагон бяжыць, разагнаны дызелем, і ў яго, як у жарабца пасля злучкі, пацялепваецца тоўсты гумовы шланг. Звесіўшы вецце, знябожаная бярэзінка стаіць каля пышна натапыранай ліпы. На пераездзе, паклаўшы руку на клуб, абыякава пазірае на наш зялёны цягнік смуглявая маладзіца з жоўтым скручаным флажком. Салдаты, паскідаўшы кашулі і паблісквачы загарэлымі спінамі, капаюць равок — рытмічна ўзмахваюць лапатамі. На папялова-гарачай дарозе невысокі воз з сенам. На ім маладая працавітая пара — напэўна ж мужык з жонкаю. Воз паволі паплыў у запалавелае прытомлена палеглае жыта, як у вечны акіян сялянскага нялёгкага жыцця. І пара гэтая, чуючы адно аднаго на спакуслівым сене, паплыла ў гэты жытні акіян.

Нядзеля, 25 жніўня 1968 года. Зазірнуў на наваградскі рынак, нібы зазірнуў у свой будучы твар: слівы ў вялікіх кошыках з накрыўкамі, яблыкі ў скрынях і цэбрах, парасяты трапечуцца ў мяхах, — купцы, прыцэньваючыся, выцягваюць іх за заднія ногі. Яўрэйкі ў сетках носяць купленых чырвона-рабенькіх сытых курэй. Яшчэ не звяліся тутэйшыя майстры — ганчары, лажэчнікі, грабельшчыкі, бондары, кавалі, — яшчэ прадаюць кубельцы, дзежкі, гаршкі, лыжкі, секачы, капашкі... А над усім гэтым нядзельным кірмашом, над кіпуча-гаманкім натоўпам, тутэйшай людмасцю, грузавымі калгаснымі машынамі, прыватнымі «Волгамі», «Запарожцамі», «Явамі» з люлькамі, у якіх ледзьве ўмяшчаюцца сытыя маладзіцы з непрывычнымі для іх шлемамі на галаве, — над усім мурашыным сённяшнім вірам узвышаецца, падняты на зялёным конусе гары старажытны замак — дзве яго чырвона-ліловыя вежы з каменю і цэглы, а перад імі — светлы касцёл з чырвоным чарапічным дахам. Аж боязна думаць, колькі ж нашага люду бачылі яны з вышыні сваіх недасягальных гадоў. Колькі эпох, дзяржаў, уладароў, палітыкаў, забытых і незабытых, прайшло, прамільгнула перад імі. Але спынімся і падумаем пра тое, што яны бачаць і мяне, грэшнага...

Пятніца, 29 жніўня 1968 года. Кожны вечар настаўляю вуха да светла-жоўтай старое «Сакты» — слухаю і заміраю сэрцам, перажываючы за Чэхаславакію. Надоечы ў рэдакцыі з'явіўся Пестрак, прынёсшы копію свайго даносу на мяне /арыгіналы ён адсылае ў КДБ/. Мне тайком далі прачытаць усяго адзін сказ, дзе было напісана, што ў звязку з падзеямі ў Чэхаславаччыне ці не ўкраўся ў «Полымі» вораг у асобе Адамчыка? Першае таемнае пісямцо на мяне склаў і адаслаў у ЦК Бачыла /мне яго копію, ціха паклікаўшы ў машбюро, дала пачытаць машыністка Эма/.

Немагчыма працаваць у рэдакцыі: нешта падазронае, пасля зацяжное п'янкі мармыча яшчэ адзін патаемны охранный осведомитель ці denuncjatar, як кажа старажытная латынь.

Тыя пісьмы, па справе якіх мяне выклікаў Ткачоў, з Саюза пісьменнікаў перасылаліся напэўна ж у жоўты дом дзяржбяспекі.

Пятніца-субота, 6-7 снежня 1968 года. У людным тралейбусе, вяртаючыся дадому, сцішаны і прытоены, у светлай радасці заснаваў сюжэт аповесці і ўжо, апалены гарачынёю шчасця, запісваю яго ў растрэсены стары сшытак /новага сумысна не бяру, каб не сурочыць, у новым, ды яшчэ прыгожым, звычайна не пішацца/, — ажно дваццаць два раздзелы. Назва пакуль што ўмоўная — «Ледзі Макбет Ятранскай воласці». Працы на цэлы год. Памажы, Божа!

Нядзеля, 15 снежня 1968 года. Надвячорак. Кальварыя. Неба над дрэвамі яснае, балюча і агніста-чырвонае. Сонца ўжо не відно. І там, дзе яно было, датлявае пякучы агонь, і дрэвы стаяць голыя, з чорнымі камлямі, як абгарэлыя.

На высокіх кронах — чорныя грачыныя гнёзды, рыхтык нечыя пазакіданыя шапкі. Гракі сядзяць на тэлеграфных слупах і на яблыньцы каля нечай прыгорбленай хаткі. Яны, мусіць, укладваюцца ўжо нанач.

Чырвань ледзь існее на вежы касцёла. Снег ужо ў вечаровай фарбе, нібы абліты сінькаю. Перад доўгаю, атуленаю чорнымі голымі садамі вёскаю /Цівялі/ белае нярушанае поле канчаецца цёмна-жоўтаю, падкопанаю экскаватарам стромаю. Там вуркоча, надрыўна гудзе і пастрэльвае самазвал. Самалёт, як голуб, прытуліўшы крыллі, зніжаецца на пасадку. І чорна-шараю, ачышчанаю ад снегу шашою бяжыць конь, высока выкідваючы пярэднія ногі і нагінаючы голаў. Фыркае, сапучы з ноздраў гарачаю параю.

Фурманка прабегла, абагнаная патокам машын, і пакінула ў душы даўні незабыты смутак па іншым жыцці, палявой, замеценай снегам дарозе, адзінокім хутары, куды я хадзіў праведаць нашмат малодшых за мяне стрыечных братоў: іхняя маці, мая дзядзіна, сабраўшы, як у нас кажуць, падаянку, паехала праведаць хворага на трасцу мужа — майго дзядзьку Юзапа, што сядзеў у перасыльнай аршанскай турме. Чаму фурманка выклікала такую асацыяцыю, не ведаю, бо каня, дарэчы, на тым бедным хутары не было. У хляве стаяла адна закажанелая карова, якую я мусіў быў напаіць і накарміць.

Як варта было б напісаць пра гэтае смутнае маё падарожжа і радасць здзічэлых ад вусцішнай адзіноты дзяцей, калі я ўваходзіў у іхнюю хату. Нібы таксама ў турэмную камеру.

Нядзеля, 22 снежня 1969 года. Чалавек паляцеў да месяца. Цікава, што ён там убачыць? А тут, на зямлі, туман, непраглядная адлежная ноч, чорны мужчына на белым снезе, наўкруг ліхтароў ліловыя кругі, як наўкруг месяца, чорная шаша, за ёю — снег, плот, зноў чарната — там немая Кальварыя, дзе пад снегам стынуць магілкі... Так многа і так мала, нарэшце, трэба чалавеку.

Панядзелак, 23 снежня 1968 года. Чорныя гракі на белым снезе — адлежыць. Чытаю Бальзака, упіваючыся, як кажуць, і фразай, і выразам, і думкай, і дасціпнасцю. А ўсё пачалося з таго, што ў букіністычным аддзеле кнігарні купіў два ўцэненыя бальзакаўскія томікі /па 30 капеек кожны/ і захапіўся найперш публіцыстыкай — а вострая ж яна, як наточаная сталёвая шабля, што рэжа нават валасок! — а цяпер зачараваны яго непадкупна геніяльнай навелай пра парыжскіх музыкантаў /ці не таму, што сам колькі месяцаў хадзіў у местачковую аркестуру?/. І ўзвышаны, растрывожаны гэтым адзінокім геніяльным пакутнікам, замануўся напісаць сам і пра местачковую аркестуру, і пра суседа, вясковага музыканта, што ачуціўся ў горадзе і кожнае суботы на сваёй зялёнай гармоні выцінае полькі і абэркі — чутно праз калідор, — і кожнае суботы ў яго дапазна бяседа, госці, і кожны раз ён вядзе іх на тралейбусны прыпынак з гэтаю самаю зялёнаю гармоняю і яшчэ ў ліфце пачынае на ўсю моц іграць.

Першы раз я ўбачыў яго, прыйшоўшы аглядаць сваю новую кватэру, — ён тады якраз устаўляў замок. Здаецца, тады ён сказаў, што «работае» на фабрыцы цацак. А потым, пазнаёміўшыся бліжэй, прыносіў дарыць маёй жонцы дніўчы і таўкачы, мне — казеінавы клей.

Жыве ён не ў ладах з жонкаю. Праўда, яны абое п'юць. А потым, як гэта звыкла бывае, пачынаюць біцца, а назаўтра абое прыходзяць пазычыць рубля. П'яны ён многа гаворыць і кожны раз кажа, што прыйшоў браценік, і кожны раз усё выбачаецца.

Ды як жа-ж, як тое мог і рабіў Бальзак, намаляваць жыццё ў схватцы, у змаганні з жаданнямі, што з'яўляюцца пачаткам усялякай страсці? Дзе ж знайсці тыя адпаведныя і належныя словы і перадаць імі ўсё перажытае і пачутае? Дзе?

Нядзеля, 12 студзеня 1969 года. Як пачаўся ад новай квадры месяца, так і не злягае мароз. Тэлефонныя правады тоўстыя, як карабельныя канаты. Белая ад інею Кальварыя. Чорныя гракі на фантанах перламутравых дрэў. Бела-сіняватае нярушанае поле. Белая вёска — прысады і стрэхі.

Узбоч чорнага асфальту, канаваю, едзе фурманка — у каня заінелі персі. Фурман ідзе поруч, падняўшы цёплы каўнер.

Прыпамінаюцца даўнейшыя ганарыстыя коні з чырвонымі каснікамі ў грывах і ў холках, чорныя выштукаваныя або прыгожа выплеценыя з ракітніку вазкі, фурманы ў шарых суконных бурках з чырвонымі або блакітнымі ў сярэдзіне башлыкамі, шастуны ў бурбалках званкоў. І маё маленства, міма якога праімчаліся ганарыстыя коні з мілагучнымі званкамі і шастунамі, каб назаўсёды пакінуць у маёй памяці гэты густы, як гуд пчалінага рою, звон вясёлых шастуноў... І нібы выпадковым кадрам у памяці выплыў мой дзядзька Ян Баравік, якога пазалетась выдуплаў, скінуўшы з сябе, спуджаны жарабец, на вачах у здурнелых п'яных баб, што рашылі падзеразавацца ды пажартаваць, спудзіўшы яшчэ добра неаб'езджанага жарабца. Так іншы раз нечаканаю бядою канчаюцца нашы беларускія вяселлі ды хрэсьбіны... Як палярныя, так і неадлучныя яны — радасць і гора.

Серада, 22 студзеня 1969 года. Учора было Вадохрышча, даўнейшае свята, калі кідалі ў калодзеж выструганыя драўляныя крыжыкі. Помню, схадзіўшы раненька па ваду, іх прыносіў у вядры бацька. Помню раскалыханую ваду ў вядры і на ёй ружаватыя драўляныя крыжыкі.

У гэты ж дзень аб'язджалі і крапілі святою вадою маладых коней.

Мароз. Пры шашы так міла, па-даўняму ныюць, гудуць тэлеграфныя слупы і на іх,

(Працяг на стар. 14-15)

ІЗНОЎ ПРА ДЗЯЦЕЙ

Слонімскі беларускі драматычны тэатр шмат працуе не толькі для дарослых гледачоў, але і для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту. Перад сабою калектыў тэатра ставіць тры задачы: паказаць, як у будзённым жыцці можна свабодна і лёгка валодаць роднаю мовай; быць верным сябрам і дарадчыкам дзіцячых садкоў і школ у практычнай даламозе па адраджэнні беларускай культуры; захапіць дзяцей мастацтвам, навучыць іх разумець цудоўнае. За час свайго існавання прафесійны тэатр пабываў амаль ва ўсіх кутках Беларусі з «Двума клёнамі» Я. Шварца, «Папялушкай» Т. Габе, «Крышталёвай сняжынкай» В. Небальсіна, «Зайкам-зазнайкам» С. Міхалкова, «Прынцэсай і салдатам» У. Ягоўдзіка, «Антосікам і гармонікам» Ю. Фрыдмана і В. Шульжыка, «Чарадзейнымі суніцамі» А. Якімовіча, «Днём нараджэння ката Леапольда» А. Хайта. У другой палове студзеня ў тэатры зноў адбылася прэм'ера для дзяцей — «Мудрагелісты Цмок». Напісаў п'есу і ажыццявіў яе пастаноўку артыст тэатра Сяргей Бачкоў. Не буду апісваць казачныя прыгоды, адзначу толькі, што выкананне Уладзіміра Навуміка, Анжэлы Прэдкі, Іны Ёрш, Васіля Сяўца, Юрыя Грасевіча, Валерыя Бандарука дзеці ўпадабалі.

Сяргей ЧЫГРЫН

На здымку: сцэна са спектакля.
Фота М. СУПРУНА

МАСЕЙ СЯДНЁЎ ЯК ДРАМАТУРГ

прадстаўлены ў першым нумары часопіса «Тэатральная Беларусь». Змешчаны яго драматычная аповесць «Уваскрослыя», а таксама гутарка з аўтарам галоўнага рэдактара «ТБ» А. Сабалеўскага «Развагі пра п'есу». У нумары — уражанні Т. Гаробчанкі /«Па-за часам і прасторай»/ і Р. Смольскага /«Берасцейскія рупліўцы»/ ад тэатральнага жыцця ў Брэсце, меркаванні А. Сімавай /«Узлёт майстэрства»/ пра пастаноўку «Іаланты» П. Чайкоўскага ў тэатры оперы і балета.

Г. Багданава /«Блакітная ружа — эмблема падману?»/ асэнсоўвае спектакль «Блакітная ружа» ў тэатры імя Я. Купалы. Б. Бур'ян /«І сапраўды — Святлана»/ напісаў штрыхі да творчага партрэта актрысы С. Акружной. Л. Бунеева гутарыць з драматургам І. Сідаруком — «Дзверы ў неба». М. Макарцоў запрашае далучыцца да народных звычаяў — «Калядна-тэатральная традыцыя на Гомельшчыне». Р. Платонаў /«Патрабуюцца тэрміновыя і рашучыя меры»/ на дакументах паказвае, як рабіліся «ворагамі народа» тэатральныя дзеячы. У. Мамонька рэцэнзуе «Беларуска-польскі размоўнік» А. Клышкі. Рубрыка «Пасля спектакля» прадстаўлена гумарэскай У. Якубовіча «Парадыст», карацелькамі А. Суніцына, «Тлумачальным слоўнікам» І. Курбекі.

КРЭЎНА ЗВЯЗВАЕ... КРЭВА

нас з даўніной. І нездарма, бо ў гісторыі гэтага мястэчка, бы ў люстэрку, знайшлі свой адбітак шмат якія падзеі, водгулле якіх і праз стагоддзі не страціла прыцягальнай сілы. Менавіта Крэўскі замак з'яўляўся любімай рэзідэнцыяй вялікіх князёў літоўскіх, тут была заключана так званая Крэўская унія. Ды і сама Нальшанская зямля — не проста частка тэрыторыі Беларусі. Здаецца, усё тут дыхае беларускасцю. Застаецца адно пачуць гэтае дыханне, услухацца ў яго і тады шмат чаго адкрыецца.

Да крэўскай даўніны і прыслухоўваюцца аўтары кнігі «Лёс Крэва» А. Дзярновіч, А. Трусаў, І. Чарняўскі, выпушчанай выдавецтвам «Полымя». Прыслухоўвацца, каб паведаць чытачам аб асобных момантах нацыянальнай гісторыі.

БЕРАЖЫ ЯГО, БОЖА!

(Пачатак на стар. 13)

як шкляныя нітачкі, звіняць намерзлыя правады. Успамінаецца таксама даўнейшае: ідзеш у мястэчка сцежкаю пры шашы ад аднога трымцівага звону да другога — ад слупа да слупа, на якім з дзесятак белых фарфоравых або сініх шкляных кубачкаў і столькі ж правадоў з звінючым гудам. Набягае на памяць і другое — мая адзінота, вячэрняя школа і звінючы гуд шарых, патрэсканых тэлеграфных слупоў, як даўніх сяброў, што сцераглі і вартавалі мой смутак.

Чытаю пра анкалагічны корпус і, здаецца, ляжу ў бальніцы сам: так праўдзіва выпісаны персанажы і бальнічныя ўмовы і абставіны. Услед за аўтарам думаецца, чаму такі несправядлівы свет, чаму такі помслівы і злы чалавек? У яго ж кароткі век і чаму не пражыць жыццё з дабратою? Які ж д'ябал пасеяў у чалавеку зерне помсты, недаверу і злосці?

І яшчэ: магутны і праўдзівы талент усясільнай хваляй землятрусу рушыць трон.

Прыкра, сорамна і нават згідна, што той-сёй з беларускіх літаратараў яшчэ ўсё стаіць на задніх лапках, з угодлівай ліслівасцю вычэкваючы, калі ж яму нарэшце дадуць ленту і ключык.

Але ж чаго дзівіцца, так было спакон веку — падалі на колінькі і паўзлі, і складалі ўгодлівыя харалы, і ўдавалі адзін аднаго — усё дзеля гэтых лентаў, ордэнаў і фальшывых званняў, а потым з надзьмутай пыхай ганарыліся імі, каб ужо без чаргі дайсці да прывілеяў, кватэр, шматтомных перавыданняў, ні радка не пакідаючы патомкам, каб усяго толькі іншы раз пахваліцца перад сваім жа братам па пяры: «А ў мяне ненадрукаваных твораў няма».

Абдзеленыя талентам, нямоглыя, кволыя духам, бессаромныя і дападныя па ўхватцы, здрадлівыя па натуры — яны, усе разам прытоеныя бязлітаўцы... Але барані, Божа, чапіць іх — уджаляць на смерць.

Чацвер, 23 студзеня 1969 года. У бяссонную ноч чытаю Пушкіна — яго дзённікі. Як смяяліся з чалавека, як ганьбілі і «высочайшей цензурою», і камер-юнкерствам, і за гэтую ганьбу хацелі яшчэ «умиления и благодарности».

Няўжо было, ёсць і будзе на зямлі зло? Няўжо крыўдзілі і будуць крыўдзіць чалавека, і ад бяды і крыўды як не было, так і не будзе ратунку, як быў чалавек бяспраўным, так бяспраўным і застанецца?.. Як горка і неміласэрна цяжка пра гэта думаць.

Субота, 25 студзеня 1969 года. Зноў чытаю Пушкіна, на гэты раз яго «Гісторыю Пугачова». Для мяне, уласна, гэта Эльдарада, бо колькі ж тут можна знайсці залатых самародкаў. Колькі ж тут нікім не выкарыстанага матэрыялу для ёмкага рамана. А якая незлічонасць сюжэтных вузлоў і фабульных ходаў, нават у заўвагах і дадатку. Які скупы, але які дакладны, без блізарукай дробязнасці, як казаў ён сам, ягоны стыль, як ашчадна і скрупулёзна вывучаныя архіўныя дакументы, якая, зрэшты, у мяне, чытача, даверлівасць да гістарычнай праўды і аб'ектыўнасці. Можа, я перабольшваю і мяркую не кампетэнтна, але як па-зайздроснаму ўдала выхаплены з мінулых дзён гістарычныя асобы — незвычайныя, каларытныя і неардынарныя персанажы будучага мастацкага твора, як трапна падцікаваны праявы тагачаснага жыцця ці, як казалі даўней па-расейску, — «какая типическая верность натуре».

Калі часам прыйдзецца пісаць пра Раіну Грамычыну, мушу буду перачытаць «Гісторыю Пугачова» і выдатныя заўвагі да яе, бо бачу нешта блізкае да супольнае паміж гвалтоўнай смерцю Пугачова і смерцю нашай Ятранскай пакутніцы, пападдзі Раіны Высоцкай, спаленай жыўцом на стосе дроў.

Дарэчы, казакі, што катавалі, забівалі і вешалі людзей у Казанскай, Арэнбургскай і Пензенскай губернях і «ўваходзілі ў храмы божыя ў шапках», нагадваюць мне ўжо ранняе лета 1944 года, калі іхнія праўнукі ці прапраўнукі па-забойску і садысцку каралі людзей у нашай Варакомшчыне.

Як праз вякі на зямлі паўтараецца ўсё страшнае — чалавек забівае чалавека.

І няўжо ж так павінна быць, як піша той жа самы Пушкін:

Пастите сь, мирные народы!
К чему стадам дары свободы?
Их должно резать или стричь.
Наследство их из рода в роды
Ярмо с гремушками да бич.

Але ж страшна, аднак, з гэтым згаджацца — з ярмом ды бічом.

Пятніца, 31 студзеня 1969 года. Уночы — туман, адлега, цурчанне і плюскат талай вады з дахаў, раніцаю — вецер, шахканне інею, што ападае з тэлеграфных правадоў. Бела-сівая Кальварыя зліваецца з туманам, толькі відны невыразна цёмныя, як у глыбокай вадзе, камлі блізкіх дрэў. І гук ад патоку транспарту з аўтамагістралі сыравата і цяжка асядае ў волкім тумане. А мая душа тым часам пераносіцца да лясных пагоркаў і зялёных лугоў Навагрудчыны — я чытаю «Пана Тадэвуша», ачуціўшыся ў горкай чаромусе, аплеценай хмелем, пад шатамі ляшчыны арэхавымі перламі, пад тым дубам, што ўсклаў на свой гарбаты карак ажно пяць вякоў...

Па рэаліях прыроды, быту, усёй панарамы вясковага і шляхотнага жыцця мілейшага твора, акрамя хіба «Новай зямлі», за міцкевічаўскую паэму для мяне няма.

Да Міцкевіча я прычашчаўся змалку, калі маці, пры сваім, здаецца, вечным, бясконцым прадзіве, пачынала па памяці чытаць «Пані Твардоўскую», завучаную ёю ў польскай вясковай школцы ў суседняй ад нас вёсцы Аханянах яшчэ перад першаю сусветнаю вайною. І не толькі Міцкевіча, а поруч з ім і школьныя, з лемантара, вершы Канапніцкай: «Ешчэ снежак прушы, ешчэ хлодны ранэк».

Беларускі Міцкевіч — Якуб Колас — прыйшоў да мяне трохі пазней, ужо ў часе вайны, у местачковай, тады яшчэ беларускай школцы, дзе выкладала былая колішняя польская настаўніца і дзе мы чыталі, як помніцца, коласаўскае апавяданне «У старых дубах», надрукаванае ў танюткім зборніку выбраных твораў віленскага выдання з партрэтам трохі дзіўна-загадкавага аўтара ў капелюшы, пад гальштукам і ганарыста закручанымі вусамі, як у нашага местачковага стрэлачніка-паляка, што хадзіў заўсёды абвешаны чорнымі вялікімі ліхтарамі.

Перачытваючы «Пана Тадэвуша», я міжволі думаю і пра аўтара для мяне блізкай і непадкупна-шчырай «Новай зямлі», што бярэ свае вытокі з Прынямоння, з тутэйшага жыцця, звычаяў, фальклору... і, вядома ж, — з шляхецкай гісторыі Адама Міцкевіча. Яны былі палярныя, але, як мне здаецца, і абвеяныя адным і тым жа духам: там — змаганне за старую Польшчу, тут — за маладую Беларусь.

Літва! Айчына мая, ты ёсць як здароўе...

Мой родны кут, як ты мне мілы, — ужо гучыць як працяг бессмяротнага «Пана Тадэвуша», каб стаць, нарадзіцца бессмяротнай «Новай зямлёю».

Там рукою генія ўзвалены надмагільны камень над усім старым і мінулым, тут рукою генія закладзены падмурак пад гмах таго, што мае быць збудавана, «каб новы свет жыцця саткаць».

Субота, 1 лютага 1969 года. Серабрыстым шнурком цэдзіцца і з вясёлым звонам бубніць па блясе за вокнамі талая вада. Разарванай пазалотай калышацца і па-вясноваму пабліскваe на лужынах, слепячы ў вочы, высакаватае ўжо сонца. Тугі, вільготны вецер з поўдня. Звабліваючы чыстым, як вочы ў дзіцяці, блакітам, распагоджваецца неба. Бялюткія, пеністыя хмары сплываюць на ўсход. У ветранай смузе растае лес і чубок высокіх шараголых дрэў. Нібы дзень вясны. Але настылы касцёл у Кальварыі палохае сівой намараззю, што выступае на яго сценах.

Люблю адлегу, нечаканую яснасць пасля хмурых дзён, далечыню, замярэжаную сіняю смугою, люблю раздражджалы, падточаны сонцам, з сухарыкамі празрыстага лядку, снег, люблю вечар з лёгкім марозікам, з палавінкай высокага месяца, і свой ліловы цень на снезе, адзінока трывожнае гуканне паравоза, і тады таксама хочацца мець клопат, некуды ехаць. А свет той, куды збіраешся ехаць, заўсёды выдае мілейшым, як у дзяцінстве здавалася, што шчаслівейшая і лепшая старана свету тая, дзе ходзіць сонца. Дарэчы, паўднёвую старану свету люблю лепш і цяпер.

Сёння Трахіма ці што? Як піша Даль, загаворваюць мышэй. Але гэта, мусіць, будзе па-старому — 13 лютага. Дарэчы, у нашай вёсцы загаворвалі нават злых сабак, але каб мышэй — не чуў. Ды чаму загаворваць зімою, пасля таго, як яны сточаць збожжа?

Помніцца, як па вёсцы хадзіў жабрак і ў кожнай хаце гугнява-цягучым голасам прасіў у Бога, каб сцярог нас «ад звера бягучага і гада паўзучага». Можа, да гэтых «звяроў бягучых» і належалі мышы. Для мяне ж самы небяспечны «паўзучы гад» той, што звіў гняздо ў рэдакцыйна-начальніцкіх кабінетах. Якую ж замову шукаць ад яго?

Серада, 5 лютага 1969 года. Як іскры ад порсткага агню, проці сонца мігаціць калючы сняжок, што цярушыць з неба. На прыпынку стаіць тралейбус і падморгвае бакавым вочкам, нібы азіраючыся, ці селі ўсе пасажыры. А спыніўшыся за ім, нецярпліва-злосна гудзе і смуродзіць чадным дымам ад саляркі лабаты бязносы самазвал. Як у характары людзей, так і ў характары машын ёсць розніца.

Субота, 22 лютага 1969 года. Прайшоўся прыгожа і па-сібірску глыбока заснежанай Кальварыяй. Завея замяла, зараўняла магілы, пакінуўшы ледзьве прыкметныя горбікі. З-пад белага нярушанага снегу ўздымаюцца чорныя мармуровыя помнікі з белымі слаістымі насыпамі, што нагадваюць маленькія труны. Слаістыя насыпы растаюць, струменячы па мармуру вітыя шнурочкі талай вады. Смутна-жалобная непрытульная цішыня, якую парушае хіба ўзнёслае, веснавое вызваньванне белашчокай сініцы. Непрытульна-халодны, сцішны, з выбітымі вокнамі касцёл. На яго старым, памутнелым крыжы адчайна каўкаюць галкі. Голая, нежывая сасна з аблушчанай угары карою ў пакорнай скрусе хіліцца да яго, і чорнымі манашкамі абступаюць старыя, пазелянелыя ў камлях ліпы, і намагаецца падысці струпаваты магутны топаль.

На навейшых, ужо змешаных некаталіцкіх магілках, на зеленаватым акрошачным помніку — фатаграфія маладой прыгожай дзяўчыны, як у буйнаўскім апавяданні. Але збуцвелыя стрымбулі леташніх кветак, вянкі на крыжы з сухіх яловых лапак прыпаміналі мне свае местачковыя магілкі за азярцом, на стромым жоўта-пясчаным абрывістым беразе, і маю вячэрнюю школу, куды сабралася местачковая распуста, перароскі, якіх з польскай гімназіі павыганяла вайна, і недавучаныя савецкія афіцэры з лётнай часці. Мае равеснікі, хлопцы і дзяўчаты з ніжэйшых класаў, што ўжо набыльвалі пра каханне, уцякалі з першых урокаў і засвятла пагульвалі між простых магілак, без агародак, у заціішку кволага бэзу і цянюткіх высокіх вяргіняў. Па-сяброўску пазваны, я схадзіў колькі разоў туды і зразумеў, што каханне і магілкі яшчэ не па мне. На магілкі найчасцей бегаў хворы на сухоты і закаханы ў жартаўліва-ўсмешлівую рабацінстую венгерку /бацька вугорац, яшчэ з першай вайны застаўся ў мястэчку ў прымах/, што іншы раз гуляла з намі, мой аднакласнік Барыс К. Ён нібы выбіраў сабе месца, бо неўзабаве і лёг там. Ці не першы з маіх школьных сяброў?

Толькі пазней я даведаўся, што ў хворых на сухоты бывае нейкае асаблівае, мусіць, абвеянае смуткам і адчаем блізкай смерці найсвятлейшае каханне. Не ведаю, якое яно было ў Багдановіча, але чуў, якое яно было ў хворых на сухоты хлопца і дзяўчыны, што працавалі на пошце ў нашым жа мястэчку. Я помню іх, неразлучных, з прыгожымі, ужо памечанымі адзнакаю блізкай смерці жаўтлява-зеленаватымі схуднелымі тварамі. Яны адышлі на той свет амаль адначасна, адно за адным, праз месяц ці два.

Пятніца, 15 мая 1981 года. Варакомшчына. Вярнуўся з роднага поля. Пачужэла ўсё наўкруг. Дзе было поле — пасаджаны лясок, а высечаны там, дзе цяпер ляжыць працавітая карычневая ралля, як прыкмета міла-знаёмага і незабытага-даўняга — белыя грушы на колішніх межах.

Ад багатага, некалі дагледжанага і абгароджанага суседняга хутара з злым,

непадступным сабакам на ланцугу — толькі мураваны склеп, сівая вярбіна, а за імі — малады, у ружовых стрэлках падлесак і нямыя, пазвожаныя, ссунутыя на дарогу валуны. Густы басавіты гуд чмялёў, несціханы танюткі струменьчык жаваранкавай песні. І знявечаная ў карычневым кволым яшчэ лісці дзічка каля ружовага каменя з белаватым паскам нарасці, як на чалавечым твары. Тут, справа ад дарогі, пры гэтай скалечанай дзічцы і макаўцы ружовага каменя з белым зігзагам нарасці пачыналася наша поле і... маё дзяцінства. Усё прайшло, знікла, толькі не высыхаюць, высочваюцца на вачах, мае слёзы. Як хацелася калісьці ўцячы адсюль, з гэтага глухога абветранага поля, а як цяпер хочацца вярнуцца!

Няўжо чалавечае жыццё — гэта супярэчнасць, радасна-злоснае памкненне да таго, чаго не можаш дасягнуць?

Але, як казалі старажытныя грэцкія філосафы: «У старанні — усё».

Пятніца, 27 ліпеня 1981 года. Варакомшчына. Маці, прыйшоўшы з садка, дзе падварушвала сена, кусае жоўтае яблыка, пацмоквае і садзіцца пры калодзежы на лаўцы.

— Стары чалавек не можа без работы... Мяне аж за сэрца бярэ, калі бачу, як людзі бягуць і робяць. А тут ужо з носа капае, як з страхі, як у дварэцкага Файбы, што анучы збіраў. Я некалі смяялася, бо ў яго пад носам вісіць і вісіць. І не вытра чалавек. А цяпер у самое...

І прызнаецца:

— Я запусціла каўтун, адну пасму валасоў. Можа, ён хваробу выцягне?

Гарачыня. У гародчыку за яловым частаколам звяў і прылёг бурачнік. Над глухою канапелькай /як яшчэ называюць, горкаю ці дзікаю мятай/, што неяк бязвольна апусціла лісце, гвіжаць руплівыя пчолы. Ластаўкі, мільгаючы бела-перламутравымі жыватамі, нізенька снуюць над надворкам між будынкаў. Сіваватае, падобнае да быльніку божае дрэўка, адчайна схіліўшы свае мякенькія ўзорыстыя верхавінкі, струменіць палынова-густы мяккі дух.

Серабрыцца лебяда, апусціўшы прадаўгаватае, нібы лазовае лісце.

— Сёння ўвесь гарод злёг, — кажа маці.

Бацька падыходзіць з пустымі двума вёдрамі:

— Зараз у калодзежы не будзе вады. А ў гаспадарцы вунь колькі яе трэба. Бывала, ідзеш да чужога калодзежа, як красці. За калодзеж, за тое, што бярэш воду, жалі гаспадару, капалі картоплі. Адным словам, адраблялі. Я Амельянавым, як зарэжу барана, сцягно насіў. Пры царызме ў вёсцы было пяць ці шэсць калодзежаў. Пытлевыя, Юрачкавыя мелі. Гэта за польскім часам іх болей пачалі капаць. Запусціць у яму зрубок з дубу, а зверху каменнямі выкладзе. Спод заўсёды дубовы. Пазней ужо трубы пачалі рабіць...

— Косамі хмаркі — гэта на дождж, — кажа бацька, прымружваючы вочы і пазіраючы на разбэрсаныя высокія воблакі. — Паказвае, што заўтра зменіцца пагода.

— Знішчылі прыроду, — уздыхнула маці. — Каля нашага садка, дзе лагчынка цяпер, некалі ж завоня была, вада стаяла, каля Бортнікаў — багня гразкая — не прайсці было. Адтуль крыніца цякла. А цяпер Бартнікі зрабілі агарод. А даўней па дошцы хадзілі. Дошкі клалі, як касілі. Я ж і кажу, знішчылі прыроду. А ўсе кругом на паняў хварэюць. Бабы ў нас — хоць запрагай, а яны на пенсіі. Поўна Наваельня брыды набралася. Хоць махалам махай — не аджанешся. Усё прыязджаюць. Рады няма. А ў нас свая бяда: карова начыста высахла, вымя спухла. Малако на гной выдойваем.

Ізноў пра сваё, і зноў жаліцца:

— Як гэта жыць не рабіўшы? Некалі да Наваградка збегаю, а цяпер у сад зайсці не магу. Вунь Антось — камень, а не чалавек. Во ў яго здароўе. Лазу і тую каля шашы павыкошваў. А я перыны ўжо не падыму...

Пятніца, 17 кастрычніка 1987 года. Не з меншай цікавасцю, як чужыя, перачытваю ўласныя запісныя кніжкі, вяртаючыся душою да тых шчаслівых і мілых дзён, калі былі жывыя бацькі, і да тых іхніх слоў і выразаў, што гаварыліся мне пад руку ў роднай варакомскай хаце. І нечакана схамянуўся, што якраз сёння бацьку было б 80.

Ён мог, вядома, яшчэ пажыць, але пасля мацерынай смерці пачаў лічыць ужо дні свае.

І мне прыгадаліся дзве астатнія з ім сустрэчы: першая — з жывым, ссутулена-прыгорбленым, схуднелым і расхрыстаным, калі ён выходзіў у настылыя сені, каб прынесці ў грубку вугалю, і ўздрыгваў усім целам ад холаду, і праз месяц ужо другая — з мёртвым, маўкліва-адзінокім — у чорнай труне, што, паднятая на чужыя плечы, праплыла над шарым аблушчаным частаколам на заснежаную вуліцу, а ёю ўжо — пад высокі драўляны крыж у канцы вёскі, дзе па даўняй варакомскай традыцыі труна ставілася на ўслон, каб маглі з нябожчыкам развітацца знаёмыя і суседзі. Найбольш маўкліва.

У першую маю з ім сустрэчу ён мне сказаў, нібы ўжо развітваючыся: «Глядзі, сынку і сваю хатку, і сваю Агатку».

У другую сустрэчу за яго ўжо, седзячы пры труне, гаварылі суседкі: «Казаў, хачу лёгкае смерці... І во — лёгка памёр. Да нас перад гэтым прыйшоў, нават прыбраўшыся. Акуратны быў, сам пры сабе».

Два гады мінула, а я ўсё бачу з дрыгатлівым мроем слёз на вачах, як над аблушчаным яловым частаколам, над сіняватым у пазалоце ад нізкага зімовага сонца вуграватым снегам плыве бацькава труна.

Нехта на падушку яму паклаў белую ў цёмныя рубчыкі кепку /раней, здаецца, у нас такога звычаю не было/, і я прыгадваў тады, у дзень пахавання, і прыгадваю цяпер, як здалёк бялела гэтая кепка, калі ён на ровары, з прывязанаю да рамы касою, вяртаўся з пакосу з няблізкага нашага Азярышча.

Здаецца, у тое лета ён мне і расказваў, як у тым жа Азярышчы за мяжу, за сенажаць сварылася Анюта з старым Антосем. «Яна яму ўсё крычала: «Тваё месца ўжо за рэчкаю!» Гэта — на могілках. А адно ж, як прыйшлося, яна, маладая, памерла, а ён, стары, жыве. Як не ведае чалавек, што з ім прылучыцца».

Антось перажыў і майго бацьку — яму ўжо за дзевяноста. І летась, калі я ў роснадажджлівы жніўеньскі дзень прыехаў у родную старану, каб схадзіць ужо пакланіцца бацькавай магілцы, ён, Антось, махаў яшчэ касою — абкошваў закурэлую шасейную канаву якраз насупраць векавечнага, як ён і сам, варакомскага крыжа.

Вядома ж, і Антосева дарога не абміне гэтага старасвецкага замшэлага крыжа. Аднак прыемна, радасна і ўсцешна бачыць, што нехта па-суседску блізкі і знаёмы табе змалку, бацька тваіх равеснікаў і таварышаў так доўга пры светлым розуме і здароўі жыве, штодзённа па нялёгкім законе сялянства ходзіць у чорнай працы, дадаючы кожнаму належнага і патрэбнага спадзявання на гэткае ж мудрае і працавітае жыццё.

Нібы Бог, толькі свой, не выдуманы, не з апыленага абраза на покуці.

Аўторак, 27 красавіка 1987 года. У каторы ўжо раз перагортваю запісныя кніжкі і дзённікі Льва Талстога. Адно супадае — «слабость большая телесная в спине и ногах». Ён «начерно» скончыў «Крэйцараву санату».

Колькі ж мне трэба моцы, здароўя, упартасці і душэўнага спакою, каб дапісаць чацвёртую кнігу свайго рамана.

Набокаў у «Новом мире» цікавы не сваёю інтэрпрэтацыяй і тлумачэннем Мікалая Гогаля, а хіба цытаваннем гогалеўскага тэксту. Бо што ж можна падумаць, прачытаўшы яго ўласнае, даволі неінтэлігентнае, напышліва-ганарыстае і зняважлівае для Гогаля: «Надо поблагодарить судьбу за то, что он не обратился к украинским диалектизмам как к средству выражения, ибо тогда бы он пропал...»

Набокаўскае «прароцтва», мусіць, не вельмі далёкае ад таго, якое, не баючыся граху Божага, вяшчалі з амвона некаторыя віленскія біскупы, што ў касцёле з Богам трэба гаварыць па-польску, а па-беларуску хіба толькі ў хляве з быдлам.

Але Набокаў, мусіць, не першы і не апошні. Успамінаецца рэцэнзія ці, хутчэй, зацемка Бялінскага на ўкраінскі зборнік «Ластаўка», выданы па-ўкраінску ў Санкт-Пецярбурзе. Ці не адтуль, з кароткай нататкі, надрукаванай у раздзеле «Библиографичная хроника» часопіса «Отечественные записки», сочыцца крынічка рускага фанабэрыста-імперскага нацыяналізму: «...теперь уж нет малороссийского языка, а есть областное малороссийское наречие, как есть белорусское, сибирское и другие, подобные им областные наречия».

А во яшчэ: «...жалко видеть, когда и маленькое дарование попусту тратит свои силы, пишет по-малороссийски». «Какая глубокая мысль в этом факте, что Гоголь, страстно любя Малороссию, все-таки стал писать по-русски, а не по-малороссийски!»

Цяпер разумею і па-іншаму ўспрымаю тыя гнеўныя словы, якія кінуў у адказ на адкрыты ліст Бялінскага ў сваім не адасланым пісьме абражаны і пакрыўджаны Гогаль: «В каком странном заблуждении вы находитесь! Ваш светлый ум отуманился. Нигде не было у меня насмешки, что составляет основание русского характера и его великой силы». Гогаль хацеў дабра дзеля дабра. Бялінскі — крыві дзеля крыві. «Он /літаратар/ должен служить искусству, которое вносит в души мира высшую примиряющую истину, а не вражду, — сцвярджае вялікі і бессмяротны Гогаль. — Любовь к человеку, а не ожесточение и ненависть».

Сёння зусім па-іншаму прачытваюцца як прысудна-пракурорскае пісьмо Бялінскага, так і апраўдальная «Аўтарская аповесць» Гогаля, сёння, ужо з адлегласці часу выразна бачыцца і тое, што затуманены розум спарадзіў яшчэ адну, што бясконца тыражуецца, не менш цытуецца і прымусова вывучаецца, агідна-прапагандысцкую зацемку, — «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура».

Нездарма ж Дастаеўскі ў «Дзённіку пісьменніка» кінуў рэпліку ў адрас Чарнышэўскага: «Ён хацеў, каб яго не слухалі, а слухаліся». Ці не такога ж паслушэнства дамагаўся і Бялінскі, спярша, вядома, гогалеўскага, а потым і ўсёй літаратуры.

Сёння, між іншым, думаў: калі Бог дасць скончыць раман, то прымуся напісаць нешта фантастычна-прыгодніцкае, пераймаючы гогалеўскія «Мёртвыя душы», але ўжо з падарожкам асноўнага персанажа з сённяшніх дзён у мінулае стагоддзе, дзе і ён у вобразе гараднічага, ці, напрыклад, Наздрова можа спаткаць знаёмага старшыню райвыканкома ці дырэктара спіртзавода, з якога, правёўшы за рэчку трубу, нават малакавозам крадуць спірт, а ён, дырэктар, кажа: «Завод перавыканаў план. І п'яныя ў мяне хіба толькі вераб'і».

Чацвер, 7 кастрычніка 1993 года. Учора Барыс Ельцын, прачытаўшы па тэлебачанні свой зварот да расіян і масквічоў і назначаючы на сёння дзень жалобы па тых, хто загінуў на вуліцах Масквы, назаўсёды і дарэшты паканаў камуна-фашызм, а за адным швом і саветы. Голас быў цвёрды, з дыктатарскім, як мне здалося, тонам. Мне за спіну нават быў падкраўся халадок насцярогі, каб ён часам не пачаў вяртаць граніцы былое імперыі. Бо ўсё пачынаецца з упэўненасці...

Мы покуль што астаёмся рэзерватам бальшавізму. «Чужакі», крымінальныя элементы з батальёна «Днепр» і былога рыжскага ОМОНу, пра якіх учора казаў Ельцын, як змылкі па рыштоку, сцякаюцца ў Беларусь.

На шпальтах мінскіх газет з'явіліся заднімі днямі смелыя зборныя пісьмы. Я ж з нейкага часу ўжо не чытаю фальшыва-рызыкоўных, падпісаных напаказ калектыўных пасланняў. Яны мне здаюцца, чамусьці, падобнымі да вершаваных харалаў, што складаліся ў гонар мудрага правадыра таксама ад імя народа.

Бачачы густы, шчодры рой прозвішчаў, што прыліпаюць да прызыўна-шаблоннага тэксту, я кожны раз успамінаю дажджлівы жніўеньскі дзень 1991 года, пляц Незалежнасці, дзе сабраўся нешматлікі мітынг супраць маскоўскага путчу і дзе я ўбачыў з беларускіх літаратараў усяго аднаго, як заўсёды, нязломна-ўпартага, адчайна-рашучага Валодзю Дамашэвіча.

Успамінаюцца ўжо і Курапаты...

Пятніца, 8 кастрычніка 1993 года. Па чорна-мокрым і для мяне падобным на заараную раллю, нядаўна спырсканым перакрыжаванымі струменямі жоўтага «вадавоза» няроўным асфальце рослая, танюткая маладзіца вядзе, узяўшы за ручку, трох- ці чатырохгадовага хлопчыка.

На іх з шыфернага даху цагляна-ружовага гаража жоўтымі фарфоравымі вачыма пазірае чорны каток, як пазіраю з свайго акна і я.

Калі бачу малых дзяцей, заўсёды чамусьці думаю пра сваю адзіноту. Колькі ж самотных, горкіх, як восеньскі дым, непрытульных дзён у сваім дзяцінстве перажыў я. Не дай, Божа, зведаць нешта такое ж гэтаму хлопчыку.

Але ж у кожнага свой лёс. Розны, а ўсё ж аднолькавы для ўсіх. Беражы яго, Божа!

ЛіМ

Заснавальнікі:

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Выходзіць з 1932 года

Газету рэдагавалі
І.Гурскі (1935–41)
А.Куляшоў (1945–46)
М.Горцаў (1947–49)
П.Кавалёў (1949–50)
В.Вітка (1951–57)
М.Ткачоў (1957–59)
Я.Шарахоўскі (1959–61)
Н.Пашкевіч (1961–69)
Л.Прокша (1969–72)
Х.Жычка (1972–76)
А.Асіпенка (1976–80)
А.Жук (1980–86)
А.Вярцінскі (1986–90)

Галоўны рэдактар
Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Андрэй ГАНЧАРОЎ (першы намеснік галоўнага рэдактара),
Юрась ЗАЛОСКА,
Міхась ЗАМСКІ,
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,
Барыс ПЯТРОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара),
Юрась СВІРКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі 332-461
намеснікі галоўнага рэдактара 332-525, 331-985
аддзелы:
публіцыстыкі 332-525
пісьмаў і грамадскай думкі 331-985
літаратурнага жыцця 332-462
крытыкі і бібліяграфіі 332-204
паэзіі і прозы 332-204
музыкі 332-153
тэатра, кіно і тэлебачання 332-153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў 332-462
навін 332-462
мастацкага афармлення 332-204
фотакарэспандэнт 332-462
бухгалтэрыя 268-640

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдыкцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку"

Індэкс 63856. Наклад 19.000.
Нумар падпісаны 3.02.1994 г.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Тэлетыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.20 Каралеўскае паляванне.
17.20 Тэлебачанне — школе. Белавежская пушча.
17.40 «Тэлесябрына».
18.10 Навіны /Брэст/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Аэробіка.
19.35 «Паслаў мне лёс блакітную раку...» Да 80-годдзя А. Кулешова.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Надвор'е.
21.55 Пяць хвілін на жарты.
22.00 Кантакт.
22.05 Актуальнае інтэрв'ю.
22.35 Спартыўны тэлекур'ер.
22.55 Наш госць з Францыі — кампазітар і дырыжор Марк Блёз. У перапынку /23.55/ — НІКа.
0.45 Арт-клуб.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 «Салдацкая казка», мульт.
8.20 Паглядзі, паслухай...
8.40 «Дробязі жыцця».
9.10 Таленты Расіі.
9.35 Тэма.
10.20 Зорная гадзіна.
11.20 Гол.
14.25 Прадпрымальнік.
15.20 «Цудоўнае лякарства», мульт.
15.30 Новыя імёны.
16.10 Зорная гадзіна.
16.50 Тэхнадром.
17.30 Гол.
18.00 Дакументы і лёсы.
18.10 Надвор'е.
18.15 Па-за радком пратакола.
18.25 «Дробязі жыцця».
18.55 Мы. Праграма У. Познера.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.35 Надвор'е.
20.45 М. Булгакаў. «Кабала святошаў». Спектакль МХАТ імя А. Чэхава.
23.20 «Я вам сяю». А. Галіч.
23.50 «Самаадданы заяц», мульт.
0.20 Прэс-экспрэс.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Рэпарцёр.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Мульці-пульці.
8.00 Навіны ЭЙ-бі-сі.
8.30 Вуснамі дзіцяці.
9.00 «Слова пра Льва Талстога», фільм 3-ці.
10.00 Зваротны адрас.
10.30 Новая лінія.
11.00 «Агні вялікага горада», м/ф.
12.25 Кіно ў лютым.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Небыліца», м/ф.
14.55 Тэлегазета.
15.00 Бізнес у Расіі.
15.30 Там-там навіны.
15.45 «Памяці непакорнага барда». У. Высоцкі.
16.15 Новая лінія. «На шляху да рынку».
16.50 Выратаванне 911.
17.45 Руская віза.
18.15 Абракадабра.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.40 «Кароль трэф» /«Эркюль Пуаро»/.
20.40 У свеце аўта- і мотаспорту.
21.15 Момант ісціны.
22.10 Ніхто не забыты.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 «Вяртанне». Скрыпач Ю. Брагінскі.

Санкт-Пецярбург

6.30 «Лёнькавы канікулы», к/ф.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 «Дзень добры, Вольга, хэло, Вольга».
8.05 Тэатральная правінцыя.
9.05 Нямецкая хваля.
9.35 Кідайка.
10.15 «Шкоднік», мульт.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Тэледоктар.
11.15 Без назвы.
11.40 Камертон.
12.25, 14.25, 18.05, 20.45, 0.05 Музычны момант.
12.30 «Ашык-Керыб», м/ф.
13.55 «Сярэбраныя струны». Іграе аркестр імя М. П. Осіпава.
14.40 «Рускія ўзоры», канцэрт.
15.40 Дамашні ўрок.
16.00 «Аляксандр Неўскі», д/ф.
17.00 Адкрываю для сябе Расію.
17.30 Чалавек на Зямлі.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Вынікі XX стагоддзя.
19.35 Надвор'е-шоу.
19.40 Спорт, спорт, спорт.
20.00 Сёння.
20.40 Тэлемагазін.
20.55 «Паласаты рэйс», м/ф.
22.25 Па-дэ-дэ з балета «Баядэрка».
22.35 Ваш стыль.
23.05 Незвычайная экскурсія.

АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Надвор'е.
8.30 Пяць хвілін на жарты.
8.35 Спартыўны тэлекур'ер.
9.00 Тэлебачанне — школе. Белавежская пушча.
9.20 «Павел Філонаў ва ўспамінах сучаснікаў», д/ф.
10.40 «Выдатныя аўтамабілі свету», 1-я серыя.
11.10 Дзяржаўны канцэртны аркестр запрашае...
11.45 «Тэлесябрына».
12.45 Тэлеклуб «Гаў-гаў».
13.05 «Дарога», д/ф.
13.30 Навіны.
13.40 Дзелавая хроніка.
13.50 «Сувенір для пракурора», м/ф.
15.20 «Адзіны свет, адзіная эканоміка», д/ф.
15.55 «Нов и К»-топ-10.
16.55 Тэлебачанне — школе. Вершы М. Багдановіча.
17.25 Закон і мы.
18.00 Дзелавая хроніка.
18.10 Навіны /Віцебск/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Стоп-кадр.
19.20 Эканамічная хваля. Праблемы матэрыяльнага забеспячэння ўстаноў аховы здароўя. Прамая лінія.
20.05 «І не пакіну цябе...».
20.30 Кантакт.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; Начное рандэву.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 Агляд рынку нерухомасці.
8.20 Вясёлыя ноткі.
8.40 «Проста Марыя».
9.35 Спявае Мікалай Васільеў.
10.10 Рок-урок.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Дзіўныя дарослыя», м/ф.
12.35 Эльдарада.
13.00 «Гарачаў і іншыя».
14.25 Прадпрымальнік.
15.10 Справа.
15.20 «Мая сям'я і іншая жывёла».
15.50 Чароўны свет, ці Сінема.
16.10 Рок-урок.
16.50 Азбука ўласніка.
17.25 За кулісамі.
17.50 Дакументы і лёсы.
18.00 Надвор'е.
18.05 «Проста Марыя».
18.55 Тэма.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.35 Надвор'е.
20.45 Фільмы Л. Пчолкіна. «Крадзеж». У перапынку /22.00/ — Бамонд.
23.30 Начное жыццё гарадоў свету. Варадэра.
0.20 Прэс-экспрэс.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца...
6.30 Формула 730.
7.00 Канцэрт.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Мульці-пульці.
8.00 Навіны ЭЙ-бі-сі.
8.30 Момант ісціны.
9.25 Музыка буйным планам. П. Чайкоўскі.
10.10 Новая лінія.
11.00 «Санта-Барбара».
11.50 «К-2»: «Кінограф».
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Анна Карэніна», м/ф, 1-я серыя.
14.40 Канцэрт.
14.55 Тэлегазета.
15.00 Рэтра-шлягер.
15.30 Там-там навіны.
15.45 Студыя «Рост».
16.15 Новая лінія.
17.00 Гаспадар.
17.30 «Жанчыны свету».
18.00 «Час, назад». В. Меерхольд.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Санта-Барбара».
20.25 L-клуб.
21.15 60 мінут. Праграма Сі-бі-эс і РТБ.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 З залы Вярхоўнага суда.
23.10 ЭКС.
23.20 Цішыня N 9.

Санкт-Пецярбург

6.30 «Пад адным дахам», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 «На парозе ночы», м/ф.
8.00 «Горад, дзе не чуваць песень».
8.30 Музычныя партрэты.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 Тры колы, фаліянт і іншыя...
10.00 «Нябесны дар», «Вясёлы падманшчык», мульт
10.20 Тэлемагазін.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 «Сярэбраная ніць».
11.40 «Пскоў», д/ф.
12.00, 14.25, 18.05, 20.45, 0.15 Музычны момант.
12.05 «Навальніца», м/ф.
13.35 «Я, Уладзіслаў Ардзінба».
14.05 «Добрая казка», мульт.
14.40 Сам-насам з музыкай.
15.10 Дамашні ўрок.
15.45 «Скарб на дне возера», м/ф.
17.00 Ваша права.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Усё пра «Гермеса».
19.40 Спорт, спорт, спорт...
20.00 Сёння.
20.40 Тэлемагазін.
20.55 «Дыстыг у Вальядалідзе», м/ф.
22.25 «Чалавек з дзіцячым акцэнтам», мульт.
22.35 Ваш стыль.
23.05 Спявае С. Ратару.

ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Складчына.
8.30 Пад купалам Сусвету.
8.40 Надвор'е.
8.50 Пяць хвілін на жарты.
8.55 «Песні нашага юнацтва», канцэрт.
9.25 «Ніхто, акрамя цябе».
10.15 «Сабачае жыццё», нарыс.
10.45 «Крывыя вечары». З. Мажэйка.
11.30 «Канцэрт-вальс».
12.05 «Успаміны Барыса Пастэрнака», д/ф.
13.30 Навіны.
13.40 «Сад жаданняў», м/ф.
15.15 «Два дуэты», канцэрт.
15.45 Тэлебачанне — школе. Раман І. Мележа «Людзі на балоце».
16.15 «Аліса ў краіне цудаў», мульт.
16.45 «Папараць-кветка».
17.50 Складчына.
18.10 Навіны /Гродна/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Зачытайце маё пісьмо...
19.05 Роднае слова.
19.35 Дзелавая размова. Сустрэча з дырэктарам Магілёўскага аўтамабільнага завода А. Бунасам.
20.00 Паэтычная гасцёўня. У. Марук.
20.15 Пазіцыя ўрада.
20.30 Кантакт.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; «Аб'ектыў-тэатр» на фестывалі ў Карлсруэ /Германія/, 2-я частка.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 Агляд рынку нерухомасці.
8.20 «Купанне бабулі».
8.40 «Проста Марыя».
9.30 Канцэрт хору імя М. Пятніцкага.
10.00 «Гарадскі эцюд», д/ф.
10.10 ...Да 16 і старэйшым.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Фантазія», м/ф.
12.30 На шляху да Уэмблі.
13.30 «Гарачаў і іншыя».
14.25 Прадпрымальнік.
15.20 «Хітрыкі Рамзеса», мульт.
15.45 Канцэрт ансамбля «Казацкая вольніца».
16.10 ...Да 16 і старэйшым.
16.50 Тэхнадром.
17.25 Лабірынт.
17.50 Дакументы і лёсы.
18.00 Надвор'е.
18.05 «Проста Марыя».
19.00 Федэрыка Фелліні.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.35 Надвор'е.
20.45 Лато «Мільён».
21.25 «Твін Пікс».
22.20 «50х50».
23.35 Аўта-шоу.
0.20 Прэс-экспрэс.
0.30 На шляху да Уэмблі.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Сігнал.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Паехалі.
8.00 Навіны ЭЙ-бі-сі.
8.30 Новая лінія.
9.10 А. С. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
9.50 «Блакітны агеньчык».
11.50 «Санта Барбара».
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Анна Карэніна», 2-я серыя.
14.30 «Гарадок».
14.55 Паралелі.
15.10 Там-там навіны.
15.25 Студыя «Рост».
15.55 Новая лінія.
16.40 Будні.
17.25 Айчына мая
17.55 Я — лідэр..
18.15 Сам сабе рэжысёр.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Санта-Барбара».
20.35 Навагодні атракцыён-94.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 Навагодні атракцыён-94.

Санкт-Пецярбург

6.35 «Малюнкі па-даўнейшаму», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 Еўрапейскі калейдаскоп.
7.35 Новы Пецярбург.
8.05 «Мой любімы час», мульт.
9.15 Нямецкая хваля.
9.45 Залаты павучок.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 «Гады маёй вясны», канцэрт.
11.40 «Фантазія», м/ф.
12.00 «Маналог пра Пушкіна», д/ф.
12.50 «Вскую прискорбно».
13.00 Мойка, 12. Трансляцыя.
14.40 Дамашні ўрок.
15.10 Пакінь цікаўнасць натоўпу...
15.50 Г. Свірыдаў, «Мяцеліца».
16.25 «Казка за казкай».
17.15 «Кінаўспаміны. Спадчына», д/ф.
18.05, 20.45, 1.25 Музычны момант.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Гістарычны альманах.
19.40 Спорт, спорт, спорт...
20.00 Сёння.
20.40 Тэлемагазін.
20.50 «На парозе ночы», м/ф.
21.40 Без назвы.
21.55 «Вячэрні звон».
22.40 Ваш стыль.
23.05 «Вячэрні звон».
0.05 «У зімовую ноч», тэлеспектакль.

ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Надвор'е.
8.30 Пяць хвілін на жарты.
8.35 «Танцуе Ірына Калпакова».
9.00 Тэлебачанне — школе. Раман І. Мележа «Людзі на балоце».
9.30 «Ніхто, акрамя цябе».
10.15 «Крок»: «Пяць зорак».
11.15 «Чаму на Рэйне так хораша...»
12.20 Пазіцыя ўрада.
12.35 Баль А. Маліна.
13.00 Навіны.
13.40 Дзелавая хроніка.
13.50 «Прынц-прывід», м/ф.
15.10 «Я ўбачыў звера», д/ф.
16.15 Фестываль-конкурс імя Агінскага ў Смаргоні.
17.15 Вёска і людзі.
18.00 Дзелавая хроніка.
18.10 Навіны /Магілёў/.
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Якія мы гаспадары.
19.30 Беларускія музычныя весткі.
19.50 Рок-айленд.
20.20 У добры шлях, Алімпіяда!
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; Кантакт; «Сезар і Разалі», м/ф. /Францыя/.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 Мультфільм.
8.20 «Пакуль б'е гадзіннік», м/ф.
9.50 «Варонежскія дзяўчаты», канцэрт.
10.20 Амерыка з М. Таратутам.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Гутаркі пры ясным месяцы». Спектакль Малога тэатра.
13.25 Кінафестываль «Год карэнных народаў свету».
14.25 Прадпрымальнік.
14.55 Бізнес-клас.
15.10 Народныя мелодыі.
15.20 «Пакуль б'е гадзіннік», м/ф.
16.50 Азбука ўласніка.
17.25 Навіны культуры.
17.40 Чалавек і закон.
18.10 Надвор'е.
18.15 Амерыка з М. Таратутам.
18.45 Поле цудаў.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.35 Надвор'е.
20.45 «Твін Пікс».
21.45 Чалавек тыдня.
22.05 Пасля прэм'еры. П. Штайн.
22.35 Акадэмія.
23.05 Музагляд.
23.45 Праграма «Х».
0.20 Прэс-экспрэс.
0.30 Пляцоўка агляду. С. Крылоў.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Не быць дыназаўрам.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Паехалі.
8.00 Навіны ЭЙ-бі-сі.
8.30 «Настальжы».
9.20 А. С. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
9.50 Зваротны адрас.
10.20 Новая лінія.
10.50 «Санта Барбара».
11.40 Ж. Сіменон. «Да самой сутнасці», спектакль, частка 1-я.
12.35 Тэлегазета.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Да самой сутнасці», частка 2-я.
14.20 Непазнаны Сусвет.
14.50 Бізнес у Расіі.
15.20 Там-там навіны.
15.35 Іран: мінулае, сённяшняе і будучае.
16.05 Новая лінія.
16.50 Дысней па пятніцах.
17.45 «Дзяржаўны герб Расіі», д/ф.
18.15 Пушкін і лёсы рускай культуры.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Шпацыр па эшафоце», м/ф.
21.05 «К-2»: «Абзац».
22.05 «Шыпы і ружы», мульт.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 «Іван Грозны», м/ф., 1-я серыя.

Санкт-Пецярбург

6.35. «Раз каўбой, два каўбой», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 «На парозе ночы», м/ф.
8.00 Спявае С. Ратару.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 «Казка за казкай».
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 «Растоў Вялікі», д/ф.
11.15 Без назвы.
11.40 «Канал Грыбаедава, дом 9», д/ф.
12.00, 14.25, 18.05, 20.45, 1.45 Музычны момант.
12.05 «Паласаты рэйс», м/ф.
13.35 «Малітва Бадхісатвы», д/ф.
14.40 «Адкрываю для сябе Расію».
15.10 Падарожжа па Усходзе.
15.30 «Віталь Біянкі», д/ф.
16.30 «Муравейка Ціпа», мульт.
16.40 Крыжыкі-нулікі.
17.20 Кірмаш вакансій.
17.35 «Эстонія: вецер перамен», перадача 1-я.
18.10 Вялікі фестываль.
18.50 «Пятае вымярэнне». Тэлеварыянт рамана М. Булгакава «Майстар і Маргарыта».
19.40 Спорт, спорт, спорт...
20.00 Сёння.
20.40 Тэлемагазін.
20.50 Хранограф.
21.50 Уік-энд.
22.35 Ваш стыль.
23.05 «Грахі Гарольда Дзідлбока», м/ф. /ЗША/.
0.40 «Званая вячэра», спектакль.

СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Пяць хвілін на жарты.
8.25 Надвор'е.
8.35 «Мама для маманцяняці», мульт.
8.45 «Ніхто, акрамя цябе».
9.30 Здароўе.
10.00 Паказвае Брэст.
11.00 Тыдзень планеты.
11.15 «Сезар і Разалі», м/ф. /Францыя/.
13.05 «Усе мы родам з дзяцінства». І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль.
13.35 «Паэтычная гасцёўня». С. Грахоўскі.
14.05 «Мой маленькі поні».
14.35 Як чытаць Біблію, перадача 1-я.
15.05 Да 70-годдзя «Беларусьфільма». «Лясная быль», м/ф. Уступнае слова мастацтвазнаўцы А. Красінскага.
16.15 Наваселле не адмяняецца.
17.00 «Ласяня», мульт.
17.10 Ансамбль «Бяседа» і С. Суседчык.
17.35 «Выдатныя аўтамабілі свету», 2-я серыя.
18.05 «Крок».
19.35 «Нов і К»-топ-10.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 «Алошняя восень», м/ф, 1-я серыя.
23.20 НІКа.
23.35 «Каскад».
23.50 Відзьма-нявідзьма.
0.50 Баскетбол. РТІ — ЦСКА.

Канал «Астанкіна»

6.00, 20.00, 24.00 Навіны.
6.25 Ранішняя размінка.
6.35 Мульт.
6.45 Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30 Выступае ансамбль «Майдан».
8.00 «Марафон-15».
8.30 Кампанія «Мір».
9.55 Ранішняя пошта.
10.25 Смак.
10.40 Медыцына для цябе.
11.15 «Начавала хмарка залатая». А. Прыстаўкін.
11.55 Экстра-НЛА.
12.25 Жыццё і палітыка.
12.55 XVII зімнія Алімпійскія гульні. Хакей. Фінляндыя — Чэхія. У перапынку — Навіны.
15.30 «Пэпі Доўгаяпанчоха».
16.00 «Дзіва».
16.15 У свеце жывёл.
16.55 Урачыстае адкрыццё XVII зімніх Алімпійскіх гульняў.
19.05 Каханне з першага погляду.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.35 Надвор'е.
20.45 «Цудоўная пара», м/ф.
21.35 Мініяцюра.
21.50 «І мора раскажа...», м/ф, 2-я серыя.
22.50 Творчы вечар Т. Гвердцытэлі.
0.20 Усё спачатку. В. Казачэнка.

Канал «Расія»

8.00 Мегаполіс.
8.30 Наш сад.
9.00 Студыя «Рост».
9.30 Пілігрым.
10.15 Як жыць будзем?
11.00 «Камісар», м/ф.
13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
13.20 Сялянскае пытанне.
13.40 Тэлезрудыт.
13.45 Пігмаліён.
14.15 Уваход з двара.
15.00 Чорнае і белае.
15.30 Залатая шпора.
16.00 Футбол без граніц.
16.55 Фільм-прэм'ер.
17.10 Тэлезрудыт.
17.15 «Расія маладая», д/ф.
18.15 Вуснамі дзіцяці.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Алімпіяда. Хакей. Расія — Нарвегія.
22.00 Рэпарцёр.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Праграма «А».
23.50 «Іван Грозны», м/ф, 2-я серыя.

Санкт-Пецярбург

7.00, 18.30, 22.55 Інформ ТБ.
7.20 «Муравейка Ціпа», мульт.
7.30 «Грахі Гарольда Дзідлбока», м/ф.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 «Трава забыцця», д/ф.
10.15 «Падарожжа па Усходзе».
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Канцэрт па заяўках.
11.30 Тэледоктар.
11.45. «Дзікі сабака Дзінга», м/ф.
13.25 «Вяртанне», д/ф.
14.00 «Сярэбраная ніць».
14.30 Дзецям пра зверанят.
14.50 Тэатр звяроў імя У. Дурава.
15.15 Па сакрэту ўсяму свету.
15.25 Храм.
16.10 «Пікавая дама». Опера П. І. Чайкоўскага
17.30 Спартыўны агляд.
18.05 Дарожныя прыгоды.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Камертон.
19.40 Экспрэс-кіно.
20.00 Надоечы.
20.40 Ваш стыль.
20.45 «На парозе ночы», м/ф.
21.35 «Дзядзька Ваня», м/ф.

НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Пяць хвілін на жарты.
8.25 Слова да чалавека.
8.55 «Алошняя восень», м/ф., 1-я серыя.
10.25 Белыя і чорныя.
10.55 Аэробіка.
11.20 АВС-клуб.
11.45 Асілак.
12.45 MTV. Лепшыя хіты.
13.15 «Свята танца», перадача 2-я.
14.05 Абрыс.
14.50 Гран-пры «Фаварыт-шоу».
15.00 «Тры апельсіны».
15.30 Беларусы ў Амерыцы, перадача 3-я.
16.10 «Тэлебом».
17.15 Паміж намі, жанчынамі...
18.00 «Гінес-шоу».
18.30 Фестываль заходне-палескай песні.
19.40 «Тэлесябрына».
20.00 Панарама.
20.35 Пад купалам Сусвету.
20.40 Кальханка.
21.00 Пяць хвілін на жарты.
21.10 «Мужчынская справа», м/ф /Францыя/.
22.50 «Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар».
23.00 Каралеўскае паляванне.

Канал «Астанкіна»

6.00, 14.00, 17.30, 24.00 Навіны
6.20 Ранішняя размінка.
6.30 Тэлесерэнада.
7.00 Гадзіна сілы духу.
8.00 Арт-кур'ер.
8.30 Раным-рана.
9.00 Паліігон.
9.30 «Спортлайф».
9.45 Пакуль усе дома.
10.15 Ранішняя зорка.
11.05 Марафон-15.
11.45 Клуб падарожнікаў.
12.30 Правінцыя.
13.00 «Піф і Геркулес».
13.10 «Падводная адысея каманды Кусто».
14.20 Дыялог у прамым эфіры.
15.00 Алімпіяда. Санны спорт. Двойкі. Мужчыны.
15.45 «Кот Фелікс», «Сапраўдныя палянічныя на прывіды».
16.35 Жывое дрэва рамёстваў.
16.40 Панарама.
17.20 Тэлелоцыя.
17.45 Галасы Расіі.
19.15 Надвор'е.
19.20 «Тарцюф», м/ф.
21.00 Нядзеля.
21.45 Алімпіяда. Канькабежны спорт. 5000 м. Мужчыны.
22.45 Вакзал мары. Ю. Башмет.
23.30 «Два жулікі», мульт.
23.40 Дзённік Алімпіяды. Хакей. Швецыя — Славакія.

Канал «Расія»

8.00 Добрай раніцы.
8.30 Вялікі хакей.
9.00 Студыя «Рост».
9.30 Здароўе.
10.00 Аты-баты...
10.30 Сялянскае пытанне.
10.50 Алімпіяда.
13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
13.20 Не высечы...
13.35 «Я абяцаю ніколі не здрадзіць ісціне». А. Салжаніцын.
14.20 Ізабэль.
15.05 Лепшыя гульні НБА.
16.00 Белая варона.
16.50 Чароўны свет Дыснея.
17.45 Шпіянаж.
18.15 У Ксюшы.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 «Сляпая справядлівасць», м/ф.
21.10 Алімпійскі кур'ер.
21.40 Каробка перадач.
22.20 Аўтаімгненне.
22.25 Зоркі гавораць.
22.30 Алімпіяда. Фігурнае катанне.

Санкт-Пецярбург

7.00 «Гаючае слова».
7.30 «На парозе ночы», м/ф.
8.20 Уік-энд.
9.10 Экспрэс-кіно.
9.25 «Музыка ў стылі рок».
9.55 Новыя часы.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Нядзельны лабірынт.
11.10 Мастацтва і грыбы.
11.30 Дзед Мароз з тэлебачання.
11.50 Наваселле ў тэатры.
12.15 «Аўроры» — 80 гадоў.
12.30 Ваенкамат.
12.45 Мужчыны-настаўнікі.
13.05 «Галка», м/ф.
14.30 Залаты ключ.
14.40 Казка за казкай.
15.05 Фільмаскоп.
15.55 Гран-па з балета Л. Мінкуса «Пахіта».
16.30 «Жыць, думаць, адчуваць, кахаць...», д/ф.
17.20 Крымінальнае дасье.
17.40 Аўтапілот.
17.55 Сем сланоў.
18.30 Інформ-ТБ.
18.35 Зебра.
20.00 Вынікі.
21.05 Ваш стыль.
21.10 Прагноз-інфармрэвю.
21.30 «Бакенбарды», м/ф.
23.15 Адам і Ева.
23.45 «Дзякуй за нялётнае надвор'е».

7 - 13 лютага